Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
№ 61 (28677)
30 САКАВІКА 2018 г.
ПЯТНІЦА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
+TVпраграма



«Алё, гэта міліцыя?»
СТАР. 4



Вечны рухавік інфармацыі
МС



Калі любяць — не кідаюць
МС

ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый МАЛАШКА, міністр аховы здароўя:**

*«Міністэрства аховы здароўя ў найбліжэйшы час удзеліць асаблівую ўвагу пажарнай бяспецы ва ўстановах аховы здароўя. Бальніцы — гэта месца з кругласутачным знаходжаннем людзей, некаторым з іх нялёгка перамяшчацца, а значыць, у выпадку магчымай небяспекі яны не змогуць самі пакінуць памяшканне або хутка сарыентавацца пры эвакуацыі.*
*Мы рэгулярна абследуем будынкі і збудаванні, праводзім трэніровачныя мерапрыемствы з медыцынскім персаналам. Урачы часта сутыкаюцца са смерцю, але, калі яна забірае здаровых дзяцей, як здарылася ў Кемераве, з гэтым цяжка змірыцца і няпроста гэта ўсвядоміць. Мы павінны зрабіць усё для таго, каб такога роду трагедыі і выпадкі не паўтараліся».*

ISSN 1990 - 763X
18061

# ПЕРАМОЖЦЫ — ПОБАЧ



Фота БЕЛТА.

Ордэнам «За асабістую мужнасць» і ганаровым званнем «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь» узнагароджана біятланістка Надзея СКАРДЗІНА.

## Прэзідэнт сустрэўся з удзельнікамі сёлетніх зімовых Алімпійскіх і Параалімпійскіх гульняў

**Нагода была святочная: кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ўручыў узнагароды спартсменам і трэнерам за прафесійнае майстэрства і паспяховае выступленне ў карэйскім Пхёнчхане. Размова ў Прэзідэнта атрымалася даволі прадметнай — абмеркавалі праблемныя пытанні і планы на найбліжэйшы час.**

Свой візіт у Палац Незалежнасці алімпійцы пачалі з экскурсіі. Як неаднойчы гаварылася, нашы спартсмены, выступаючы на розных міжнародных спаборніцтвах, робяць такую ж працу, як і дыпламаты, прадстаўляючы Беларусь ва ўсім свеце. Учора яны пабывалі ў залах, дзе праходзяць перагаворы, абмяркоўваюцца актуальныя пытанні нацыянальнай і знешняй палітыкі. Тыя, чые перамогі аб'ядноўваюць і натхняюць, — нашы спартсмены — пасля экскурсіі адправіліся на шчырую размову з кіраўніком дзяржавы.

СТАР. 2

# Рыбацкія пасядзелкі на Вячы



У апошнія дні сакавіка да вусця ракі Вячы, дзе яна ўпадае ў Мінскае мора, з'язджаюцца аматары падлёднай рыбалкі, каб нацешыцца з мармышкай, пасядзець на сакавіцкім сонейку.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА, Мінскі раён.

■ Перасяленцы

# ХТО ГАТОВЫ ДА ПЕРАМЕН?

Калі прэтэндэнтаў на вакансію вартаўніка — як у мадэльнае агенцтва, а каб стаць дворнікам, прапануюць скласці рэзюме...



**У Гродзенскай вобласці расце колькасць перасяленцаў. У мінулым годзе новы адрас атрымалі 22 беспрацоўныя, гэта на шэсць чалавек больш, чым у папярэднім, 2016-м. Некаторыя пераязджалі цэлымі сем'ямі. Напрыклад, з Гродна за два гады праграмай перасялення скарысталіся шэсць сем'яў. У гарадскім цэнтры занятасці вырашылі гэту работу пашырыць і правялі тыдзень перасялення.**

СТАР. 5

# ПЕРАМОЖЦЫ — ПОБАЧ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Перад уручэннем узнагарод Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў зале сабраліся мужныя людзі. «На зімовых Гульнях мы былі сведкамі жорсткай барацьбы не толькі на стадыёнах, але і ў судзейскіх кулуарах. Нават у міждзяржаўных адносінах», — адзначыў Прэзідэнт. Алімпійскае золата ў жаночай біятлоннай эстафеце, мабыць, і стала для кагосьці нечаканасцю, але не для беларускіх балельшчыкаў. «Нашы дзяўчаты малайцы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што ўпершыню так пільна сачыў і за Параалімпійскімі гульнямі. Як аматар спорту Прэзідэнт адзначыў: «Вы проста прыгажуны! Я, напрыклад, не мог адарвацца ад экрана, гледзячы на ўсе вашы гонкі. Я хварэў за вас не менш, чым за нашых алімпійцаў».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў усім за ўклад у развіццё спорту і ўручыў узнагароды. Так, чатырохразовая алімпійская чэмпіёнка па біятлоне Дар'я Домрачава атрымала ордэн «За асабістую мужнасць». Гэта вельмі рэдкая ўзнагарода. Такім жа ордэнам і ганаровым званнем «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь» адзначаны біятланісткі Дзінара Алімбекава, Ірына Крыўко і Надзея Скардзіна. Трохразовая параалімпійская чэмпіёнка і бронзавы прызёр зімовых Гульняў у Пхёнчхане Святлана Саханенка ўзнагароджана ордэнам Айчыны ІІІ ступені з прысваеннем ганаровага звання «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь». Узнагароды і ганаровыя званні атрымалі і іншыя спартсмены, якія годна прадставілі нашу краіну.

Далей яны разам з Прэзідэнтам абмеркавалі розныя аспекты нацыянальнага спорту. Спартсмены расказалі, як гэты сезон выглядаў «знутры». Гаварылі і пра сэрвісную частку. У біятлоне, напрыклад, гэта датычыцца падрыхтоўкі лыж, якая можа захаваць каштоўныя секунды. Дар'я Домрачава расказала, што былі ў гэтым плане некаторыя праблемы на першым крузе гонак. Наконт трэнераў Надзея Скардзіна лічыць, што гады пасля сочынскай Алімпіяды былі даволі цяжкімі, але нарэшце праграма падрыхтоўкі стала найбольш камфортнай для біятланістак.

Аляксандр Лукашэнка ўважліва выслухаў суразмоўцаў, пры гэтым зрабіў акцэнт на тым, што неабходны адпаведныя высокія вынікі. Прэзідэнт раскрытыкаваў выступленне біятланістаў-мужчын на гэтай Алімпіядзе і адзначыў, што такога быць не павінна. З інвентаром праблем не будзе, але трэба, каб былі тыя, хто працуе на вынік. Таленавіты спартсмен будзе ісці да сваёй перамогі, калі ў яго ёсць жаданне.

Хутка адбудзецца буйная нарада па зімовых відах спорту ў Прэзідэнта, дзе дэталёва разбяруць, што было зроблена, а што ўпушчана. «Я ўжо казаў пра тое, што мы зробім рашучы крок на працягу года-двух, каб нам на больш значны ўзровень падняць падрыхтоўку лыжнікаў у нашай краіне», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым Прэзідэнт расказаў і пра канкрэтныя планы па развіцці гэтага кірунку: «Мы абавязкова пабудуем так званую трубу ў Беларусі. Я хацеў бы, каб гэта было на працягу года зроблена. Ужо зараз праводзяцца разведвальныя работы. Мы знойдзем сродкі для таго, каб узвесці гэта збудаванне, каб нашы лыжнікі — і спартсмены, і аматары — маглі круглы год займацца на снезе».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што кампанія «Марка» зоймецца вытворчасцю лыжных ботаў, а канструктары МТЗ ужо распрацоўваюць ратракі — гусенічны трактар для падрыхтоўкі лыжных трас. Таксама даручана заняцца распрацоўкай сваіх лыжаролераў. «Трэба, каб зрабілі ўсё. Калі не могуць адразу зрабіць, закупім. Але неабходна рабіць гэта ўсё ў сябе», — падкрэсліў Прэзідэнт. Да таго ж плануецца за лета паставіць у спецыялізаваныя трэніровачныя цэнтры снегавыя гарматы, ратракі і неабходны інвентар.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# АСАБЛІВЫЯ ДЛЯ НАС БАЛКАНЫ

**У сераду, 28 сакавіка, адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Сербіі Аляксандрам Вучычам. Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі цяперашні стан і перспектывы развіцця адносін паміж Беларуссю і Сербіяй, у тым ліку шляхі павелічэння ўзаемнага тавараабароту. Пры гэтым бакі адзначылі супадзенне пазіцый краін у сферы палітыкі, па пытаннях рэгіянальнага і міжнароднага парадку дня.**

Аляксандр Вучыч запрасіў Аляксандра Лукашэнку здзейсніць афіцыйны візіт у Сербію. Прэзідэнт Беларусі прыняў гэтае запрашэнне. Канкрэтныя тэрміны візіту будуць узгоднены па дыпламатычных каналах.

На наступны дзень, учора, Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са спецпрадстаўніком Прэзідэнта Сербіі, намеснікам старшыні ўрада — міністрам унутраных спраў Сербіі Небайшам Стэфанавічам, які перадаў асабістае запрашэнне сербскага лідара кіраўніку беларускай дзяржавы. На гэтай сустрэчы Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў асабліва цёплае стаўленне беларусаў да сербскага народа.

«Няма неабходнасці для нейкіх уводных слоў, таму што ў нас бліскучыя адносіны з вашай краінай, інакш і быць не можа. Мы добра ведаем адно аднаго — Сербія і Беларусь. Нашы народы вельмі сябруюць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што ў Беларусі ведаюць, з якімі праблемамі сёння сутыкаюцца ў Сербіі. «Думаю, і вы добра ведаеце пытанні, якія нам даводзіцца вырашаць. Складана вам, няпроста і нам. Але мы жылі і будзем жыць, таму што мы славяне, мы старажытныя народы і ўмеем пераадольваць цяжкасці, калі яны ёсць, і пераадольваць іх разам», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка і Небайша Стэфанавіч падрабязна разгледзелі актуальныя пытанні супрацоўніцтва паміж краінамі, шляхі развіцця міждзяржаўных адносін. Міністр унутраных спраў Сербіі таксама праінфармаваў кіраўніка беларускай дзяржавы аб сітуацыі ў сваёй краіне, асобна ён закрануў апошнія падзеі ў Косаве.

Пазней спецпрадстаўнік Прэзідэнта Сербіі пракаментаваў журналістам вынікі сваёй размовы з беларускім лідарам. «Для Сербіі вельмі важна прадоўжыць блізкія і братэрскія адносіны з Беларуссю і ў сувязі з гэтым поўнасцю і дакладна інфармаваць нашых партнёраў аб усім, што адбываецца ў нашай краіне», — сказаў ён.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ПАЎДНЁВАЯ І ПАЎНОЧНАЯ КАРЭІ ДАМОВІЛІСЯ АБ ПРАВЯДЗЕННІ САМІТУ

Прэзідэнт Рэспублікі Карэя Мун Чжэ Ян і паўночнакарэйскі лідар Кім Чэн Ын сустрэнуцца ў Палацы міру ў вёсцы Панмунджом на поўдні ад мяжы, гаворыцца ў паведамленні, распаўсюджаным паўднёвакарэйскім агенцтвам Yonhap. Паўночная і Паўднёвая Карэі дамовіліся правесці сумесны саміт — першы за больш чым 10 гадоў. Мерапрыемства намечана на 27 красавіка, перадае Reuters са спасылкай на крыніцы ў паўднёвакарэйскім урадзе. Калі сустрэча адбудзецца, то гэта будзе ўжо трэці саміт дзвюх Карэй. Два папярэднія праходзілі ў 2000-м і 2007 гадах, абодва разы ў Пхеньяне.

### РАСКРЫТАЯ ПРЫЧЫНА ГІБЕЛІ ГАГАРЫНА



Першы касманаўт планеты Юрый Гагарын разбіўся разам з інструктарам Уладзімірам Сярогіным на знішчальніку МіГ-15ВТЗ (вучэбна-трэніровачны знішчальнік) з-за памылковай каманды з зямлі, паведаміў ТАСС член лётнай падкамісіі, якая ўваходзіла ў вялікую ўрадавую камісію па расследаванні прычын катастрофы, доктар тэхнічных навук Арсеній Міронаў. Па словах Міронава, недалёка ад зоны палёту самалёта Гагарына і Сярогіна выконваў задачы МіГ-15ВТЗ лётчыка Андрэева. Спецыяліст лічыць, што першы МіГ-15ВТЗ трапіў у закрытычны рэжым палёту ў выніку манеўру ўхілення ад раптам заўважанага пасярод воблачнасці другога самалёта. Эксперт сцвярджае, што адказ на пытанне аб прычынах гібелі першага касманаўта ўдалося знайсці пры шматразовым чытанні фрагментаў расшыфроўкі радыёабмену ў першай яго рэдакцыі, заканспектаваных у нататніку. Міронаў адзначае, што спецыялістам у ходзе расследавання катастрофы не ўдалося ўстанавіць, хто сачыў за радарам у момант трагедыі. Гагарын загінуў 27 сакавіка 1968 года пры выкананні трэніровачнага палёту на навучальным знішчальніку МіГ-15ВТЗ разам з лётчыкам-інструктарам Сярогіным. Самалёт разбіўся недалёка ад вёскі Навасёлава Кіржацкага раёна Уладзімірскай вобласці.

### ПЕРШЫ БЕСПІЛОТНЫ ПАСАЖЫРСКІ ЦЯГНІК ЗАПУСЦІЛІ Ў ВЯЛІКАБРЫТАНІІ

Як паведамляе газета Guardian, рух гэтага цягніка з'яўляецца цалкам аўтаматызаваным і машыніст, па сутнасці, ператвараецца ў швейцара — усе яго функцыі звяліся да кіравання дзвярыма саставу. Праект быў ажыццёўлены брытанскай чыгуначнай кампаніяй Thameslink Railway, якая займаецца абслугоўваннем аднайменнай чыгункі. Яе працягласць складае 225 км, яна налічвае 68 станцый. Па задумцы канструктараў, перавага аўтаматызацыі чыгуначнага руху заключаецца ў тым, што ў перспектыве гэта можа дапамагчы пасажырам эканоміць час, а таксама знізіць імавернасць чалавечай памылкі. Па інфармацыі газеты, уся работа над гэтым праектам заняла каля пяці гадоў і каштавала 7 мільярдаў фунтаў стэрлінгаў (каля 10 мільярдаў долараў).

## На парадку дня

# Праверка парковак і наведванне сям'яў...

## Міліцыя праводзіць актыўную прафілактычную работу

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з міністрам унутраных спраў Ігарам Шуневічам даў даручэнне міліцэйскаму ведамству звярнуць асаблівую ўвагу на сітуацыю з бяспекай пасля трагічных падзей у расійскім Кемераве. Прычым задача ставілася значна шырэйшая, чым проста праверыць кінатэатры і гандлёвыя цэнтры: павінны быць ахоплены ўсе месцы масавага збору людзей, а таксама жылыя дамы.**

Зараз супрацоўнікі міліцыі сумесна з іншымі службамі праводзяць абследаванні гарышчаў, падвалаў, месцаў агульнага карыстання шматкватэрных жылых дамоў, будынкаў і збудаванняў. Галоўная мэта — выяўленне парушэнняў пункта 15.1 Правілаў карыстання жылымі памяшканнямі, утрымання жылых і дапаможных памяшканняў. Згодна з ім, не дапускаецца знаходжанне старонніх асоб у тэхнічных памяшканнях (падвальныя, паддашкавыя, тэхнічныя падполлі і паверхі, электрашчытавыя) жылога дома. Дзверы дадзеных памяшканняў павінны замыкацца на замок, а ключы знаходзіцца ў даступным для атрымання месцы. У выпадку неабходнасці ў мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы будуць накіраваны прапановы па абсталяванні пад'ездаў жылых дамоў сістэмамі відэаназірання.

Акрамя таго, прадстаўнікі МУС выяўляюць пустуючыя хаты, старыя будынкі і збудаванні, аб'екты няскончанага будаўніцтва, куды беспярашкодна могуць пранікнуць староннія. Доступ павінен быць абмежаваны, каб гарантаваць бяспеку на аб'екце.

Сумесна з сацыяльнымі службамі ўчастковыя міліцыянеры наведваюць праблемныя сем'і, адзінокіх пажылых грамадзян, асоб, якія вядуць асацыяльны лад жыцця, не толькі для таго, каб правесці тлумачальную працу, але і каб ацаніць бяспеку ўмоў іх пражывання.

Зразумела, што ў цэнтры ўвагі застаюцца гандлёва-забаўляльныя цэнтры і іншыя месцы масавага збору людзей. Супрацоўнікі міліцыі правяраюць размяшчэнне транспартных сродкаў на паркоўках, каб выявіць, ці зможа ў выпадку неабходнасці да будынка пад'ехаць спецтэхніка. Не жадаючы прайсці некалькі лішніх метраў, многія кіроўцы пакідаюць аўтамабілі ў недазволеных месцах, забываючы аб гэтым важным аспекце агульнай бяспекі.

**Дар'я КАСКО**

## Дыверсіфікацыя экспарту

# АФРЫКАНСКІ ВЕКТАР БЕЛАРУСКІХ КАМПАНІЙ

**У Мінску беларускія прадпрыемствы вучыліся супрацоўнічаць з Афрыканскім кантынентам. Бізнес-семінар «Афрыка. Экспартныя перспектывы» праводзіў Цэнтр дзелавой адукацыі Беларускай гандлёва-прамысловай палаты. Удзельнікам расказалі аб тым, як арганізоўваць працу і прасоўваць сваю прадукцыю.**

Перад пачаткам мерапрыемства **намеснік міністра замежных спраў Андрэй ДАПКЮНАС** заявіў журналістам, што ў перспектыве Беларусь не збіраецца абмяжоўвацца толькі гандлем з краінамі Афрыкі. Каб выканаць задачы па дыверсіфікацыі экспарту, нам неабходна ствараць там сумесныя вытворчасці.

У сваю чаргу **старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір УЛАХОВІЧ** адзначыў, што яшчэ ў 2016 годзе экспартны партфель Беларусі ў Афрыку абагнаў нават расійскі на $3 млн і склаў $233 млн.

«Партфель аснoўваецца на прасоўванні нашага машынабудаўнічага комплексу. Але ёсць і іншыя прыклады. У нас ёсць цікавыя напрацоўкі па засваенні радовішчаў у Афрыцы, па прадуктах харчавання, развіцці нашых паслуг аховы здароўя, нафтахіміі, сельскагаспадарчых тэхналогій», — растлумачыў старшыня БелГПП.

На мерапрыемстве таксама прысутнічаў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Нігерыі ў Расіі і Беларусі па сумяшчальніцтве Стыў Дэвіс УГБА.** Ён выказаў надзею, што ў хуткім часе беларусы дапамогуць Нігерыі адкрыць сумесные прадпрыемствы па зборачнай вытворчасці трактароў. Ён адзначыў, што мае намер з чарговым візітам наведаць Беларусь на пачатку красавіка.

«Я планую вярнуцца ў Беларусь з невялікай дэлегацыяй дзелавых колаў Нігерыі, каб наладзіць кантакты з мясцовымі бізнесменамі. Будуць сур'ёзныя перагаворы з Мінскім трактарным заводам», — паабяцаў Стыў Дэвіс Угба.

У працэсе семінара ўдзельнікі азнаёміліся з механізмамі дзяржаўнай падтрымкі айчыннага экспарту. Падчас панэльных дыскусій прадстаўнікі дыпламатычных і консульскіх устаноў краін Афрыкі ў Беларусі, а таксама кіраўнікі беларускіх кампаній абмеркавалі практычныя пытанні, якія звязаны з прасоўваннем экспарту на гэтыя кантынент.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

## Званок на прамую лінію як аператыўнае вырашэнне пытання

**У суботу, 31 сакавіка, па традыцыі чыноўнікі ўсіх узроўняў выйдуць на сувязь з насельніцтвам. Практыка прамых тэлефонных ліній працягваецца, вырашыць такім спосабам свае пытанні не ўпускаюць магчымасці многія беларусы.**

Прамыя тэлефонныя лініі ў гэтую суботу пройдуць з 9.00 да 12.00, іх правядуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

старшыня ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Мікалай Мікалаевіч ШАРСНЁЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Андрэй Міхайлавіч КУНЦЭВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Віктар Сяргеевіч ЛАПЦЕЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

■ Спажывец

# САЛОНЫ ПРЫГАЖОСЦІ ДЛЯ МУЖЧЫН

## Што новага прапануе сфера бытавых паслуг?

**Кожны пяты аб'ект бытавога абслугоўвання — гэта цырульня, кожны восьмы — СТА. Шырока распаўсюджаны таксама майстэрні па рамонце і пашыве швейных вырабаў і абутку, рамонце і ўстаноўцы камп'ютараў, офісных і іншых машын і абсталявання, пункты арэнды і пракату. Усяго ў краіне аказваецца 157 відаў бытавых паслуг.**

### Вёска чакае прадпрымальнікаў

На пачатак года ў гэтай галіне працавалі 33,7 тысячы суб'ектаў гаспадарання больш чым у 27,4 тысячы аб'ектаў. Толькі 13 працэнтаў з зарэгістраваных юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў аказваюць бытавыя паслугі ў сельскіх населеных пунктах. Яшчэ трэціна працуе ў райцэнтрах.

— За мінулы год у сферу ўдалося прыцягнуць каля 3,3 тысячы суб'ектаў, якімі было адкрыта 3,7 тысячы новых аб'ектаў. Пры гэтым каля паловы з іх прыйшліся на раённыя цэнтры і сельскую мясцовасць, — гаворыць **начальнік упраўлення сацыяльнай сферы і паслуг Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Валяр'ян БЯСПАЛЫ.**

Летась на рамонт, тэхнічнае пераснашчэнне аб'ектаў з мясцовых бюджэтаў было накіравана тры мільёны рублёў. На наступныя тры гады на фінансаванне мерапрыемстваў дзяржаўных праграм па бытавым абслугоўванні запланавана прыцягнуць больш за 21 мільён рублёў — як за кошт мясцовых бюджэтаў, так і ўласных сродкаў арганізацый.

### Драй-бар і пракат сегвэяў

Сталічная сфера бытавога абслугоўвання налічвае 31,7 тысячы працоўных месцаў. Найбольшая колькасць аб'ектаў традыцыйна ў Маскоўскім і Фрунзенскім раёнах. 97 працэнтаў суб'ектаў гаспадарання — прыватныя. Амаль кожны трэці аказвае паслугі з выездам да заказчыка і арганізуе сваю дзейнасць пераважна ў інтэрнэце.

— Мяркуем, што развіццё новых паслуг будзе ў такіх кірунках, як індустрыя прыгажосці, аўтасэрвіс, рамонт і будаўніцтва жылля, клінінг, — дзеліцца **першы намеснік начальніка ўпраўлення бытавога і гасцінічнага абслугоўвання насельніцтва Мінгарвыканкама Наталля СУЙКОВА.**

А вось якія навінкі ўжо з'явіліся ў сталіцы. Напрыклад, салоны прыгажосці для мужчын, дзе могуць не толькі падстрыгчы, але і зрабіць манікюр, педыкюр, прадаюць мужчынскую касметыку. Адкрыўся драй-бар — там аказваюць экспрэс-паслугі па мыцці галавы і ўкладцы валасоў. Развіваецца пракат у сферы актыўнага адпачынку. Гараджанам прапануюць у арэнду сегвэі (від двухколавага транспарту), электракатамараны. Попытам карыстаецца абсталяванне для правядзення вечарынак.

Наталля Суйкова расказала таксама пра будучыню лазні № 1, што на вуліцы Багдана Хмяльніцкага. Рамонтныя работы там нарэшце пачнуцца ў сярэдзіне гэтага года. Адкрыць абноўленую лазню плануюць да канца 2019-га. Яе знешні воблік застанецца ранейшы, а ўнутры ўсё будзе цалкам мадэрнізавана. На першым паверсе размесціцца міні-цырульня на два месцы, бар, басейн. На другім — агульныя парыльні (мужчынскае і жаночае аддзяленні на 28 чалавек кожнае) і два нумары люкс. Будзе прадугледжана спецыяльнае абсталяванне для інвалідаў.

### Беспрэцэдэнтныя льготы

Летась былі прыняты тры важныя для сферы дакументы — Указ № 337 «Аб рэгуляванні дзейнасці фізічных асоб», Указ № 345 «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання» і Дэкрэт № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва».

— На наш погляд, былі ўстаноўлены беспрэцэдэнтныя льготы, — лічыць Валяр'ян Бяспалы. — Так, Дэкрэт № 7 мінімізаваў умяшанне службовых асоб у працу суб'ектаў гаспадарання. Апошнія цяпер самі могуць устанаўліваць рэжым работы, вызначаць парадак фарміравання заказаў, маюць права не ўзгадняць выкарыстанне гаража з членамі таварыства.

Пры Мінгарвыканкаме створана працоўная група, якая тлумачыць грамадзянам работу дэкрэта. У яе ўваходзяць галоўны санітарны ўрач сталіцы, прадстаўнікі МНС, камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва, упраўлення бытавога і гасцінічнага абслугоўвання аблвыканкама.

— На сустрэчах мы анансуем свае працоўныя тэлефоны, — заўважае Наталля Суйкова. — Мы абсалютна адкрыты для тлумачэння палажэнняў Дэкрэта № 7.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■ Надвор'е

# ІДЗЕ ЦЯПЛО...

**У нядзелю спецыялісты чакаюць да плюс 16 градусаў**



**Ужо гэтымі днямі, пачынаючы з паўднёва-заходніх раёнаў, тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам франтальных падзелаў. Яны прынясуць ападкі і цёплае паветра з паўднёвага захаду Еўропы, так што тэмпературны фон пачне павышацца, паведамляюць эксперты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу ўначы ў асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Удзень пад уплывам атмасфернага фронту, які перамяшчаецца з Карпат, на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. Уначы і раніцай месцамі чакаецца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла, удзень будзе ад плюс 3 да плюс 9 градусаў, па паўднёвым захадзе краіны паветра прагрэецца да 10—13 цяпла.

Першы дзень красавіка парадуе нас цёплым, але сырым надвор'ем. Тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам атмасферных франтоў ад цыклону з цэнтрам над усходам Польшчы. На большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, удзень у асобных раёнах чакаюцца моцныя (!) дажджы. Удзень на паўднёвым усходзе краіны прагназуецца парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 3—9 градусаў, толькі па паўночным усходзе краіны будзе ад мінус 2 да плюс 2 градусаў. Тэмпература ўдзень будзе знаходзіцца ў межах ад плюс 6 градусаў па поўначы да 16 цяпла па паўднёвым усходзе краіны. У многіх раёнах ападкі будуць суправаджацца моцным парывістым ветрам.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Цэны

# ЯШЧЭ ПЛЮС КАПЕЙКА



**Сёння ў краіне зноў падаражэе аўтамабільнае паліва. Рознічныя цэны на аўтазаправачных станцыях павялічацца на 1 капейку, або ў сярэднім на 0,75 працэнта.**

Як паведамляюць у прэс-службе «Белнафтахіма», з 30 сакавіка кошт 1 літра бензіну АІ-92-К5-Еўра складзе 1 рубель 25 капеек, АІ-95-К5-Еўра — 1 рубель 33 капейкі, АІ-98-К5-Еўра — 1 рубель 54 капейкі, ДП — 1 рубель 36 капеек. Гэта ўжо пятае падаражанне сёлета. Апошні раз цана на паліва змянялася 24 сакавіка: бензін і дызпаліва тады падаражэлі таксама на 1 капейку.

**Сяргей КУРКАЧ**

**Информация о выплате дивидендов по акциям**

Открытое акционерное общество «Строительный трест № 4», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17 настоящим информирует, что общим собранием акционеров общества от 29.03.2018 года принято решение о выплате дивидендов акционерам общества.

Размер дивидендов на одну акцию составляет 0,51653 рубля.

Установлен следующий порядок выплаты дивидендов:

– выплата дивидендов на акции, приходящиеся на долю собственности г. Минска, не позднее 22 апреля 2018 г.;

– на акции, принадлежащие физическим лицам с 06.04.2018 г. по 25.05.2018 г.

УНП 100055368

■ Чулі?

# Тонкасці статыстыкі

**Днямі ў інтэрнэце з'явілася аналітычная інфармацыя са спасылкай на статыстыку Міжнароднай асацыяцыі супрацьпажарных і выратавальных службаў. Згодна з ёй, у Беларусі на 100 тысяч насельніцтва ад агню загінула 6,1 чалавека. Больш — толькі ў Расіі. А сярэдняя колькасць загінулых на 100 пажараў — 7,9 чалавека, што і дазволіла складальнікам рэйтынга паставіць Беларусь на першую пазіцыю па гэтым паказчыку. Але, як кажуць, «сабака закапаны» ў спосабах збору статыстыкі. Падрабязней сітуацыю «Звяздзе» пракаментаваў афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.**

— У Беларусі з савецкіх часоў дзейнічае наступная схема. Чалавек, які памірае на працягу тыдня ў бальніцы ад апёкаў, лічыцца загінулым на пажары. Многія краіны прытрымліваюцца іншай статыстыкі. Нават калі ратавальнікі перадалі чалавека са 100 % апёкамі скуры спецыялістам хуткай дапамогі — лічыцца, што ён загінуў ужо не на пажары.

Некаторыя краіны лічаць любыя выпадкі баявымі. Да іх адносяцца, напрыклад, дзяжурствы на масавых мерапрыемствах. Што да Беларусі, то ў нашы зводкі трапляюць толькі тыя выпадкі, дзе быў нанесены ўрон маёмасці або пацярпелі людзі.

Летась у Беларусі адбылося 5314 надзвычайных сітуацый, у якіх загінула 495 чалавек. Гэта — адзін з мінімальных паказчыкаў пасля 1945 года.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

УНП 100722731

**ОАО «Промпечать»**
**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 01.01.2018 г.**

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2017 г. | На 31 декабря 2016 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ | | | |
| ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ I | 190 | 237 | 233 |
| II.КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ | | | |
| ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ II | 290 | 92 | 76 |
| БАЛАНС (190+290) | 300 | 329 | 309 |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 31 декабря 2017 г. | На 31 декабря 2016 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ III | 490 | 267 | 246 |
| V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ V | 690 | 62 | 63 |
| БАЛАНС (490+590+690) | 700 | 329 | 309 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2017 г. | За январь – декабрь 2016 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 563 | 561 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (386) | (427) |
| Управленческие расходы | 040 | (140) | (122) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050) | 060 | 37 | 12 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (060+070-080) | 090 | 25 | (4) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности(100-110+120-130) | 140 | 25 | 25 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (090+140) | 150 | 50 | 21 |
| Налог на прибыль | 160 | (12) | (6) |
| Чистая прибыль (убыток) (150-160+170+180-190-200) | 210 | 31 | 11 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию, рублей | 250 | – | – |


# Беларуска-ўкраінскі мёд. Паэтычны

**У Луцку, які здаўна паяднаны з беларускай старонкай, выйшла кніга беларускай паэтэсы Аксаны Спрынчан «Кава з украінскім мёдам».**

Гэты творчы праект, які з украінскага боку як перакладчык ажыццяўляў Мікола Мартынюк, заслугоўвае шырокай увагі. Па-першае, кніга выдадзена на дзвюх мовах. І ў чытача як з Украіны, так і з Беларусі ёсць магчымасць прычыніцца да прыгожага пісьменства суседняга народа. Па-другое, сам факт з'яўлення ёмістага, грунтоўнага паэтычнага зборніка беларускага аўтара ў суседняй краіне сведчыць пра непарушнасць культурных, літаратурных сувязяў нашых народаў. «Кава з украінскім мёдам» — гэта і напамін пра тое, што ўкраінскія перакладчыкі праз усё XX стагоддзе былі ўважлівыя да беларускай паэзіі: кнігі вершаў і паэм Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна, Уладзіміра Караткевіча, Пімена Панчанкі, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова для чытача з неабсяжнай украінскай прасторы гучалі і гучаць як родныя. Спадзяёмся, што такім жа дружалюбным і для паэтаў, і для чытачоў будзе і XXI стагоддзе. Так яно і ёсць зараз, бо ва Украіне выдаюцца кнігі Людмілы Рублеўскай, Алены Масла ды шмат яшчэ каго з сучасных беларускіх пісьменнікаў, а зараз яшчэ і Аксаны Спрынчан.

«Вялікае Княства Любові / мы ўспомнім у іншай краіне. / Памянем былую сталіцу / і вып'ем за велічнасць мовы. / Той мовы, / з якою кахалі, / той мовы, / што нам засталася / ад Княства / Вялікай / Любові...» — піша Аксана Спрынчан. Тонкі лірык, яна не цураецца грамадзянскіх матываў, робіць гэта шчыра і прачула. Таму і цягне да сябе, вабіць яе паэзія. Таму і кожная кніга Аксаны Спрынчан — гэта як крынічная вада. Дарэчы, хоць і нарадзілася беларуская паэтэса ў Лунінцы, на Берасцейшчыне, яна роднымі сваімі карэннямі — «продкамі па мячы» — звязана і з братняй Украінай.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# «АЛЁ, ГЭТА МІЛІЦЫЯ?»

## Што на самай справе ўваходзіць у абавязкі дзяжурнага

**У большасці людзей, не звязаных з міліцыяй, уяўленне аб тым, як працуе аператыўна-дзяжурная служба, склалася пад уплывам серыялаў. Дык вось, там дзяжурны часцей за ўсё паказаны як павольны чалавек, які зрэдку строгім голас адказвае «Міліцыя слухае». У рэчаіснасці значна больш гэтая праца нагадвае тое, што адбываецца ў коміксах — будні супергерояў. З чым яшчэ параўнаць сітуацыю, калі трэба быць гатовым адказаць амаль па дзесяці каналах сувязі, не выпускаць трубку з рук на працягу васьмі гадзін запар ці ўмець знаходзіць асаблівы падыход да кожнага. Хіба гэта не тыя самыя суперздольнасці?**



Старшы інспектар-дзяжурны маёр міліцыі Андрэй КІСЕЛЬ на пасту.

### Вопыт чуцён у голасе

Інакш кажучы, адказ на тэлефонныя званкі — гэта толькі вяршыня айсберга ў працы дзяжурнага. Задача дзяжурнай часткі заключаецца ў «ажыццяўленні пастаяннага кантролю за аператыўнай абстаноўкай на абслугоўваемай тэрыторыі». Што гэта значыць — давайце разбірацца на прыкладзе аператыўна-дзяжурнай службы (АДС) РУУС Цэнтральнага раёна сталіцы.

Сярэдзіна дня, пятніца. У холе будынка міліцыі знаходзіцца з дзясятак чалавек: хтосьці прыйшоў даваць паказанні, хтосьці высветліць, што адбылося з іх блізкімі. Усе сядзяць моўчкі, хіба што практычна кожны нервова перабірае тое, што трапляецца пад руку. Абстаноўка здаецца адносна спакойнай роўна да таго моманту, пакуль не наблізішся да акенца дзяжурнага. Адтуль даносіцца бесперапынны гул: то званок тэлефона, то сігнал рацыі, акрамя таго туды пастаянна грукаюць супрацоўнікі і наведвальнікі — кожны са сваёй просьбай і чарговым неадкладным пытаннем.

— У сярэднім за дзяжурныя суткі ў АДС паступае 123 паведамленні. У самыя складаныя дні іх колькасць можа даходзіць і да 260. Часцей за ўсё самымі напружанымі выдаюцца пятніцы і перадсвяточныя дні, потым па колькасці зваротаў ідуць суботы і часам панядзелкі. А вось на самі святы, асабліва калі яны выпадаюць на вялікія выхадныя, сітуацыя звычайна спакойная: шмат людзей выязджае з горада, — тлумачыць **начальнік аператыўна-дзяжурнай службы Цэнтральнага РУУС г. Мінска падпалкоўнік міліцыі Міхаіл ТКАЧОЎ.**

Паведамленні на пост дзяжурнаму паступаюць як наўпрост з гарадскога тэлефона, так і са службы 102. Прымаючы званок, спецыяліст павінен скласці электронную картку, у якой утрымліваюцца звесткі аб заяўніку, парушэнні і, вядома, адрас. Інфармацыя пра тое, што, калі вы не прадставіцеся, заяву ў вас не прымуць — міф. Да ведама бяруцца абсалютна ўсе званкі, за гэтым строга сочаць. Адзін з абавязкаў адказнага дзяжурнага па РУУС — праслухаць усе паведамленні. Яны, вядома, фіксуюцца.

Для прыкладу Міхаіл Міхайлавіч уключае нам адзін з запісаў. На ім пажылая жанчына скардзіцца на тое, што рабочыя адкрылі дзверы ў пад'езд, а самі цэлы дзень нічога не робяць. З ёй гутарыць, мяркуючы па голасе, малады чалавек, які доўга высвятляе падрабязнасці.

— Памочнік дзяжурнага працуе ў нас каля месяца. І гэта адразу чуваць па голасе. Размову, якая доўжылася дзве хвіліны, можна было ўкласці ў трыццаць секунд: як завуць, дзе жывеце, што здарылася, чакайце міліцыю, — тлумачыць начальнік аператыўна-дзяжурнай службы.

### Без умяшальніцтва ў сямейныя адносіны

Паколькі Цэнтральны раён ахоплівае цэнтр горада, дзе засяроджана вялікая колькасць офісных будынкаў і гандлёвых аб'ектаў, востра стаіць пытанне парковак і арганізацыі дарожнага руху ў прынцыпе. Як правіла 60—80 паведамленняў, а гэта больш за палову ад агульнай колькасці, штодня паступае па лініі ДАІ. Пакуль мы размаўляем, дзяжурны паспявае сабраць следча-аператыўную групу. Праблема — падрапаная вострым прадметам машына. На месца выязджаюць следчы, эксперт і супрацоўнік крымінальнага вышуку.

Дарэчы, што датычыцца прыбыцця на месца злачынства. Свой «рэгламент» у гэтым пытанні таксама ёсць. Калі гаворка ідзе аб адміністрацыйным правапарушэнні, то для выбыцця на месца ёсць



Нарад міліцыі аператыўна выбывае на паведамленне аб крадзяжы грошай з шафкі ў аквапарку.

25 хвілін, калі ж вызначаны прыкметы крымінальнага злачынства, час на зборы першага нарада не больш за 10 хвілін. І, як вы ўжо зразумелі, арганізацыяй гэтага працэсу таксама займаецца дзяжурны: менавіта ён вызначае, хто павінен адправіцца на месца, і шукае свабодных спецыялістаў. Прасачыць за перасоўваннем нарадаў можна па інтэрактыўнай карце. У ёй адзначаны экіпажы ДАІ і супрацоўнікі патрульна-паставой службы.

Таксама дзяжурны рыхтуе следча-аператыўную групу да заступлення на службу. Менавіта ён даводзіць іншым супрацоўнікам зводкі за апошнія суткі і знаёміць іх з новымі арыенціроўкамі і тэлеграмамі. Адпаведна ў канцы дня дзяжурны складае даклад аб аператыўнай абстаноўцы ў раёне. Калі іншыя работнікі адпраўляюцца дадому, за забеспячэнне аховы будынка РУУС адказны штатны нарад АДС.

Акрамя гэтага на дзяжурных ляжыць задача разбіральніцтва з асобамі, дастаўленымі ў аператыўна-дзяжурную службу. Сярод прычын можа быць неабходнасць высветліць асобу, адміністрацыйнае правапарушэнне, напрыклад, дробнае хуліганства, знаходжанне ў грамадскім месцы ў п'яным выглядзе, дробны крадзеж ці крымінальнае злачынства. У сярэднім у дзень прывозяць 23 чалавекі, трое з якіх падазраюцца ў здзяйсненні злачынстваў. У абавязкі дзяжурнага ўваходзіць устанаўленне асобы, складанне пратаколаў, калі ёсць падставы, утрыманне ва ўмовах АДС да трох гадзін, у выключных выпадках па ўзгадненні з кіраўніцтвам РУУС да 12 гадзін, а таксама падрыхтоўка матэрыялаў для далейшай работы з затрыманымі. Часцей за ўсё ў камеры аказваюцца, вядома, маргінальныя элементы. Многія пазнаюць адзін аднаго, радасна вітаюцца. Глядзець на гэта без звычкі даволі цяжка: чалавечы твар да непазнавальнасці скажае адурманьваючая маска.

Дарэчы, у стане моцнага алкагольнага ап'янення грамадзян у дзяжурную частку не адпраўляюць — дастаўляюць наўпрост у бальніцу. З дому забіраюць толькі дэбашыраў. Як бы гэта жудасна ні гучала, там грамадзяне маюць поўнае права ўжываць столькі алкаголю, колькі лічаць патрэбным. Тое ж самае датычыцца і сямейных скандалаў: калі справа не даходзіць да рукапрыкладства, разбіраць трэба самастойна. Дарэчы, менавіта бытавыя сваркі часцей за ўсё з'яўляюцца прычынай для памылковага выкліку міліцыі, што можа пацягнуць за сабой накладанне штрафу ад 4 да 15 базавых велічынь, у выпадку паўтору — ад 20 да 50 базавых.

### Няўрымслівая птушка ці 1001 пытанне

Дзе знайсці ўчастковага? Мяне падперла машына! Выцягнулі кашалёк, напэўна, у аўтобусе ... З гэтымі і яшчэ, здаецца, бясконцасцю пытанняў штодня жыхары Мінска звяртаюцца ў дзяжурную часць.

У сярэднім па гарадскім тэлефоне ў АДС Цэнтральнага РУУС паступае каля 200 званкоў у суткі, як правіла працягласць размовы ад адной да трох хвілін. Пасля складаецца больш за 120 картак, час апрацоўкі адной і адпраўлення нарада — яшчэ дзве-тры хвіліны. Акрамя таго, ёсць унутраны тэлефоны, па якіх таксама паступае не менш за 200 званкоў. Плюс тэлефон дзяжурнага па горадзе, службы 102 і радыёстанцыя. У дадатак да гэтага — тры мабільныя тэлефоны. У выніку за дзяжурныя суткі супрацоўнік АДС каля васьмі гадзін проста не выпускае трубку з рук.

Без жалезных нерваў у гэтай рабоце сапраўды не абысціся. Менавіта таму ў дзяжурную часць ідуць найбольш падрыхтаваныя людзі, якія праслужылі ў органах унутраных спраў больш за два гады.

**Старшы інспектар-дзяжурны маёр міліцыі Андрэй КІСЕЛЬ** якраз з такіх. У структуры МУС ён з 1994-га, чатыры апошнія гады — на пасадзе дзяжурнага. Як толькі мы спрабуем пачаць размову, альбо чуецца званок, альбо на гарызонце з'яўляецца чарговы просьбіт. За адну хвіліну цішыні вопытны работнік паспявае адзначыць, што на складанасць працы скардзіцца не трэба — да ўсяго можна прыстасавацца. Тым больш, не абыходзіцца і без пацешных сітуацый. Самы смешны выпадак, калі ў службу а пятай раніцы патэлефанавала дзяўчына, якая скардзілася на суседскага пеўня. Праўда, птушка-«дэбашыр» так і засталася беспакаранай... На шчасце, тое ж самае нельга сказаць пра людзей, якія парушаюць закон.

— Наогул, калі казаць метафарычна, то дзяжурная служба — гэта ствол дрэва, на якім растуць галінкі. Менавіта сюды паступае ўся аператыўная інфармацыя і адсюль жа яна разыходзіцца далей па падраздзяленнях, — разважае Міхась Ткачоў.

**Дар'я КАСКО.**

### У тэму

## ЖАРТ, ПАСЛЯ ЯКОГА НЕ БЫВАЕ СМЕШНА

### Чым пагражае паведамленне аб ілжэмініраванні



**Літаральна на мінулым тыдні ў Брэсце малады чалавек патэлефанаваў у дзяжурную службу, каб расказаць, што да кузава прыпаркаванага непадалёк аўтамабіля хтосьці прымацаваў скрынку, з якой тырчаць правады. На месца выбылі аператыўныя дзяжурныя нарады ДАІ, МНС, хуткай дапамогі... На шчасце, выбуховыя рэчывы выяўлены не былі. Але каб гэта ўстанавіць, давялося адарваць ад сапраўды важнай працы немалую колькасць спецыялістаў. Зразумела, да ўсіх падобных паведамленняў ставяцца з велізарнай сур'ёзнасцю. Таму і адказнасць за заведама хлусівыя прадугледжана адпаведная. Паверце, потым дакладна будзе не да жартаў.**

Як расказаў **начальнік упраўлення аператыўна-дзяжурнай службы міліцыі грамадскай бяспекі МУС палкоўнік міліцыі Аляксей ГАЛАВАЧ,** толькі за два месяцы гэтага года было зарэгістравана тры хлусівыя паведамленні пра небяспеку: у Мінску, Гомельскай і Віцебскай абласцях. Звычайна мэтай зламысніка з'яўляецца зрыў масавых мерапрыемстваў, спыненне работы ўстаноў і прадпрыемстваў, дастаўленне клопату непрыяцелям і, вядома, класічны варыянт — адмена школьных заняткаў. Адказнасць за гэты ўчынак наступае з 14 гадоў і прадугледжвае пакаранне ў выглядзе штрафу, арышту, абмежавання волі на тэрмін да трох гадоў або пазбаўлення волі на тэрмін да пяці гадоў. Калі злачынства здзейснена паўторна, групай асоб або нанесла буйны ўрон, тэрмін абмежавання волі можа дасягаць 7 гадоў. Дарэчы, урон давядзецца пакрыць. У выпадку, калі падурэць вырашылі дзеці да 14 гадоў, пакарання ўсё роўна не ўдасца пазбегнуць. Адказнасць за іх правіну ляжа на бацькоў, а малалетнія парушальнікі будуць пастаўлены на ўлік у інспекцыю па справах непаўналетніх. Вось ужо сапраўды, дзе паведамленне ілжывае, а наступствы цалкам рэальныя.

З пачатку гэтага года па артыкуле 340 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь за заведама хлусівае паведамленне аб небяспецы прыцягнуты да адказнасці дзевяць чалавек, не ўлічваючы тых, да каго ўжытыя прымусовыя меры бяспекі і лячэння.

— Зараз у органаў унутраных спраў ёсць увесь комплекс тэхнічных сродкаў, які дазваляе вылічыць зламысніка за найкарацейшы тэрмін. Раскрывальнасць гэтага віду злачынства набліжаецца да 90 %. Таму пажартаваць без наступстваў не атрымаецца. Ладзячы такі быццам бы бяскрыўдны розыгрыш, варта лішні раз задумацца пра тое, да чаго гэта можа прывесці: не толькі адбіцца на стане грамадскага парадку, вылікаць неапраўданую паніку, але і паўплываць на далейшы лёс самога заяўніка. Прычым, калі вы выпадкова выявілі безгаспадарны падазроны прадмет, абавязкова паведаміце пра гэта супрацоўнікам міліцыі. Гэта той выпадак, калі пільнасць не бывае лішняй, — адзначыў Аляксей Галавач.

# ХТО ГАТОВЫ ДА ПЕРАМЕН?

## Прэтэндэнты на пераезд

Зразумела, работа вядзецца, каб дапамагчы беспрацоўным уладкавацца ў жыцці. Але далёка не ўсе, хто шукае працу, ведаюць аб праграме перасялення. На гэты раз інфармаваць вырашылі амаль што з парога. Кожны, хто заходзіў у хол цэнтра занятасці, мог атрымаць звесткі па гэтай тэме.

Некаторых ідэя перасялення яўна зацікавіла. У іх ліку 56-гадовы Сяргей. Ён большую частку жыцця працаваў будаўніком, але зараз яго непакоіць высокі артэрыяльны ціск. Працаваць на вышыні не можа, але быў бы згодны ўладавацца дворнікам альбо вартаўніком. На жаль, прэтэндэнтаў на такія вакансіі, як у мадэльнае агенцтва.

Да размовы падключыўся прадстаўнічага выгляду статны мужчына. Назваў сябе Мікалай Мікалаевіч, узрост — 50 гадоў. Мужчына не працуе два гады.

Пакуль пошукі работы не далі патрэбных вынікаў. Напрыклад, у той дзень, калі адбылася наша сустрэча, Мікалай пабываў у трох месцах. Вакансію грузчыка занялі, а на дворніка прапанавалі скласці рэзюмэ, толькі пасля гэтага адбудзецца адбор прэтэндэнтаў.

Мужчына паведаміў, што гатовы паехаць працаваць жывёлаводам у Мінскі раён, дзе прапануюць жыллё. Але ці даедзе да месца?

Яшчэ адзін гродзенец, 50-гадовы Анатоль мае канкрэтную мэту — зарабіць, бо за 300 рублёў у месяц кожны дзень на працу хадзіць не згодны. Мужчына расказаў, што можа працаваць зваршчыкам, электрыкам, кіроўцам. Аб яго багатым лёсе можна судзіць па геаграфіі — Урал, Чэхаславакія, Казахстан... Таму пераезд яго не палохае... Галоўнае, каб за работу добра плацілі, не менш за 600 рублёў. За доўгім рублем ён гатовы паехаць у сельскую мясцовасць, хоць і работа там цяжэйшая.

## Чаму не склалася?

Сапраўды, у перасяленцаў больш шанцаў уладкавацца ў сельскай мясцовасці, падкрэсліў **супрацоўнік гарадскога цэнтра занятасці Віктар КІСЯЛЁЎ.** Пры пераездзе беспрацоўны атрымлівае бязвыплатную фінансавую падтрымку — каля 1,8 тысячы рублёў. Калі чалавек перасяляецца з аднаго горада ў іншы, сума меншая — каля 1,4 тысячы.

Аднак нельга сказаць, што гараджане кінуліся перяязджаць у вёскі і аграгарадкі, як адзначае суразмоўнік. Напрыклад, за папярэднія два гады перасяліліся шэсць сем'яў — па тры ў год. Сярод адрасоў — горад Слонім, Мастоўскі раён, Брэсцкая вобласць. Каб не вяртаць «пад'ёмныя», трэба адпрацаваць на новым месцы не менш за паўгода. Былі выпадкі, калі звальняліся з новай працы пасля года. Прычыны розныя. Напрыклад, Ігар з Зэльвенскага раёна не змог справіцца з нагрузкай на новым месцы. Літаральна на два гады таму ён пераехаў у Дзяржынскі раён, дзе ўладкаваўся па спецыяльнасці — галоўным заатэхнікам на агракамбінаце. Па яго словах, прэтэнзій да бытавых умоў не ўзнікала, жыллём спецыяліста забяспечылі. Але працаваць прыходзілася дапазна, часам без выхадных. Такога напружанага рытму мужчына проста не вытрымаў. Таму і прыняў рашэнне вярнуцца бліжэй да дому.

Пасля вяртання ў Гродна, пайшоў праваць мантажнікам у прыватную будаўнічую фірму. Спецыяльнасць асвойвае па ходзе справы.

## Пераехалі і задаволены

Так пра сябе можа сказаць Станіслаў Іосіфавіч са Шчучынскага раёна. Ён скончыў аграрную ВНУ, па спецыяльнасці ветэрынар. Працаваў на ветстанцыі. І ўсё б нічога, але дарога на работу ад дому займала 16 км і зарплата не задавальняла. Таму і пачаў мужчына, які мае сям'ю, шукаць больш спрыяльных умоў. Дзякуючы сваёй спецыяльнасці, знайшоў працу ў суседнім Гродзенскім раёне, на буйным агракамбінаце. Спачатку працаваў у адным з філіялаў, а затым яго перавялі на галаўное прадпрыемства з больш шырокімі паўнамоцтвамі. Шматдзетнай сям'і адразу далі кватэру ў Скідзеле, амаль удвая вырасла зарплата, жонка таксама знайшла работу па спецыяльнасці — працуе швачкай. «Добра, што ёсць праграма па перасяленні беспрацоўных, — кажа Станіслаў, — зараз мы і іншым падказваем аб яе існаванні».

З пачатку года з Гродна, ды і ў цэлым па вобласці, пакуль ніхто з беспрацоўных не скарыстаўся магчымасцю пераехаць у іншую мясцовасць. Ці захаваецца ў рэгіёне тэндэнцыя росту перасяленцаў — беспрацоўных, сказаць цяжка. Магчыма, паспрыяе гэтаму і тыдзень перасялення. Толькі падчас гарадской акцыі Віктар Кісялёў знаёміў з ёй да 10 чалавек у дзень.

— Прыходзілі ў асноўным мужчыны працаздольнага ўзросту, — адзначыў работнік цэнтра занятасці, — многія выказвалі жаданне працаваць у сельскай гаспадарцы. — Але тут трэба ўлічваць і іншы бок — наймальніка. А ён хоча прымаць у сябе кваліфікаваных спецыялістаў — ветэрынарных урачоў, заатэхнікаў, аграномаў.

Паводле базы даных, вакансій на вёсцы хапае, асабліва ў жывёлагадоўлі. Гэта галіна зараз актыўна развіваецца, і спецыялісты патрэбны ўсюды.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***




## ПА ЎВАЖЛІВАЙ ПРЫЧЫНЕ

Гэту гісторыю я пачула ад сваёй новай прыяцелькі Ніны, з якой летась пазнаёмілася ў санаторыі. Апынуўшыся за адным сталом, мы неўпрыкмет разгаварыліся і чаго толькі не прыгадалі...

Гадоў колькі таму Ніна як малады спецыяліст прыйшла на працу ў адну сталічную арганізацыю. Цікавая работа, цудоўны калектыў, адэкватны кіраўнік — усё найлепшым чынам! Адзінае, праз нейкі час пайшла пагалоска: установа, дзе іх арганізацыя арандуе плошчу пад офіс, збіраецца ўвесці прапускны рэжым. Гэта значыць, што кожны з супрацоўнікаў атрымае электронную картку-пропуск, якая будзе дакладна паведамляць начальству, хто на колькі хвілін спазніўся, хто раней дадому пайшоў. Карацей — аніякай вольніцы, усё пад пільным кантролем, яшчэ і падвоеным, бо час ад часу стан працоўнай дысцыпліны правярала начальства зверху.

І трэба ж — якраз у такі вось дзень адна з Нініных каляжанак умудрылася спазніцца аж... на дзве гадзіны.

— Пішы тлумачальную! — загадаў ёй звычайна стрыманы шэф.

Часу на гэта дзяўчыне спатрэбілася зусім няшмат, і хутка ён, не верачы вачам, чытаў: «Я спазнілася на працу, таму што бачыла вельмі цікавы сон і мне трэба было дагледзець яго да канца».

З гэтай тлумачальнай рагатаў увесь калектыў. Можа, рагоча і зараз, бо аматарка паспаць па-ранейшаму час ад часу спазняецца. Напэўна, якраз пад раніцу ёй сняцца самыя прыгожыя сны?

**Ірына Матусевіч,**
*Дзяржынскі раён.*

## ЗАБІЦЬ НЕ ЗАБІЛА, АЛЕ Ж ШУМУ НАРАБІЛА

Гадоў 50 таму па нашым Дняпры (вёска Лучын на беразе стаіць) праплывалі цэлыя караваны плытоў, кожны — даўжынёй з кіламетр, а то і болей. На іх спецыяльныя «буданы» стаялі, печкі для гатавання ежы, бо шляху ж некалькі дзён: калі да Лоева, а калі і да Кіева...

Ад веку нашы лучынцы зараблялі на сплаве. Праца гэта цяжкая, небяспечная, аднак за яе і плацілі. Заґнаў, дапусцім, караван у Лоеў — атрымай 700 савецкіх рублёў, што, вядома ж, не раўня цяперашнім... Ды і «левыя» заробкі ў плытагонаў былі, бо лес жа ўсім патрэбны. А дзе яго ўзяць па боскай цане? Ну вядома — у плытагонаў. «Да Лоева ўсё пабудавана з крадзенага лесу, — казаў стары «сплаўны» дзед Лёнік. — А наш Лучын дык і наогул — да апошняй дошчачкі!»

Значыць, і сапраўды зараблялі плытагоны добра. Гулялі, трэба сказаць, таксама: займалі амаль усю сталоўку і «гудзелі» да позняй ночы. Моды браць з сабой жонак ці «запрашаць дзяўчатак» тады не было. Без іх абыходзіліся: розныя размовы вялі, песні спявалі. Найбольш — пра тое, як ехалі казакі, як *«ревела буря, гром гремел»...*

Работніцы сталовай супраць гэтых «песень» нічога не мелі, бо гэта ж, сучасна мовай кажучы, віп-кліенты былі: за некалькі сваіх гулянак месячны план «рабілі».

А вось жонкі «сплаўных» абураліся (яшчэ мякка кажучы): тым найперш, што мужчыны меры не ведалі, напіваліся, на сваіх двух з банкету амаль ніхто не выходзіў. Жонкі іх, як бярвенні, расцягвалі: «падрульвалі» хто з каляскай, хто з тачкай — чакалі, «грузілі»...

Дык вось — чарговая палучка, чарговая гулянка.

Першай і загадзя па сваіго Пятра пацягнулася Маня. Адчувала, што ранавата яшчэ, таму па дарозе заехала да мясцовага ўмельца — забрала з рамонту рэдуктар ад швейнай машынкі, у торбу паклала. І пасядзела б у людзей, каб ім не спаць...

| Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах | 1. Заявление на участие в торгах.<br>2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка.<br>3. Копия и подлинник устава (учредительного договора) и свидетельства о государственной регистрации; доверенность – представителю юридического лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица, – для юридических лиц – резидентов Республики Беларусь.<br>4. Легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная доверенность представителя юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – для юридических лиц, иных организаций – нерезидентов Республики Беларусь.<br>5. Копия и подлинник свидетельства о государственной регистрации – для ИП – резидентов Республики Беларусь.<br>6. Легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – для ИП – нерезидентов Республики Беларусь.<br>7. Нотариально удостоверенная доверенность – для представителя гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя.<br>8. Легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – для представителя иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя – нерезидента Республики Беларусь .<br>При подаче документов физическое лицо, ИП, представитель физического лица, ИП, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал и копию документа, удостоверяющего личность |
| Сроки начала и окончания приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов | Заявления на участие в торгах и прилагаемые к ним документы принимаются с момента опубликования настоящего извещения в печатных СМИ **до 17.00 11.04.2018 года** по адресу: 210029, г. Витебск, ул. Правды, 48, каб. 11, а также на e-mail: parusnik-vitebsk@hotmail.com. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата ее регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в торгах |
| Возмещение затрат на организацию и проведение торгов | Возмещение затрат на организацию и проведение торгов производится участником, выигравшим торги, по фактическим затратам. Участник, выигравший торги, обязан перечислить на расчетный счет Продавца сумму фактических затрат, в т. ч. затрат по ранее проведенным нерезультативным, несостоявшимся торгам, в течение 5 (пяти) дней со дня проведения торгов |
| Порядок оформления участия в торгах | К участию в торгах допускаются лица, подавшие Организатору торгов в установленный срок заявление с приложением необходимых документов, внесшие в установленном порядке сумму задатка, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у Организатора торгов и получить аукционные номера |
| Порядок оформления результатов торгов | Участник, выигравший торги, и все присутствующие члены комиссии подписывают протокол о результатах торгов в 2 экземплярах в день проведения торгов. Протокол о результатах торгов утверждается Организатором торгов в день их проведения |
| Срок подписания договора купли-продажи предмета торгов | После предъявления участником, выигравшим торги, копий документов, подтверждающих возмещение затрат на организацию и проведение торгов, между Продавцом и участником, выигравшим торги, заключается договор купли-продажи предмета торгов. Договор купли-продажи предмета торгов должен быть заключен не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов |
| Ранее опубликованные объявления о проведении торгов | Газета «Звязда», № 32 (28648) от 15.02.2018 |

# «М.@rt.кантакт-2018» сказаў: бывай!

**Міжнародны тэатральны маладзёжны форум у Магілёве назваў найлепшых.**

27 сакавіка, у Міжнародны дзень тэатра, падвялі вынікі фестывальнага тыдня. Яшчэ напачатку было заяўлена, што два найлепшыя калектывы атрымаюць дыпломы «Падзея форуму» — па версіі прафесійных крытыкаў і маладзёжнай рэдакцыі фестывалю. Галоўнай падзеяй, на думку прафесіяналаў, стала зонг-опера «Медэя. Эпізоды» Тэатра Дзі Капуа з Санкт-Пецярбурга з удзелам музыкантаў культавай групы «Апошнія Танкі У Парыжы». Пастаноўка, дарэчы, узнагароджана Гран-пры прэміі імя Сяргея Курохіна і намінант на Незалежную музычную прэмію Арцемія Троіцкага «Стэпавы воўк» у намінацыі «Нешта».

А вось тэатральная моладзь, якая актыўна асвятляла ўсе падзеі форуму ў спецыяльнай газеце, вырашыла заняць пазіцыю нейтралітэту, абвясціўшы падзеяй усе спектаклі, уключаючы паказаную ў рамках спецыяльнай праграмы пастаноўку магілёўскага драмтэатра «Ліпень» і эскіз па апавяданні Васіля Быкава «Жоўты пясочак» — на працягу тыдня ў рамках майстэрні маладой рэжысуры яго рыхтавала з артыстамі Магілёўскага драмтэатра выхаванка вядомага піцерскага рэжысёра Генадзя Трасцянецкага Каміля Хусінава. «Падзея форуму — мастацтва!» — такую выснову зрабілі прадстаўнікі рэдакцыі тэатральнага весніка фестывалю.

Яшчэ каля 500 прыхільнікаў выказалі свае меркаванні ў інтэрнэце. Па інфармацыі арганізатараў, першае месца атрымаў Гомельскі гарадскі маладзёжны тэатр з пастаноўкай «Метад» (22,9 % галасоў), другое месца аддадзена Цвярскому тэатру юнага гледача і яго спектаклю «Пустэча» (11,1 %). А вось трэцяе месца дасталася Тэатра Дзі Капуа і яго «Медэі. Эпізоды» (10,3 %).

Гэтым разам было шмат пастановак з біблейскім падтэкстам, якія хоць і не сталі падзеяй форуму, але, ёсць надзея, прымусілі кагосьці задумацца над сэнсам жыцця і нешта, магчыма, змяніць у ім. Напрыклад, навучыцца несці адказнасць за свае ўчынкі, каб не быць падобнымі на герояў камедыі-прытчы «Ураджай» Маскоўскага Губернскага тэатра па п'есе нашага славутага земляка і драматурга Паўла Пражко. Звярнуцца да пошукаў свайй існасці, на што натхнілі сваім праектам «Цудоўнае і жахлівае» артысты арт-групы «Med a prach/Мёд і пыл» са Славакіі. Або ўспомніць пра міласэрнасць, сапраўдную любоў і веру разам з харкаўскім тэатрам Адэскага разліву «Ланжэрон» і іх пастаноўкай «Ліст да Бога».



«Метад»

Нагадаем, што сёлетні «М.@rt.кантакт» быў 13-ы па ліку. У ім прынялі ўдзел творчыя калектывы 20 тэатраў з 8 краін свету: Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Казахстана, Літвы, Латвіі, Славакіі. За шэсць фестывальных дзён яны паказалі 22 пастаноўкі. Магчымасць сустрэцца прыхільнікам тэатра з артыстамі розных краін далі заснавальнікі фестывалю: Міністэрства культуры, Магілёўскі абласны выканаўчы камітэт і Магілёўскі абласны драматычны тэатр.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ■ Ну і ну!

## Дзевяць гадоў судоў з-за баклажана



**Жыхар Італіі, які дзевяць гадоў таму быў абвінавачаны ў выкраданні баклажана, дабіўся адмены прысуду, паведамляе выданне The Local.**

У 2009 годзе на прыватным полі непадалёк ад горада Лечэ на поўдні Італіі злавілі 49-гадовага мужчыну з вядром, у якім ляжаў баклажан. Ён расказаў паліцэйскім, што з-за адсутнасці заробку яму давялося скрасці агародніну, каб накарміць дзіця. Суд не палічыў гэта змякчальнай акалічнасцю і прысудзіў выкрадальніка да пяці месяцаў турэмнага зняволення і да штрафу ў 500 еўра. Пазней тэрмін скарацілі да двух месяцаў, а суму штрафу — да 120. Мужчына працягнуў судзіцца і дайшоў да апошняй інстанцыі — касацыйнага суда ў Рыме. Гэты суд цалкам адмяніў прысуд і раскрытыкаваў суддзяў, якія не ўлічылі бядотнае фінансавае становішча падсуднага і дапусцілі пустое марнаванне дзяржаўных сродкаў. Мужчына карыстаўся паслугамі грамадскіх абаронцаў, на якіх за час цяжбы пайшло 7—8 тысяч еўра ■

## Даты Падзеі Людзі

### 30 САКАВІКА




**1923** год — нарадзіўся Анатоль Міхайлавіч Генералаў, спявак, педагог, народны артыст Беларусі. У 1954—1981 гадах — саліст Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі. Адначасова з 1976 года — выкладчык Беларускай акадэміі музыкі (з 1990 года — прафесар). Моцны голас, бездакорнае валоданне вакальнай тэхнікай дазволілі яму стварыць незабыўныя вобразы ў нацыянальным і класічным рэпертуарах: князь Ігар («Князь Ігар» А. Барадзіна), Зміцрок і Апанас («Міхась Падгорны» і «Алеся» Я. Цікоцкага»), Дзяніс Давыдаў («Надзея Дурава» А. Багатырова) і іншыя. Памёр у 2007 годзе.

**1933** год — нарадзіўся Канстанцін Мікалаевіч Салаўёў, беларускі вучоны ў галіне спектраскапіі і люмінесцэнцыі шмататамных малекул, член-карэспандэнт НАН Беларусі. Аўтар больш як 300 навуковых прац, у тым ліку пяці манаграфій, 14 вынаходніцтваў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, Дзяржаўнай прэміі СССР.

**1948** год — нарадзіўся Вітольд Антонавіч Бархаткоў, беларускі мастак. Піша пейзажы, партрэты, нацюрморты. Аўтар твораў «Партрэт дзяўчынкі», «Восень», «Князь Ігар на рускай зямлі» і іншых.




**1840** год — адкрыта Зямля Уілкса. 30 сакавіка 1840 года, падарожнічаючы па Антарктыдзе, Чарльз Уілкс абвясціў яе часткай тэрыторыі ЗША. Пазней яна была названая Зямлёй Уілкса (Wilkes Land). І толькі ў 1959 годзе Антарктыда была прызнана міжнароднай зонай. Антарктыда — шосты, адкрыты апошнім па ліку, мацярык на крайнім поўдні нашай планеты. Большая яе частка — ледзяная пустыня, толькі каля самых берагоў цепліца жыццё. Ледзяная Антарктыда лічыцца галоўным «халадзільнікам» нашай планеты і аказвае ўплыў на яе клімат. Лёд Антарктыды адбівае да 90 % сонечнай радыяцыі, таму мацярык не награваецца.



**1847** год — Леў Мікалаевіч Талстой пачаў весці дзённік і працягваў гэты занятак усё жыццё. У поўным зборы твораў дзённікі пісьменніка займаюць 13 тамоў.

**1853** год — нарадзіўся Вінсент Ван Гог, галандскі жывапісец, прадстаўнік постімпрэсіянізму, аўтар знакамітай карціны «Сланечнікі» і іншых. Памёр у 1890 годзе.

**1867** год — у Вашынгтоне падпісаны дагавор аб продажы ЗША Расіяй Аляскі і Алеуцкіх астравоў.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.48 | 19.42 | 12.54 |
| Віцебск — | 6.36 | 19.32 | 12.56 |
| Магілёў — | 6.38 | 19.32 | 12.54 |
| Гомель — | 6.36 | 19.27 | 12.51 |
| Гродна — | 7.03 | 19.56 | 12.53 |
| Брэст — | 7.05 | 19.56 | 12.51 |

## Месяц

*Першая квадра 24 сакавіка.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

**Пр.** *Аляксандра, Аляксея, Віктара, Макара.*
**К.** *Амеліі, Ірыны, Леанарда.*



Фота Соф'і КУСЯНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




Шаноўнага **Мікалая Макаравіча АНІСАВА**, былога дырэктара СШ № 3 г. Слуцка, шчыра віншуем з 89-годдзем! Зычым жыццёвага аптымізму, здароўя і «...на чарговым рубяжы гадоў па дваццаць акапацца»!

**З удзячнасцю за дабрыню і павагу настаўнікі М. К. Багдашыч, Новікі, А. Г. Кіпніс, В. А. Крывогіна**



## УСМІХНЕМСЯ

**Сямейнае.**
**Сварка без сексу — нервы на вецер.**

— Я хачу пахудзець!
— Купі штаны для пахудзення!
— Купіў, не налазяць...

**Бальніца цяпер — гэта месца, дзе назойлівыя пацыенты сваімі пастаяннымі скаргамі перашкаджаюць урачам спакойна працаваць з дакументацыяй.**

Аб'ява:
— Паважаныя пакупнікі! У сувязі з фінансавым крызісам наш буцік пераехаў назад на рэчавы рынак.

**Страшны праклён жанчыне: «Каб ты год сядзела на дыеце, а потым твой муж кінуў цябе дзеля тоўстай!»**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1167.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 29 сакавіка 2018 года.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
30 сакавіка 2018 г. № 13 (446)



стар. 2

Ці пераможны баршчэўнік?



стар. 3

Просім навесці парадак!



стар. 14

Дзіцячы дом ці дзіцячы сад?

ТЭМА ТЫДНЯ

# ДОБРА ТАМ, ДЗЕ ЦЯБЕ ЛЮБЯЦЬ

## Як палепшыць абстаноўку ў сям'і і не дапусціць сацыяльнага сіроцтва



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

**ЯКІЯ сем'і на асаблівым кантролі ў органаў апекі? Каго часцей пазбаўляюць бацькоўскіх правоў? Ці стала ў нас менш сірот? І як часта ўдаецца вярнуць дзяцей у сям'ю? Разбіраемся, як сёння дзейнічае Дэкрэт № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у неўладкаваных сем'ях» і што змянілася за 10 гадоў яго існавання.**

стар. 4

СЛОВЫ І СПРАВА

# УМОВЫ ДЛЯ ПРАДПРЫМАЛЬНЫХ павінны быць камфортныя



## У Магілёве адбылося выязное пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі з нагоды мер, якія прымаюцца па выкананні патрабаванняў Дэкрэтаў № 7 і № 1 Прэзідэнта Беларусі

### Лібералізаваць заканадаўства

Краіне патрэбны новыя прававыя ўмовы для паўнавартаснай рэалізацыі дэкрэтаў, для стварэння працоўных месцаў, прыцягнення інвестыцый і павышэння прадукцыйнасці працы. Такі пасыл зроблены ўсім, ад каго залежыць выкананне гэтых задач на месцах.

— Кіраўнік дзяржавы 2 сакавіка заслухаў службовых асоб па выніках работы ў 2017 годзе і паставіў шэраг адказных задач, — адзначыў **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** — У прыватнасці было сказана, што краіна да 2025 года павінна выйсці на ўзровень валавога прадукту 100 мільярдаў долараў ЗША ў эквіваленце. Гэта вельмі складаная задача, якая патрабуе мабілізацыі ўсіх структур, органаў дзяржаўнага кіравання і, безумоўна, адпаведнага заканадаўчага забеспячэння. Нарматыўна-прававыя акты павінны садзейнічаць выкананню такой важнай эканамічнай задачы. Дзякуючы гэтаму будзе адчувальна палепшаны жыццёвы ўзровень насельніцтва. Парламенту трэба ўнесці ўдакладненні, дапаўненні і змяненні ў 6 кодэксаў, 21 закон, 13 указаў Прэзідэнта і 34 пастановы Саўміна. Гэта патрэбна, каб сур'ёзна лібералізаваць заканадаўства, забяспечыць камфортныя ўмовы для гаспадарчых суб'ектаў.

стар. 2

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## БОЛЬШ СУМЕСНЫХ ПРАЕКТАЎ

*Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч сустрэўся з паслом Таджыкістана*

**Падчас перагавораў з Махмадшарыфам Хакдодам, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Таджыкістана ў Беларусі, Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што неабходна шукаць новыя варыянты двухбаковай работы. На яго думку, традыцыйныя механізмы, якія выкарыстоўваюцца ў гандлёвых адносінах, спрацоўваюць не на дастатковым узроўні. Схема таварнага супрацоўніцтва павінна дапаўняцца інвестыцыямі. Трэба ствараць сумесныя вытворчыя прадпрыемствы, кампаніі па аказанні паслуг.**



Міхаіл Мясніковіч лічыць, што для дасягнення большага эфекту неабходна задзейнічаць грашова-крэдытную сістэму і актывізаваць супрацоўніцтва менавіта ў фінансавай сферы. У той жа час трэба больш працаваць па парламенцкай лініі. Для гэтага ёсць добрая «прылада» — міжпарламенцкія групы дружбы. Аднак важнае яшчэ і ўзаемадзеянне рэгіёнаў.

## АГУЛЬНЫ РЫНАК БЕЗ ВЫКЛЮЧЭННЯЎ

**У Магілёве прайшла рабочая нарада па пытаннях падрыхтоўкі да правядзення V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.**

— Гэта вельмі адказнае мерапрыемства, — паведаміў **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** — Яно будзе суправаджацца цэлым шэрагам цікавых падзей — сустрэч рэгіёнаў на ўзроўні канкрэтных раёнаў, мерапрыемстваў з шырокім удзелам моладзі, якія пачнуцца яшчэ за некалькі месяцаў да правядзення форуму. Яшчэ адзін кірунак — і мы ўжо пераканалі ў гэтым калег па Савеце Федэрацыі, Пастаянным камітэце Саюзнай дзяржавы — вяртанне да пытанняў, звязаных з выкананнем Дагавора аб Саюзнай дзяржаве. Галоўная мэта, на якую звяртае ўвагу і наш Прэзідэнт, — каб быў агульны рынак без выключэнняў для гаспадарчых суб'ектаў і роўныя правы для грамадзян. На жаль, часам нацыянальныя заканадаўствы ідуць у разрэз адно з адным. Мэты і задачы, сфармуляваныя 20 гадоў таму ў Дагаворы, павінны дзейнічаць у канкрэтных рашэннях, нарматыўна-прававых актах і ў дзеяннях службовых асоб. Вось гэты сур'ёзны аналітычны дакумент мы збіраемся, умоўна кажучы, пакласці на стол перагавораў і выпрацаваць дадатковыя меры для таго, каб Дагавор працаваў у поўным аб'ёме. Каб былі дасягнутыя тыя мэты і задачы, якія сфармуляваны.

## ПАДНЯБЕСНЫ ПРЫЁМ

*На гэтым тыдні адбываецца рабочая паездка парламенцкай дэлегацыі ў Кітай*

**У панядзелак члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі сустрэліся з начальнікам дэпартамента камерцыі правінцыі Хунань Пэн Янь Фэнам. Па яго словах, правінцыя зацікаўлена ў пашырэнні супрацоўніцтва з Беларуссю.**

Хунань актыўна ўзаемадзейнічае з Магілёўскай вобласцю. У свабоднай эканамічнай зоне «Магілёў» створана сумесная беларуска-кітайская вытворчасць будаўнічай і камунальнай тэхнікі. У гэту кітайскую правінцыю, дарэчы, экспартуецца малочная прадукцыя прадпрыемства «Бабуліна крынка».

«Разам з тым патэнцыял супрацоўніцтва задзейнічаны не ў поўную сілу, — адзначыў Пэн Янь Фэн. — Мы маглі б зрабіць значна больш, у тым ліку па пастаўках харчовай прадукцыі. У нас у правінцыі ведаюць і любяць беларускія малочныя прадукты, пячэнне». У сувязі з гэтым начальнік дэпартамента правінцыі прапанаваў абмеркаваць умовы, неабходныя для экспарту беларускіх тавараў, уключаючы пытанні лагістыкі. Сярод магчымых напрамкаў узаемадзеяння ён таксама назваў мікраэлектроніку, нафтахімію, будаўніцтва і лёгкую прамысловасць.

Акрамя таго, члены Савета Рэспублікі ў складзе парламенцкай дэлегацыі ў Чаншы — адміністрацыйным цэнтры правінцыі — сустрэліся з кіраўніцтвам кампаній Zoomlion і CRCHI (China Railway Construction Heavy Industry). Прэзідэнт Zoomlion Чжан Сінь Чунь абмеркаваў сумесны праект па будаўніцтве завода спецтэхнікі на тэрыторыі Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». У праект плануецца прыцягнуць больш за $30 млн інвестыцый. На заводзе будуць выпускаць будаўнічую, камунальную, сельскагаспадарчую тэхніку.

**Надзея АНІСОВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# УМОВЫ ДЛЯ ПРАДПРЫМАЛЬНЫХ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Савет Рэспублікі ўжо накіраваў Савету Міністраў разгорнутыя прапановы.

— У першую чаргу гэта датычыцца пытанняў інвестыцыйнай дзейнасці. Мы лічым, што яны недастаткова ўрэгуляваныя, — удакладніў Міхаіл Уладзіміравіч. — У нас ёсць прапановы па дзяржаўна-прыватным партнёрстве, паколькі закон дзейнічае, а канкрэтных механізмаў недастаткова для рэалізацыі дзяржаўна-прыватных праектаў. Існуюць пытанні, звязаныя са спрашчэннем падатковых падыходаў. Прычым Падатковы кодэкс мы разглядаем разам з Грамадзянскім, паколькі там рэгулююцца многія ўмовы вядзення гаспадарчай дзейнасці. Члены Савета Рэспублікі прымаюць удзел ва ўсіх працоўных групах, якія створаны.

### Болевыя кропкі

Перад тым, як сканцэнтраваць увагу на задачах, члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, прадстаўнікі міністэрстваў, мясцовай улады, бізнесу наведалі шэраг магілёўскіх прадпрыемстваў, аб'екты Шклоўскага і Горацкага раёнаў.

— Нам было цікава пабываць непасрэдна ў працоўных калектывах, — паведаміў Міхаіл Мясніковіч. — Прычым, пайшлі на «цяжкія» прадпрыемствы, тую ж «Строммашыну», дзе ўзнялі шмат сур'ёзных пытанняў і далі адпаведныя рэкамендацыі. Пытанні інвестыцыйнай дзейнасці разгледзелі на прыкладзе «Магатэкса», які дынамічна развіваецца, рэалізуе ўжо другі інвестпраект. Але становішча спраў з занятасцю ў Магілёве дазваляе зрабіць выснову, што абласному цэнтру неабходна мець сваю праграму індустрыялізацыі. Магілёў заўсёды быў горадам прамысловым, а зараз гэты патэнцыял страчвае сваю прыярытэтнасць.



Ініцыятывы ўлады маюць патрэбу ў інфармацыйнай падтрымцы. (Выстаўка, арганізаваная ў межах выязнога пасяджэння.)

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр ПАПКОЎ** азнаёміўся са станам спраў у Горацкім раёне.

— Улічваючы, што мне доўга давялося працаваць у Магілёўскай вобласці, я вельмі добра ведаю той, былы, Горацкі раён. Але сёння ён мяне расчараваў, — прызнаўся Аляксандр Папкоў карэспандэнту «МС». — У раёне цалкам адсутнічаюць тыя кропкі росту, якія павінны фарміраваць адпаведную эканоміку. Тое, што калісьці працавала на эканоміку, сёння ўжо дае збоі. І той узровень рэнтабельнасці, які мы маем, у прыватнасці, па Горацкім раёне — 5—6 % — недапушчальны. Трэба біць у набат і вельмі сур'ёзна разбірацца. Таму мы прапанавалі стварыць сур'ёзную групу, куды ўвойдуць супрацоўнікі Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі, якія павінны вызначаць нейкую інавацыйную назіву ў развіцці раёна. Група павінна выпрацаваць рашэнні і данесці іх да ўрада і кіраўніка дзяржавы для наступнай рэалізацыі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Мар'яна ШЧОТКІНА:**

— Людзі, занятыя ў эканоміцы, — гэта нашы падаткі, напаўненне бюджэту, фонд сацыяльнай абароны, замацаванне кадраў на тэрыторыі, а значыць і яе развіццё. Дзяржава павінна гнутка рэагаваць на патрэбы грамадства, на змяненне сітуацыі. А дэкрэты і ўказы дапамагаюць рабіць гэта аператыўна. Дэкрэты № 7 і № 8 нацэлены на фарміраванне новай мадэлі эканомікі, аснова якой — інавацыі, інвестыцыі, нетрывіяльнае рашэнне кіраўнікоў. Гэта базавыя своечасовыя дакументы, якія накіраваны на садзейнічанне занятасці, стымуляванне дзелавой актыўнасці і развіццё прадпрымальніцкай ініцыятывы. Амаль 54 % людзей, якія працавалі летась за мяжой, маладыя — ва ўзросце ад 25 да 39 гадоў. Гэта тыя, хто мог бы арганізаваць сваю справу тут. Трэба ствараць такія ўмовы, каб ад нас не з'язджала моладзь, а, наадварот, каб сюды прыязджалі. Ключавое месца ў выкананні Дэкрэтаў № 1 і № 7 адводзіцца мясцовым выканаўчым органам і Саветам дэпутатаў. Саветы дэпутатаў павінны быць ініцыятыўнымі і самастойнымі, актыўна ўзаемадзейнічаць з парламентам і выканаўчай уладай у інтарэсах людзей.

ПРА ВАЖНАЕ

# ГЕНЕРАЛЬНАЯ ПРЫБОРКА

**Пытанні навядзення парадку на зямлі і добраўпарадкавання абмеркавалі на сумесным пасяджэнні прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў і аблвыканкама.**

### Непераможная расліна?

Сярод іншых была агучана і тэма «з барадой» — барацьба з баршчэўнікам. У паўночнай вобласці краіны ён расце на плошчы ў 2,2 тысячы гектараў. І гэта — тры чвэрці ад усіх плошчаў у рэспубліцы.

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ** запатрабаваў больш актыўна ачышчаць зямлю ад інвазійнай расліны і пацікавіўся: няўжо ў выніку штогадовай барацьбы нельга канчаткова вырашыць гэтае пытанне? Ці могуць навукоўцы падказаць спосаб?.. А калі ўжо рабіць нешта сёлета, то трэба ажыццяўляць усё своечасова. У прыватнасці, у ліку іншага набыць загадзя хімікаты і распланаваць: хто канкрэтна і дзе будзе знішчаць расліну.

**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** канстатаваў, што там, дзе сур'ёзна бяруцца за гэту справу, усё атрымліваецца. І прывёў у прыклад добры вопыт, напрацаваны ў Воранаўскім сельсавеце Віцебскага раёна, дзе ў КУПе ёсць усё неабходнае для знішчэння шкоднай расліны. Гэтае прадпрыемства яшчэ і іншым дапамагае ачышчаць зямлю ад баршчэўніку.

**Намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр КОРБУТ** таксама ўступіў у дыскусію, паабяцаўшы падтрымку ўладам Віцебшчыны, — улічваючы маштабы распаўсюджання «зялёнага ворага»...

### Да майскіх...

Пра тое, што ў навядзенні парадку на зямлі не павінна быць «праколаў» нават у дробязях, не раз гаварылі на пасяджэнні. Гучала крытыка з нагоды несанкцыянаваных звалак, якія з'яўляюцца там, дзе не заключаюцца дагаворы на вываз смецця. У прыватнасці, на тэрыторыі гаражных кааператываў і дачных таварыстваў. І такіх фактаў на Віцебшчыне больш за 110... У Прыдзвінні наогул трэба актывізаваць збор і сарціроўку другасных матэрыяльных рэсурсаў. Губернатар запатрабаваў больш цеснай каардынацыі і ў пытанні зносу старых безгаспадарных забудоў. Каб не было «ў сямі нянек дзіця без вока»...

Але, як той казаў, не ўсё так сумна. Чысціню навялі ў лесе — на плошчы ў 600 гектараў, уцягнулі ў гаспадарчы абарот каля 1,2 тысячы га зямлі.

У цэлым «генеральную прыборку» на Віцебшчыне запланавана завяршыць да наступлення майскіх свят.

### Захаваць чысціню азёр

На Віцебшчыне не забываюць, што гэта азёрны край.

Вялікая ўвага будзе ўдзяляцца і таму, каб сцёкавыя воды наносілі мінімальную шкоду. І зроблена ўжо нямала. Напрыклад, за кошт сродкаў Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця пабудаваныя сеткі каналізацыі і новыя ачышчальныя збудаванні ў Верхнядзвінску і Глыбокім. Вядзецца будаўніцтва ачышчальных збудаванняў прадпрыемства «Віцебскі футравы камбінат». Праведзены рамонт і рэканструкцыя 40 аб'ектаў сельскагаспадарчых арганізацый у 14 раёнах вобласці. У ліку іншага запланавана ўзвядзенне ачышчальных збудаванняў у Мёрах і аграгарадку Падсвілле Глыбоцкага раёна, «перакідванне» сцёкавых вод гарадскога пасёлка Копысь на ачышчальныя збудаванні Оршы і іншае.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

КРУГЛЫ СТОЛ

# АДЗНАКА ДЛЯ ДЗЯРЖСЛУЖАЧАГА

**НЕ новае меркаванне, што калі пасаду займае падрыхтаваны чалавек, то праблемы вырашаюцца намнога хутчэй. Спецыялісты з Навукова-даследчага інстытута тэорыі і практыкі дзяржаўнага кіравання Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі правялі даследаванне эфектыўнасці работы дзяржаўных служачых.**

Работа пачалася са студзеня і скончылася ў сакавіку гэтага года. У ёй удзельнічалі Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт і асобныя раёны Мінскай вобласці. Падчас сацыялагічнага апытання служачыя адказвалі, як яны ставяцца да праблемы атэстацыі, ці магчыма сёння адэкватна ацэньваць вынікі работы дзяржаўных чыноўнікаў, куды трэба скіроўваць праграмы прафесійнага развіцця і г. д. Грунтуючыся на адказах, спецыялісты вызначылі, якія практыкі Савета Еўропы ў межах кіравання чалавечымі рэсурсамі можна эфектыўна ўкараніць у Беларусі. Вынікі даследавання падчас круглага стала агучылі **дырэктар НДІ ТПДК Ірына СІДАРЧУК, намеснік дырэктара Алег ЯФРЭМАЎ,** а таксама **эксперт Савета Еўропы Сяргей ТАТАРАЎ.**

— Найбольш перспектыўным для прыстасавання пад беларускія ўмовы можна лічыць пераход да прыёму новых дзяржаўных работнікаў на аснове конкурсу. Канешне, кіраўнік краіны мае права фарміраваць дзяржаўныя службы і прызначаць на пасады, аднак у астатніх выпадках конкурс на месца дапаможа вызначыць найбольш здольнага да пасады кандыдата, — мяркуе Ірына Сідарчук.

Таксама перспектыўнай выглядае ідэя ўкаранення інстытута ацэнкі дзяржаўных служачых — фактычна, замена інстытута атэстацыі. Такім чынам, можна будзе ацэньваць непасрэдна вынік дзейнасці служачага за час, пакуль ён займае пасаду. Для гэтага патрэбны новыя крытэрыі. У іх аснову можна закласці прынцыпы сістэмы СМАРТ, ужо апрабаванай Саветам Еўропы. Мяркуецца, што дзейнасць чыноўнікаў будзе ацэньвацца штогод, і гэта матывуе дзяржаўных служачых на кар'ернае прасоўванне. Ацэнку таксама можна будзе звязваць з пэўнымі рэкамендацыямі па прафесійным індывідуальным развіцці.

— Неабходна сфарміраваць нацыянальную стратэгію адукацыі дзяржаўных служачых. На сёння ў межах дзяр-



жаўнага заказу мы не можам ахапіць усіх прэтэндэнтаў, і таму ў першую чаргу скіраваны на кіраўнікоў і асоб, уключаных у кадравыя рэзервы. Але мы думаем, што развіваць дзяржаўных служачых трэба ў межах усёй Акадэміі кіравання, такім чынам ахапіўшы значны іх пласт — асабліва гэта датычыцца работнікаў на мясцовых узроўнях. Сёння каля 40 тысяч чалавек працуюць у органах кіравання, таму зразумела, што сістэму трэба фарміраваць пад іх, — лічыць Ірына Сідарчук.

> “На думку даследчыкаў НДІ ТПДК, найбольш яркія прыклады «народнага» прызнання — вынікі галасаванняў, а таксама колькасць зваротаў да таго ці іншага чыноўніка.

Паводле яе слоў, выяўленыя «слабыя месцы» — гэта насамрэч кропкі далейшага росту. Так, фармальны падыход да атэстацыі можна паступова замяняць ацэнкай праз увядзенне тэставых комплексаў для правядзення атэстацыі. Не лішнім таксама будзе павысіць інфармаванасць дзяржаўных работнікаў. Калі дзяржаўны служачы адзначае, што ў яго няма матывацыйных стымулаў для прасоўвання ў кар'еры, то неабходна іх арганізаваць (напрыклад, за кошт прэміравання за добрую працу) ці прымяніць неманетарныя спосабы зацікаўлення.

Змены ў падыходзе да адукацыі і ацэнкі дзяржаўных служачых прывядуць да станоўчых зрухаў у аказанні дзяржаўных паслуг, упэўнены даследчыкі. Штогод адзначаецца развіццё метадаў дзяржаўнай работы, аднак застаюцца і праблемы: напрыклад, сфера разгляду зваротаў грамадзян па жыллёва-камунальных і па пытаннях, звязаных з аховай здароўя і г. д.

Прафесійнае развіццё дзяржаўных служачых і выкарыстанне правільна падабранага інструментарыю ацэнкі і матывацыі дазволяць атрымаць больш якасны кадравы склад. Спецыялісты змогуць больш эфектыўна вырашаць задачы і выконваць працоўныя абавязкі больш адказна і дабраякасна.

— Вядома, да любога дзяржаўнага работніка ёсць кваліфікацыйныя патрабаванні, аднак яны не гарантуюць высокую якасць паслуг. Таму неабходна перыядычна цікавіцца вынікамі і асноўнымі паказчыкамі эфектыўнай дзейнасці. Любы дзяржаўны служачы з аднаго боку аказвае дзяржаўную паслугу, з другога — разглядае звароты грамадзян, а гэта значыць, у любым выпадку павінен працаваць на вынік. Усе даследаванні такім чынам робяцца не проста для ўвядзення нейкіх навацый, а для таго, каб прыцягнуць у дзяржаўны апарат прафесіяналаў, здольных працаваць на перспектыву і пераймаць станоўчы вопыт, — разважае Ірына Сідарчук. — Я разумею, што ў ацэнцы ад кіраўніка ці калектыву можа прысутнічаць суб'ектыўны фактар. Менавіта таму трэба распрацаваць аб'ектыўныя крытэрыі. Так ацэншчык фактычна будзе запаўняць табліцу, сістэматызуючы паказчыкі.

Акрамя ацэнкі калектыву, важна ўлічваць і стаўленне да дзяржаўнага служачага грамадзян. На думку даследчыкаў НДІ ТПДК, найбольш яркія прыклады «народнага» прызнання — вынікі галасаванняў, а таксама колькасць зваротаў да таго ці іншага чыноўніка. У апошнім выпадку можна меркаваць, што колькасць зваротаў паказвае ступень даверу насельніцтва.

У далейшым вынікі працы могуць быць перададзены ў якасці прапаноў на адрас рабочай групы, створанай пры Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны для рэалізацыі ў праекце закона аб дзяржслужбе. Аднак гэта не азначае, што даследаванне будзе спынена. Удзельнікі круглага стала кажуць, што зроблены толькі першы сур'ёзны крок, аднак наперадзе яшчэ застаецца вялікая частка работы.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**

СІТУАЦЫЯ

# «ПРОСІМ НАВЕСЦІ ПАРАДАК!»

## Чаму ў мікраараёне Цыганы дрэнныя дарогі

**МІКРАРАЁН Цыганы ў горадзе Крупкі пачаў забудоўвацца каля сарака гадоў таму. Паступова разрастаўся, і цяпер тут жыве 600—700 чалавек. Ёсць магазіны, ёсць неабходная інфраструктура. Адна праблема — дарогі. Куды толькі не звярталіся людзі: у райвыканкам, у абласныя і рэспубліканскія структуры. Але на ўсе звароты, як сцвярджаюць, атрымлівалі адпіскі. «Вось і цягаемся, як тыя цыганы, па ўсіх інстанцыях, — нявесела жартуюць яны.**

— Напачатку хацелі, каб зрабілі цвёрдае пакрыццё. А цяпер згодныя на гравійна-пясчаную падсыпку. Грэйдар, які пускаюць зрэдку, праблему не вырашае. Слой зямлі з гадамі вымыўся, застаўся цвёрды грунт. Дождж прайшоў — лужыны, выбоіны, — скардзяцца жыхары, якія, пачуўшы, што да іх прыехаў карэспандэнт, выйшлі на вуліцу. — Дваццаць першае стагоддзе на двары, развіваюцца новыя тэхналогіі, а мы захраслі недзе на мяжы 80-х. У раёне 214 населеных пунктаў, ды ні ў адным няма такіх дарог, як у нас.

— Мы просім навесці парадак хаця б на асноўных участках: вуліцах Партызанскай, Зарэчнай, Кастрычніцкай і ў завулку Юбілейны. Машыны па калдобінах ледзьве паўзуць, буксуюць. Шкада і дзяцей, якія ходзяць у школу па такой дарозе. Мая старэйшая дачка сямнаццаць гадоў «мясіла» гэтае балота. А цяпер і малодшая. Нічога не мяняецца, — кажа Наталля Салко. — Бездарожжа круглы год. Па вуліцы Зарэчнай наогул ні прайсці ні праехаць. Таму просім аднаго — падсыпаць вуліцы гравійна-пясчанай сумессю. У адказ чуем: няма грошай. Хоць дакладна ведаю, што на гэтую справу ў мінулым годзе выдзяляліся сродкі. Ды іх не змаглі асвоіць, таму аддалі ў іншыя раёны.

Вялікія надзеі на паляпшэнне сітуацыі жыхары мікраараёна ўскладваюць на новага старшыню райвыканкама Анатоля Козела. Ён у свой час працаваў у раёне і не па чутках ведае мясцовыя праблемы, сцвярджаюць яны.

— У сваю чаргу мы гатовы выйсці на суботнік, дапамагчы дарожнікам ва ўладкаванні вуліц, таму што любім свой горад. І хочам, каб ён прыгажэў, квітнеў з кожным годам, каб былі роўнымі і камфортнымі дарогі. Мы робім усё неабходнае, каб утрымліваць свае падворкі і прылеглую тэрыторыю ў чысціні, — кажуць гаспадары.

Сапраўды, пра гэта сведчаць акуратныя пафарбаваныя агароджы, дамы, прыгожыя сядзібы. Напрыклад, Наталля Салко са сваім суседам пасадзілі за прысядзібным участкам парк — сорак маладых дрэўцаў, якія купілі за свае грошы. Наталля Герасімаўна жыве тут з 2012 года. Па прафесіі — вядучы інжынер па тэхніцы бяспекі руху. Але, нягледзячы на тэхнічную адукацыю, яна ў душы рамантык, нават піша вершы.

— Прыязджайце да нас крыху пазней, паглядзіце, як тут будзе прыгожа, калі ў палісадніках расцвітуць кветкі! — запрашаюць людзі.

— А калі ж ім чакаць вырашэння пытання з дарогай? — запыталася ў дырэктара КУП «Жылцеплабуд» Дзмітрыя Ліпскага.

— Пакуль не будзе ўладкаваны водаправод, асфальт класці немэтазгодна. Прыйдзецца затым усё перакопваць нанова, што пацягне за сабой дадатковыя расходы. На гэты год на водаправод выдзелена 70 тыс. рублёў. Абяцала дапамагчы з фінансаваннем вобласць. Пры такім раскладзе, магчыма, сёлета або ў наступным годзе закончым пракладку. А пасля прыступім да асфальтавання вуліц. Праектам прадугледжаны таксама тратуарныя дарожкі, разметкі, дарожныя знакі, — канстатуе Дзмітрый Ліпскі.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Але такі адказ не задавальняе мясцовых жыхароў. Яны лічаць, што праблема з пракладкай водаправода надуманая. У першую чаргу іх хвалюе стан дарог: для падсыпкі іх шмат сродкаў не трэба.

Дадам, што дэлегацыя з мікраараёна Цыганы пабывала на асабістым прыёме ў памочніка Прэзідэнта — інспектара па Мінскай вобласці Ігара Яўсеева. Людзі расказалі не толькі аб застарэлай праблеме, але і аб тым, які выхад з сітуацыі бачаць, і прапанавалі свае шляхі рашэння набалелага. Ігар Яўсееў даў даручэнне адпаведным службам пачаць добраўпарадкаванне вуліц як толькі сыдзе снег і падсохне, каб людзі бачылі, што працэс пайшоў. Вызначаны тэрмін — сярэдзіна мая. Ён заклікаў мясцовыя ўлады звярнуць асаблівую ўвагу на гэты мікраараён.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

МЕРКАВАННІ

# Галоўнае — не перагнуць...

**Пакінутыя дзеці... З сацыяльных ролікаў, білбордаў сумна глядзяць іх вочы. Вочы, поўныя адзіноты і смутку. Як суцешыць малое, якое засталося сіратой пры жывых бацьках? Як растлумачыць маленькаму чалавеку, што ў барацьбе са сваімі шкоднымі звычкамі маці і тата апусцілі рукі? Мы запыталі ў нашых чытачоў, як прымусіць бацькоў дагледзець сваіх дзяцей?**

**Кацярына СТАРАВОЙТАВА, старшыня Першамайскай раённай арганізацыі (г. Мінск) Беларускай асацыяцыі шматдзетных бацькоў:**

— Калі бацькі не даглядаюць дзяцей, на іх практычна немагчыма паўплываць. У прававым плане многіх стрымлівае Дэкрэт № 18, які прадугледжвае плату за забеспячэнне дзяцей, якія знаходзяцца ў прытулках. Добра, што першапачаткова дзяцей адбіраюць на паўгода і ў бацькоў яшчэ ёсць магчымасць забраць іх дадому. Яны могуць адумацца за гэты перыяд — хтосьці пужаецца, пачынае паводзіць сябе прыстойна. Маніторынг за праблемнымі сем'ямі ажыццяўляюць і школы. Галоўнае — пры кантролі не перагінаць палку.

Як грамадскае аб'яднанне, мы на несвядомых бацькоў можам паўплываць толькі нейкай прафілактычнай размовай. На шчасце, у нашай раённай арганізацыі няма праблемных шматдзетных сем'яў.

**Віктар МАЛУХА, старшыня Голацкага сельскага Савета дэпутатаў Пухавіцкага раёна:**

— Да нашага сельсавета адносяцца 15 населеных пунктаў, на ўліку стаяць сем праблемных сем'яў. За імі сочаць прадстаўнікі школ і дзіцячых садкоў. Калі заўважаем праблемы з дзецьмі, першапачаткова школа ставіць сям'ю на ўлік. У выпадку, калі сітуацыя не мяняецца, прымаюцца больш кардынальныя меры — адбіранне дзяцей. Сем'і, якія на ўліку, кожны тыдзень наведваюць супрацоўнікі школы, штомесячна — сельскі выканаўчы камітэт. Пры неабходнасці робім гэта і часцей. Таксама разглядаем нядбайных бацькоў на савеце грамадскага пункта, калі яны, напрыклад, прапускаюць працу, здзяйсняюць правапарушэнні. Доўга ў нашым сельсавеце не было выпадкаў адбірання дзяцей. За апошні час гэта здарылася ў дзвюх сем'ях. У першай сітуацыі маці не імкнецца забраць дзяцей. У другім выпадку апеку над дзецьмі афарміла бабуля. Мы часам наведваем гэтую сям'ю.

**Алена ГЕРАСІМЕНКА, намеснік старшыні камісіі па справах непаўналетніх Мінгарвыканкама:**

— Трэба навучаць выхаванню дзяцей. Вельмі часта бацькі проста не ведаюць, як гэта рабіць. Пажадана, каб у ВНУ на ўсіх спецыяльнасцях былі прадметы «псіхалогія» і «педагогіка».

Абавязкі, якія ўстанавіў для бацькоў Дэкрэт № 18, стымулююць да таго, што больш за палову дзяцей вяртаецца ў біялагічныя сем'і. Толькі ў адзінкавых выпадках ёсць паўторныя адбіранні. Менавіта меры па адбіранню на паўгода даюць пэўны штуршок для бацькоў. Нешта змяняецца ў свядомасці дарослага чалавека, калі ён разумее, што можа пазбавіцца свайго дзіцяці.

У нас вельмі пільныя грамадзяне: часам сігналы пра праблемы з дзецьмі паступаюць ад суседзяў. Усе выпадкі правярае спецыяльная камісія. Некаторыя грамадзяне перабольшваюць факт, што правяраючыя могуць залезці нават у халадзільнік. Спецыялісты, якія прыходзяць у праблемныя сем'і, атрымліваюць агульнае ўражанне ад абстаноўкі. І калі ўмовы жыцця выходзяць за рамкі паняцця «дабрабыт», тады трэба правераць усё, у тым ліку і халадзільнік.

**Алена КАВАЛЁВА, шматдзетная маці, г. Мінск:**

— Жыццёвы вопыт паказвае, што прымусіць быць добрымі бацькамі немагчыма. Ёсць сумная гісторыя маёй сяброўкі, якая ўзяла дзяўчынку з дзіцячага дома. Яе маці праз пэўны час трапіла ў турму. Адтуль пісала лісты, калі выйшла, тэлефанавала дачцэ, абяцала наведаць. У выніку толькі разварэдзіла душу дзіцяці і знікла...

На мой погляд, ёсць розныя ступені несвядомасці бацькоў. Магчыма, прававыя праграмы пэўным чынам стрымліваюць іх. Галоўнае, каб не было перагібаў у ювенальнай сістэме.

У сферы работы з праблемнымі сем'ямі вельмі важныя кваліфікаваныя кадры, а самі стасункі з такімі сем'ямі павінны быць тонкімі, прафесійнымі, тактычнымі, каб можна было паўздзейнічаць на бацькоў, якія яшчэ здольныя прыслухоўвацца. А калі дарослыя ўжо не жадаюць нічога змяняць, адзіны выхад — ратаваць іх дзяцей.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ДОБРА ТАМ, ДЗЕ ЦЯБЕ ЛЮБЯЦЬ

## Кожная сітуацыя патрабуе расследавання

На пачатак года ў краіне налічвалася 20,8 тысячы дзяцей-сірот і малых, што засталіся без апекі бацькоў. У Міністэрстве адукацыі адзначаюць, што з прыняццем Дэкрэта № 18 назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя да скарачэння колькасці такіх дзяцей. Так, за апошнія пяць гадоў іх стала менш на 10 працэнтаў.

Прафілактычная работа па папярэджванні сацыяльнага сіроцтва праводзіцца амаль з 15 тысячамі сем'яў, дзе выхоўваецца 25 тысяч дзяцей. У ёй удзельнічаюць навучальныя ўстановы, міліцыя, медыкі. Прафілактыка заключаецца ў тым, каб як мага раней звярнуць увагу на праблемную сям'ю. На гэтым этапе малых не разлучаюць з бацькамі, але прызнаюць, што яны знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. І задача спецыялістаў — дапамагчы палепшыць абстаноўку ў сям'і. Бо на сёння 80 працэнтаў «сірот» — гэта дзеці пры жывых бацьках.

Якія фактары выклікаюць хваляванне?

— Кожная сітуацыя індывідуальная і патрабуе сацыяльнага расследавання, — каментуе **Алена ГАЛАЎНЁВА, намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі.** — Увагі патрабуюць сем'і, дзе бацькі злоўжываюць спіртнымі напоямі, не працуюць, не ажыццяўляюць належны догляд малых. Нават па выглядзе дзіцяці можна сказаць, ці добра яно харчуецца, ці клапоцяцца пра яго адзенне і абутак. Бывае, школьнік спіць на ўроках, бо дома гэта зрабіць немагчыма з-за пастаянных скандалаў. Правяраюцца санітарна-гігіенічныя ўмовы жылога памяшкання. Калі там, напрыклад, няспраўная электраправодка, разеткі вырваны, адключана электраэнергія ці водазабеспячэнне з прычыны няплаты за камунальныя паслугі, казаць пра тое, што дзіця знаходзіцца ў бяспецы, не прыходзіцца.

Спачатку сем'і наведваюць класныя кіраўнікі. Калі сітуацыя выклікае асцярогу — тады выходзіць камісія. Па словах Алены Галаўнёвай, дзіця адбіраюць у крайніх выпадках:

— Рашэнне прымаецца калегіяльна на пасяджэнні камісіі, дзе прысутнічаюць і самі бацькі. Пасля на працягу шасці месяцаў праводзіцца работа па рэабілітацыі сям'і. Складаецца план па абароне правоў дзіцяці, а потым аналізуецца, як ён быў выкананы. Прынамсі, ці ліквідаваны прычыны і ўмовы, што пры-



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

вялі да адабрання малых. У сярэднім штогод 50 працэнтаў з ліку адабраных дзяцей вяртаюцца праз шэсць месяцаў у сям'ю па рашэнні камісій. Там, дзе гэтага не ўдалося зрабіць, у суд перадаецца справа аб пазбаўленні таты і мамы бацькоўскіх правоў.

Каб гэтага не дапусціць, сям'я павінна ісці на кантакт са спецыялістамі. Ва ўстановах адукацыі праводзяць індывідуальныя гутаркі, запрашаюць татаў і мам да ўдзелу ў школьных мерапрыемствах. Добра, калі бацькі працаўладкоўваюцца, а тыя, хто п'е, добраахвотна праходзяць курс лячэння ад алкагольнай залежнасці.

— Пастаноўка сям'і на ўлік як сацыяльна небяспечнай — гэта не пакаранне, як многія думаюць, а дапамога, якую гатовы аказаць сям'і, — тлумачаць у ведамстве. — І толькі калі яна не прымаецца, устае пытанне аб больш жорсткай меры.

Што чакае дзяцей у такім выпадку? Найбольш аптымальнай лічыцца сямейная форма ўладкавання. Таму 80 працэнтаў сірот і малых, што засталіся без апекі бацькоў, перадаюць у прыёмныя і апякунскія сем'і, дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Ёсць такая форма ўладкавання, як дзіцячая вёска (гарадок) — там непаўналетнія жывуць у выхаваўчых групах. На сёння ў краіне шэсць такіх устаноў.

Астатнія 20 працэнтаў трапляюць у дзіцячыя інтэрнатныя ўстановы, у тым ліку ў сацыяльна-педагагічныя прытулкі.

Якія спосабы работы з праблемнымі сем'ямі найбольш эфектыўныя? У Міністэрстве адзначаюць індывідуальныя гутаркі.

— Плённа, калі ўсе спецыялісты працуюць у адной звязцы. Бо калі кожны прадстаўляе сям'і свае патрабаванні, не ўзгодненыя з іншымі, то бацькі тады ў разгубленасці, — кажа **галоўны спецыяліст названага ўпраўлення Алена СІМАКОВА.**

## Тысячы пратаколаў і адзнакі ў пашпартах

Бацькі, чые дзеці знаходзяцца пад апекай дзяржавы, павінны аплачваць іх утрыманне (выключэнне — недзеяздольныя і тыя, хто не можа выконваць бацькоўскія абавязкі па стане здароўя). Цяпер на ўліку органаў унутраных спраў стаіць 11,5 тысячы абавязаных асоб. Да 70 працэнтаў ад іх заробку спаганяецца на карысць дзяцей. Наколькі добрасумленна абавязаныя асобы ходзяць на работу, кантралююць наймальнікі сумесна з міліцыяй.

— Праблема нежадання гэтай катэгорыі працаваць застаецца актуальнай. Ёсць такія, хто ўхіляецца ад адказнасці. Па выніках 2017 года з гэтай прычыны было складзена 19,5 тысячы адміністрацыйных пратаколаў, — канстатуе **намеснік начальніка аддзела арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх упраўлення прафілактыкі ГУАПП МГБ МУС Сяргей ЯНКОЎСКІ.**

Летась з дапамогай службы занятасці на пастаянную работу было ўладкавана 3,7 тысячы абавязаных асоб: у Брэсцкай вобласці — 546 чалавек, Віцебскай — 507, Гомельскай — 599, Гродзенскай — 518, Мінскай — 639, Магілёўскай — 512, Мінску — 404.

На гэты год пералік арганізацый для ўладкавання ўключае амаль сем тысяч суб'ектаў гаспадарання, устаноўлена бронь для прыёму на работу 9,4 тысячы бацькоў, якім неабходна плаціць за ўтрыманне дзяцей. За студзень-люты працай забяспечылі 685 абавязаных асоб.

У пашпарце такіх бацькоў ставіцца спецыяльная адзнака. Справа ў тым, што на абавязаных асоб накладаюцца пэўныя абмежаванні ў частцы здзяйснення маёмасных здзелак. Ім забараняецца адчужаць нерухомую маёмасць, якая ім належыць і падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі, і транспартныя сродкі. Адзнака ў пашпарце дазваляе спецыялістам, што рэгіструюць такія здзелкі, не дапусціць памылкі.

На думку Сяргея Янкоўскага, станоўчы эфект ад мер, прадугледжаных дэкрэтам, ёсць. Часам нядбайных бацькоў дастаткова пакрытыкаваць на пасяджэнні камісіі па справах непаўналетніх і яны выпраўляюцца, бо разумеюць, чым пагражае іх бездказнасць. «Многіх страшыць разлука з дзіцем. Усё ж такі, каб знік бацькоўскі інстынкт, павінна адбыцца пэўная дэградацыя асобы», — лічыць прадстаўнік МУС.

Ён дадае, што дэкрэт накіраваны на згуртаванне сям'і. «Але мы не можам пакінуць дзіця ў дрэнных бацькоў — мы павінны пакінуць яго ў добрых».

Якую ж сям'ю лічыць добрай? Тую, дзе кожны вечар на стале пірагі і катлеты? Забяспечаную? Дзе школьнікі добра вучацца?

— Тую, дзе дзеці ведаюць, што бацькі іх любяць, — адказвае Алена Галаўнёва. — Галоўнае, каб яны бачылі ў маці і бацьку апору, абарону.

— Няма пэўнага шаблону, які можна накласці на сям'ю і сказаць, што калі яна ўпісваецца ў гэтыя рамкі, то добрая, — разважае Алена Сімакова. — Матэрыяльная забяспечанасць сама па сабе не з'яўляецца паказчыкам дабрабыту. Нярэдка бывае, што дзеці ў вонкава ўзорных сем'ях здзяйсняюць проціпраўныя ўчынкі: гэта іх рэакцыя на тое, што нешта не так. Напрыклад, не хапае ўвагі, клопату. Гэта не значыць, што бацькам трэба патураць капрызам. Але варта даваць сынам і дочкам падтрымку, спрабаваць разумець іх.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

### ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

**❍ Летась судамі было разгледжана 2880 спраў аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў. З іх з задавальненнем іскавых патрабаванняў — 2619. Такое рашэнне было прынята ў дачыненні да 728 мам (з якіх 502 — адзінокія) і 1443 татаў. Яшчэ ў 448 выпадках вердыкт быў вынесены ў дачыненні да абаіх бацькоў.**

**❍ Большасць спраў (75 %) аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў датычыліся аднаго дзіцяці. Яшчэ 17 % — дваіх дзяцей, 5 % — траіх, 1 % — чацвярых. У 19 справах фігуравала па пяць і больш малых.**

**❍ Усяго летась былі пазбаўлены бацькоўскіх правоў 3072 чалавекі (у 2016-м — на 58 менш). Мужчын у паўтара раза больш за жанчын: 62 і 38 працэнтаў адпаведна.**

**❍ Амаль палове тых, каго пазбавілі права выхоўваць дзяцей, ад 31 да 40 гадоў. Ва ўзросце да 20 гадоў быў адзін працэнт татаў і мам, ад 21 да 25 — 6 %, ад 26 да 30 — 18 %, ад 41 і старэйшыя — 24 %.**

**❍ Без апекі бацькоў летась засталося 3531 дзіця (у 2016-м гэта лічба склала 3448). Ва ўзросце да года было 287 малых, ад двух да трох — 486, ад чатырох да шасці — 641, ад сямі да дзесяці — 851. Падлеткаў 11—17 гадоў — 1266 чалавек.**

**❍ Акрамя гэтага, у мінулым годзе суды разгледзелі 272 справы аб аднаўленні ў бацькоўскіх правах. У 161 з іх іск задаволілі. У выніку 169 татаў і мам змаглі вярнуць дзяцей у сям'ю.**

# ВЕЧНЫ РУХАВІК ІНФАРМАЦЫІ

**Апошнім часам тэлеканал АНТ падкідвае мноства нагод для абмеркавання: новая тэлестудыя, новыя свежыя твары, новыя праграмы... Чым выклікана такая актыўнасць і якія перспектывы неўзабаве стануць рэальнасцю, «Звязда» распытала кіраўніка дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання Руслана ПАДДУБСКАГА.**



***— Руслан Віктаравіч, колькасць навінак у эфіры прыемна ўражвае. Гэта чароўны імпульс ад новага кіраўніцтва альбо журналісты, што называецца, самі даспелі?***

— І тое, і другое — мы ж не можам дзейнічаць у адрыве адзін ад аднаго. З прыходам новага кіраўніка на АНТ адбыліся насамрэч каласальныя перамены — Марат Сяргеевіч Маркаў чалавек амбіцыйны. І задачы перад падначаленымі ён ставіць таксама амбіцыйныя і глабальныя, прычым усё сказанае ажыццяўляецца. Так, з прызначэннем на пасаду ён абазначыў прыярытэт у развіцці канала: умацаванне інфармацыйна-аналітычнага вяшчання. Уласна, год (28 сакавіка споўніўся якраз такі тэрмін з прыходу Марата Сяргеевіча на АНТ) менавіта на гэта мы і працавалі, і большая частка пастаўленых задач ужо рэалізаваная.

...Перад тым як выдаць якасныя праекты, неабходна выйсці на адпаведны тэхнічны ўзровень. Таму перадусім тэлевізійнікі стварылі самі для сябе «інфармацыйны асяродак»: правялі першы з 2006 года маштабны кастынг вядучых, пераабсталявалі па найсучасных стандартах інфармацыйную студыю, перафарматавалі «Нашы навіны», а потым перайшлі да запуску шэрагу новых праектаў.

— Мы не прывязваліся да традыцыйнага восеньскага пачатку тэлесезона, бо дамовіліся са старшынёй, што класічных сезонаў у нас больш не будзе — выдаваць новы прадукт трэба пастаянна, пакуль ёсць ідэі і жаданне яго рабіць.

Першым з іх у сезоне 2017/2018 стартавала **«Наша жыццё»** — інфармацыйна-аналітычнае ток-шоу з вопытным у гэтым жанры Дзмітрыем Бачковым, які перайшоў працаваць на АНТ з «Беларусь 1». У снежні 2017-га замест сціслых выпускаў спартыўных навін пачаліся пасяджэнні **«Спартклуба»** — інфармацыйна-аналітычнай праграмы, якая падводзіць вынікі мінулага тыдня і расстаўляе акцэнты на бягучы. «У праграме насамрэч ёсць што паглядзець і паслухаць, і ў саміх спартсменаў, трэнераў, функцыянераў яна выклікала цікавасць, таму, спадзяюся, аўдыторыя ацэніць, прызвычаіцца і падцягнецца», — зазначае Руслан Паддубскі.

Нядаўна ў спартыўных навінах таксама з'явілася новая вядучая — Любоў Леановіч, якая раней працавала рэдактарам на АНТ. І гэта, падкрэсліваюць тэлевізійнікі, толькі пачатак — падбор свежых кадраў працягваецца.

На мінулым тыдні адбылася прэм'ера новага штотыднёвага праекта **«Рэпарцёр»**, заснаванага на жанры спецыяльнага рэпартажу. За 13 хвілін найлепшыя рэпарцёры АНТ — а на рахунку канала пяць «Тэлевяршыняў» у адпаведнай намінацыі, — проста і даходліва паказваюць актуальныя і вострыя праблемы грамадства.

— На АНТ заўжды была моцная рэпарцёрская школа, але ў гэтым выпадку праект — камандная работа рэпарцёраў, рэжысёраў, прадзюсараў, рэдактараў, якія дапамагаюць адшукаць сюжэты і зрабіць іх больш выразнымі. Мы з самага пачатку ведалі, што хочам зрабіць: праз гісторыі і перажыванні розных людзей паглыбіцца ў звычайнае жыццё, паказаць яго без прыкрас і маралізатарства, проста як ёсць. Каб глядач сам зразумеў, у чым карані праблемы, адчуў пэўныя эмоцыі і зрабіў свае, не навязаныя звонку, высновы. Глабальна мы хочам, каб пасля кожнага выпуску чалавеку было над чым падумаць, і галоўнае — каб было абуджэнне да дзеяння. Спадзяюся, нават пасля першага рэпартажу пра п'яных кіроўцаў многія задумаюцца, што за кілішкам спіртнога — зламаныя лёсы многіх людзей...

***— Балючых тэм у нашым грамадстве шмат. Як адбіраеце тыя, што «выстраляць» у «Рэпарцёры»?***

— Канешне, для старту хочацца чагосьці гучнага, запамінальнага. Самы просты спосаб — узяць «чорны» кірунак, але ад гэтага мы свядома адмовіліся. Спрабуем вытрымліваць баланс паміж тэмамі праблемнымі, актуальнымі тут і цяпер і менш вострымі, але ад таго не менш цікавымі. Нашы рэпарцёры плануюць уздымаць і тыя пытанні, якія ўжо не раз гучалі, — але шукаць новыя ракурсы, «лавіць нерв» кожнай тэмы незалежна ад яе грамадскай вастрыні. Так, наперадзе будзе выпуск, прысвечаны анкалогіі — важная тэма практычна для кожнага з нас, калі ведаць, што большасць хворых звяртаюцца да медыкаў запозна; закранём наноў актуальную тэму фінансавых пірамід на прыкладзе маладога беларуса, ужо затрыманага праваахоўнікамі, які дзейнічаў з маштабамі Маўродзі і падмануў дзясяткі суайчыннікаў; раскажам пра лічбавізацыю эканомікі, тэму майнінга, у якой знайшлі ўнікальных герояў — адзінаццацікласніка, які збудаваў на балконе майнінгавую ферму, энтузіястаў, якія здабываюць віртуальную валюту на вёсцы, і г. д. Будзе рэпартаж пра «маленькіх людзей» — ліліпутаў, які дазволіць у прамым і пераносным сэнсе зірнуць на паўсядзённасць пад іншым вуглом. У кожным выпуску захаваецца ўмоўны падзел на два бакі: пацярпелыя і тыя, хто так ці інакш вінаваты ў іхніх праблемах, і ў кожным абавязкова будуць жывыя чалавечыя эмоцыі. Прынамсі пачынаць будзем з гэтага, каб людзі паверылі, глядзелі нас і, магчыма, нават прапаноўвалі свае тэмы.

***— Яшчэ адна навінка — праграма «Метэагід». Прагноз надвор'я заўжды актуальны, але канкураваць у гэтай сферы з іншымі каналамі даволі цяжка. Чым паспрабуеце ўразіць гледачоў?***

— 10-хвілінны **«Метэагід»** з Дзмітрыем Рабавым і Крысцінай Вінярскай выходзіць па суботах — прэм'ера адбылася ўжо на мінулым тыдні. Мы бачым па даследаваннях аўдыторыі, што праграмы пра надвор'е маюць каласальныя рэйтынгі, але прапанаваць штосьці новае на гэтым полі насамрэч складана. Так што вырашылі не вынаходзіць веласіпед, а зрабіць праграму пра надвор'е ў шырокім сэнсе слова: аналіз надвор'я за мінулы тыдзень і максімальна дакладны прагноз на наступны, агляд метэаралагічных катаклізмаў у свеце і падборка цікавых фактаў «вакол надвор'я». Тандэм каларытных персанажаў, дзед Дзям'ян і баба Маня, якіх вы бачылі ў першым выпуску, — пастаянныя вядучыя адмысловай беларускамоўнай рубрыкі «Надвор'е з народа». Мяркую, людзі іх палюбяць з першага кадра, як палюбілі мы, калі ўбачылі іх працу ў якасці аніматараў. Яны настолькі харызматычныя і яркія, што нават перажываем, як бы не перацягнулі ўсе акцэнты на сябе. І, безумоўна, пастаянна будзе інтэрактыў з гледачамі — конкурсы, рубрыка «Стоп-кадр», у якой усе ахвотныя змогуць паўдзельнічаць і атрымаць фірменныя прызы.

***— У апошні дзень сакавіка АНТ прадставіць у новым фармаце і «ўпакоўцы» суботнія навіны...***

— Так, праграма працягласцю прыкладна ў 40 хвілін будзе называцца **«Нашы навіны. Суботні выпуск»**. Канцэптуальна яна істотна адрозніваецца ад навін, бо субота — час адпачынку, інфатэйнменту, які прадугледжвае спалучэнне інфармацыі і забаўляльнага жанру. Мы ўлічылі вопыт расійскіх тэлеканалаў, кожны з якіх пэўным чынам вырашыў гэту задачу, і зрабілі на свой лад. У аснову праграмы пакладзена інфармацыя, але ў больш лёгкай падачы — штосьці сярэдняе паміж «Нашымі навінамі» і «Контурамі». Будуць спецыяльныя госці, экскурсіі ў беларускі сегмент інтэрнэту (знаёмства з героямі сацсетак і YouTube). Абавязкова паедзем у раёны — іх у нас 118, і ў кожным з дапамогай квадракоптараў, стэдзікамаў, іншай сучаснай тэхнікі мы пастараемся паказаць нешта значнае і прыгожае, каб нават жыхары глыбінкі адкрылі яе наноў. Старт дасць Капыльскі раён — паглядзім, які задзел і выклік астатнім атрымаецца. У праграме будзе новая вядучая, якая раней не з'яўлялася на АНТ, і хоць яе добра ведаюць у медыйным асяродку, але ў новым вобразе і з новым прозвішчам, я ўпэўнены, не адразу пазнаюць.

...Яшчэ адзін тэлепраект, які гледачы ўбачаць гэтай вясной, — **аўтарская праграма кіраўніка АНТ Марата Маркава** ў жанры вялікага інтэрв'ю. «Падобных салідных эксклюзіўных інтэрв'ю на беларускім тэлебачанні няшмат, да таго ж мы ставім перад сабой мэту быць у чымсьці наватарамі — таму па афармленні, падачы праграма не будзе паўтараць ужо існуючыя», — падкрэслівае Руслан Паддубскі.

**«Мы з самага пачатку ведалі, што хочам зрабіць: праз гісторыі і перажыванні розных людзей паглыбіцца ў звычайнае жыццё, паказаць яго без прыкрас і маралізатарства, проста як ёсць».**

— Акрамя выпуску новых праграм, мы нарошчваем інфармацыйную прысутнасць у інтэрнэце — развіваем афіцыйны YouTube-канал, які існуе з 2012 года (на сёння ён мае 100 тысяч падпісчыкаў і звыш 100 мільёнаў праглядаў), а перадусім актывізуемся ў сацыяльных сетках. Сучасны трэнд — інтэрнэт-карыстальнікі атрымліваюць інфармацыю найперш з сацсетак: там змяшчаюцца цікавыя спасылкі, актыўна праглядаюцца відэаролікі, там лепш працуюць анонсы і зваротная сувязь з гледачамі. Так што часта людзі, якія сцвярджаюць, што не глядзяць тэлевізар, проста глядзяць яго ў іншым месцы — у сацыяльных сетках, гэта мы бачым па трафіку. Неўзабаве наш аддзел інтэрнэт-вяшчання ператворыцца ў дырэкцыю, і задач у яго стане больш у некалькі разоў — гэта патрабаванне часу, каб годна канкураваць на інфармацыйным полі.

* * *

...Тут можна было б паставіць кропку. Але на АНТ, здаецца, вынайшлі і запусцілі інфармацыйны perpetuum mobile, канца энергіі якога няма, ёсць толькі новыя далягляды. Чарговы з іх адкрыецца ўжо зусім хутка — у выглядзе свайго прадстаўніцтва ў Еўропе. Адкрыццю карпункта АНТ у Бруселі папярэднічалі восем месяцаў ліставання, перагавораў, узгадненняў па лініі МЗС і еўрапейскіх структур, але ў выніку прабіць бюракратычную сцяну ўдалося. Мяркуецца, што напрыканцы красавіка супрацоўнікі карпункта адправяцца на новую працоўную лакацыю. «Мы будзем першай беларускай здымачнай групай, акрэдытаванай па ўсіх правілах, — не без гонару зазначае Руслан Паддубскі. — Спадзяюся, прысутнасць непасрэдна на месцы дазволіць аб'ектыўна перадаваць еўрапейскую палітыку дня, разбураць існуючыя стэрэатыпы пра нашу краіну і шырэй асвятляць розныя аспекты супрацоўніцтва Беларусі з еўрапейскімі краінамі».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**










Фота прадастаўлена тэлеканалам АНТ.

## Серада, 4 красавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.05** «Зона Х» (16+).
**9.10, 22.10 Серыял «След» (16+).**
**10.45, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Сямейны альбом» (12+).**
**13.10** «Дзіцячы доктар».
**13.45** «Дзень у вялікім горадзе».
**14.40, 15.25 Серыял «Клан ювеліраў. Тайны» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** «Актуальнае інтэрв'ю».
**23.45** Сфера інтарэсаў.
**0.45** «Дзень спорту».
**0.55 Серыял «Дзяжурны ўрач» (16+).**

### Беларусь 2

**7.00** «Тэлераніца» (12+).
**9.00, 19.25** «Тэлебарометр».
**9.05, 19.30 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.05, 17.35 Серыял «Ганна-дэтэктыў». Заключныя серыі (16+).**
**12.15** «Арол і рэшка. Юбілейны» (16+).
**13.15** «Паненка-сялянка» (16+).
**14.15** «Бітва салонаў» (16+).
**15.20 Серыял «Каварныя пакаеўкі» (16+).**
**16.15** «Нічога сабе ньюз» (12+).
**16.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.05** «Багіня шопінгу» (16+).
**20.20** «Абмен жонкамі» (16+).
**21.30** «Спортлато 5 з 36», «КЕНО».
**21.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА.1/4 фіналу. Першы матч. «Барселона» (Іспанія) — «Рома» (Італія).
**23.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першы матчы. Агляд гульнявога дня.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня». Бульбяная бабка з грушамі, зёлкавая гарбата.
**8.05, 12.00, 19.55** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15** «Гэты дзень».
**8.25, 18.25 «Вечны кліч». Маст. фільм. (12+).**
**9.45, 17.30** «Апошні дзень». Андрэй Панін (12+).
**10.25** «Белавежская пушча». Асцярожна, зубр! (6+).
**10.35, 16.00 «Небяспечныя гастролі». Маст. фільм (12+).**
**12.50** «Беларусь, як песня». Ансамбль «Верасы».
**13.20** «Славянскі базар — 2006». Ядвіга Паплаўская, Аляксандр Ціхановіч.
**14.05, 21.55** «Выдатныя авіяканструктары». Мікалай Палікарпаў (12+).
**14.40, 21.05 «Каманда 8». Маст. фільм. (16+).**
**15.35** «Дзённікі беларускага падполля». Мінск (12+).
**19.30, 22.35** «Запіскі на палях». Іван Мележ.
**20.10** «Беларуская кухня». Банды.
**20.40** «Калыханка» (0+).

### Беларусь 5

**7.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. 1/4 фіналу. «Севілья» (Іспанія) — «Баварыя» (Германія).
**9.05** Валейбол. Кубак ЕКВ. Жанчыны. Фінал. «Мінчанка» (Беларусь) — «Эджзаджыбашы» (Турцыя).
**11.05** Спорт-кадр.
**11.35** Хакей для ўсіх.
**12.05** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. Фінал. 3-і матч.
**14.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. 1/4 фіналу. «Ювентус» (Італія) — «Рэал» (Іспанія).
**16.10** Козел пра футбол.
**16.30** Слэм-данк.
**17.00** Тэніс. Турнір WTA.
**18.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Фінал. 5-ы матч. «Нёман» (Гродна) — «Юнацтва-Мінск». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**21.10** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэаасопіс.
**21.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. 1/4 фіналу. «Ліверпуль» (Англія) — «Манчэстэр Сіці» (Англія). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**23.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. 1/4 фіналу. «Барселона» (Іспанія) — «Рома» (Італія).

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Наша жыццё».
**10.00** «Жыць здарова!» (12+).
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.20, 13.10, 19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20** «Легенды цырка» (12+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**20.00** «Час».
**21.10** «Рэпарцёр».
**21.25 Серыял «Той, хто чытае думкі (Менталіст)». (16+).**
**23.25 Серыял «Сакратарка» (16+).**
**1.25** «Начныя навіны».

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Мінштычна».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30 «NEXT-2». Серыял (16+).**
**9.15** «Далёкія сваякі» (16+).
**9.40, 23.50** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40, 23.05** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30** «Аўтапанарама» (12+).
**11.50, 17.55 «Гульні ў падкіднога». Серыял (16+).**
**13.50, 20.15 «Бацькі». Серыял (16+).**
**15.20** «Глядзець усім!» (16+).
**15.40** «Ежа багоў» (16+).
**16.50** «Рамонт па-сумленнаму» (16+).
**17.35** «Вадзіць па-руску» (16+).
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**21.40** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**0.35 «Каманда Чэ». Серыял (16+).**

### МІР

**6.00, 16.15, 3.45 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**6.20, 8.05 Серыял «АСА» (16+).**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**9.05, 10.05, 13.15, 19.20 Серыял «Мар'ін гай» (16+).**
**14.00** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**23.00, 0.10 Маст. фільм «Выключэнне з правілаў» (16+).**
**0.00** «Навіны ў поўнач».
**1.15 Маст. фільм «Нявеста майго сябра» (16+).**
**3.15** «Іншы свет» (16+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35, 20.40 Серыял «Адно жыццё на дваіх» (16+).**
**13.25** «Пакой смеху» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека» (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**22.30, 23.10 Серыял «Каменская» (16+).**
**0.15** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** «Сёння».
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ» (12+).
**7.50, 8.10 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**8.50 Серыял «Суженцы» (16+).**
**9.40, 23.05** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных» (16+).
**13.25, 18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**14.00** «Судовы дэтэктыў» (16+).
**15.10, 16.35 Серыял «Прадчуванне» (16+).**
**17.25** «ДНК» (16+).
**19.45 Серыял «Марскія д'яблы. Паўночныя рубяжы» (16+).**
**21.20 Серыял «Жывы» (16+).**
**23.25** «Вынікі дня».
**23.55 Серыял «Бальзакаўскі ўзрост, або Усе мужыкі — сво...» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 16.05, 19.40, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.30, 23.10 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.20 Серыял «Макс» (16+).**
**9.05, 19.45 Серыял «Я пачую цябе» (16+).**
**10.15** «Сад і агарод».
**10.30** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**11.05 Меладрама «Амерыканская дачка» (12+).**
**12.45 Серыял «Каханне цудоўнае» (16+).**
**14.30 Камедыя «Вясёлы Вялікдзень» (16+).**
**16.10** Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
**16.15** «Мультпарад».
**16.30** «Здароўе».
**17.00 Серыял «Анёлы» (16+).**
**18.25 Серыял «Абаронца» (16+).**
**19.10** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05 Камедыя «Бурлеск» (16+).**

### ВТБ

**6.00, 16.15** Серыял «Вароніны». (12+).
**7.20. 4.20** М/ф «Марын і яго сябры». (0+).
**7.50, 4.45** М/ф «Скубі Ду». (0+).
**8.20** М/ф «Маша і Мядзведзь». (0+).
**8.30** «Ералаш». (6+).
**9.20, 20.00** Серыял «Улётны экіпаж». (16+).
**10.25** Камедыя «Аб чым маўчаць дзяўчаты». (12+).
**12.20** Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
**13.00, 2.40** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!» (6+).
**14.00, 1.50** Серыял «Маладзёжка». (12+).
**15.10, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**17.50, 23.00** «Уральскія пельмені». (16+).
**19.00** Серыял «Іванова—Іванова-2». (16+).
**21.10** Камедыя «Карпатаўў». (16+).
**0.00, 3.30** Серыял «Выжыць пасля». (16+).
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Легенды сусветнага кіно». Аляксандр Ханжанкоў.
**7.05** «Пешшу...» Масква прагулачная.
**7.35, 20.05** «Правілы жыцця».
**8.05, 22.40** «Я буду побач». Серыял.
**9.00, 17.30, 2.40** Сусветныя скарбы.
**9.15, 21.30** «Прапаведнікі». Дак. фільм.
**9.40, 19.45** «Галоўная роля».
**10.15, 17.45** «Назіральнік».
**11.10, 0.55** ХХ стагоддзе. «Свята краіны. Канцэрт да 60-годдзя Кастрычніка».
**12.05** «Гульня ў бісер». «Максім Горкі. «На дне»».
**12.50** 85 гадоў мастаку. «Аляксей Шмарынаў рускі мастак». Дак. фільм.
**13.30** Да 95-годдзя тэатра імя Массавета. Анатоль Васільеў, Валянціна Талызіна ў спектаклі «Вяселле Крэчынскага». Частка 1-я.
**15.10, 1.50** Да 145-годдзя з дня нараджэння С. В. Рахманінава. 13 прэлюдый.
**16.00** «Магістр гульні».
**16.30** «Блізкае кола Мікалая Цыскарыдзэ».
**18.45** Да 95-годдзя тэатра імя Массавета. «Астравы». Фаіна Раневская.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** «Ключ да разгадкі старажытных скарбаў». Дак. серыял.
**22.00** «Абсалютны слых».
**0.00** Юбілей Эліны Быстрыцкай. «Лінія жыцця».

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Дыскатэкі 80-х». 2005 год (18+).
**7.05, 8.40, 9.40, 11.00, 13.10, 14.30, 15.40, 17.00, 18.45, 20.30, 21.40, 23.00, 0.35, 2.45, 5.30** Музычная настальгія (12+).
**7.30, 13.30, 19.30** Маст. фільм «Прыгоды Электроніка» (6+).
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Асаблівасці нацыянальнай эліты». 2006 год (12+).
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**0.00** «Рок-н-рол ТБ». Канцэрт Канстанціна Нікольскага. 1992 год (12+).
**1.20** «Вакол смеху». 1981 год (12+).
**3.00** Маст. фільм «Арбацкі матыў» (12+).

### EuroSport 1

**2.30, 5.30, 12.35, 15.30, 22.00** Веласпорт. «Тур Краіны Баскаў».
**4.00, 7.00, 9.30, 20.30, 0.45** Снукер. China Open.
**13.00** Watts.
**14.00** Алімпійскія гульні. «Анатомія спорту».
**14.30** Алімпійскія гульні. «Гонка тэхналогій».
**15.00** Алімпійскія гульні. «Алімпійскі антураж».
**18.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**20.00** «Па той бок чэмпіёнаў».
**23.30** Веласпорт. Еўрапейскі тур.

### Кінакамедыя

**1.15** Даю год. (16+).
**3.05** Чацвёра супраць банка. (16+).
**4.55** Прыдуркі. (16+).
**6.30** Шпіён па суседстве. (12+).
**8.15** Анёлы Чарлі. (12+).
**10.05** Анёлы Чарлі-2: толькі наперад. (12+).
**12.05** Сябар нявесты. (16+).
**14.00** Мастацтва кахаць. (16+).
**15.40** Ажанюся з першай сустрэчнай. (16+).



**17.25** Кухня ў Парыжы. (16+).
**19.30** Настаўнік англійскай. (16+).
**21.05** Неразважлівы. (16+).
**22.55** Міс Пецігру жыве сённяшнім днём. (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.10** «Доктар І...» (16+).
**8.40, 19.00 2.20** «Асколкі». Серыял (16+).
**10.15, 3.55** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**11.50, 18.00** «Сакрэты экстрасэнсаў» (16+).
**12.45, 16.50** «Варажбітка» (12+).
**13.50** «Паралельныя свет» (12+).
**14.50** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.25** «Простыя складанасці» (12+).
**16.00** «Натуральны адбор» (12+).
**20.55** «Тэрмін даўнасці». Серыял (16+).
**21.55** «Звышнатуральны адбор» (16+).
**22.50, 5.30** «Лінія абароны» (16+).
**23.25** «Нябёсы, якія абрынуліся». Серыял (16+).
**0.15** «Нябачны бок». Драма (16+).

### ТБ1000

**6.10, 15.30** Жудасна гучна і занадта блізка (16+).
**8.45** Дывергент (12+).
**11.30** Сезон палявання (12+).
**13.20** Ключ ад усіх дзвярэй (16+).
**18.10** Эвалюцыя (12+).
**20.10** Ілгун, ілгун (12+).
**22.00** Малышка на мільён (16+).
**0.35** Прыгажосць па-англійску (18+).
**2.35** Прыстанак праклятых (16+).
**4.30** Законы прывабнасці (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Спарта (16+).
**8.05** Аднакласніцы (16+).
**9.45** Маршрут пабудаваны (16+).
**11.30** Кароль Лір (6+).
**14.25** Мафія. Гульня на выжыванне (16+).
**16.20, 4.20** Не пакідай мяне. 1-2-я серыі (12+).
**18.20** Гуляй, Вася! (16+).
**20.20** Аднакласніцы. Новы паварот (16+).
**21.50** Сувязь (16+).
**23.30** Мішэнь (18+).
**2.30** Самы лепшы дзень (16+).

### National Geographic

**6.00** Найбуйнейшы ў свеце рамонт. (12+).
**6.50** Суперзбудаванні. (12+).
**7.40, 13.20** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**8.30, 11.40, 16.25, 20.20** Аўта-SOS. (12+).
**10.05, 14.50** Найцяжэйшы ў свеце рамонт. (12+).
**10.55** Золата Юкана. (12+).
**12.30** Вядомы Сусвет. (12+).
**14.05** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).



**15.40, 19.35, 0.20, 2.45** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**18.00, 22.00, 1.10, 4.20** Экстрэмальны экспрэс. (16+).
**18.45, 1.55** Асушыць акіян. (12+).
**22.45** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха. (16+).
**23.30** Крывавыя тайны Еўропы. (16+).
**5.10** Паранармальнае. (16+).

### Discovery

**8.00, 17.05, 22.00, 4.40** Махінатары.
**8.50, 15.15, 21.00, 6.20** Як гэта ўстроена?
**9.45, 16.10, 23.00, 3.50** Паляўнічыя на склады.
**10.40** Паляўнічы на антыкварыят.
**13.25, 19.00, 5.30** Хуткія і гучныя.
**14.20, 0.00** Разбуральнікі легенд.
**18.00** Разбуральнік.
**20.00, 1.00** Залатая ліхаманка.
**2.00** Салдаты ўдачы.
**2.55** Сакрэты падзямелля.
**7.10** Выжыць любой цаной.

## Усходні гараскоп на

**АВЕН.** Панядзелак і серада будуць асабліва ўдалыя для працы, прычым у адзіноце. Інакш вашу ўвагу будуць адцягваць размовамі і спрэчкамі. У аўторак вашы поспехі можа заўважыць начальства, верагодны кар'ерны рост. У пятніцу праявіце ўвагу да сяброў, і вам адкажуць узаемнасцю. Атрымаеце дапамогу ў ажыццяўленні ўласных планаў. У нядзелю пажадана быць убаку ад падзей, у гэты дзень лепш назіраць, а не дзейнічаць.

**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні ёсць рызыка залішняй актыўнасці. Само па сабе гэта не страшна, але мноства планаў, вамі пабудаваных, можа змарыць нават вельмі дзейнага чалавека. Стрымлівайце палёт фантазіі, выбірайце толькі сапраўды важнае. У другой палове тыдня будуць праблемы з пунктуальнасцю, як па вашай уласнай віне, так і з прычын, якія не залежаць ад вас. Гэта трэба ўлічваць, выпраўляючыся на важныя сустрэчы. У зносінах з раднёй неабходна набрацца цярпення і паспрабаваць пазбегнуць канфліктаў.

**БЛІЗНЯТЫ.** Паспрабуйце засяродзіцца на важнай мэце, тады дробныя непрыемнасці не перашкодзяць ажыццяўленню амбіцыйных планаў. Перад напорам вашай энергіі не ўстаяць абмежаванні і перашкоды, якія ўзніклі на шляху. Спрыяльны момант для кар'ернага росту і атрымання прыбытку. Усе афіцыйныя і банкаўскія пытанні вырашаць хутка і на вашу карысць. Партнёры і блізкія людзі будуць мець патрэбу ў вашых ідэях і вашым удзеле. Пастаўцеся з разуменнем да праблем родных.

**РАК.** Пазітыўны погляд на жыццё адкрые перад вамі новыя магчымасці. Пастаўцеся з сур'ёзнасцю да спраў, звязаных з кар'ерай. Менавіта цяпер адкрываюцца цікавыя перспектывы. Магчыма, на гэтым тыдні давядзецца пагутарыць з начальствам, заадно абмяркуйце пытанні, якія вас хвалююць. Верагодныя станоўчыя змены ў фінансавай сферы. Вас можа пацягнуць у далёкую дарогу, будзьце асцярожныя, бо магчымыя непрадбачаныя абставіны. У выхадныя паспрабуйце адпачыць і выспацца.

**ЛЕЎ.** Чым менш намаганняў вы будзеце прыкладаць да якога-небудзь пытання, тым прасцей яно будзе вырашацца. Магчымыя не вельмі прыемныя перамены на рабоце і неразуменне з боку начальства. Але паспрабуйце не выплюхваць раздражненне, якое ўзнікае з гэтай нагоды, на навакольных. Праявіце цярпенне і працавітасць, і ўсё вырашыцца на вашу карысць. У пятніцу рэкамендуецца завяршыць справы, пачатыя раней. У выхадныя змена месцаў і ўражанняў — галоўны складнік поспеху.

**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні найлепшымі лекамі ад жыццёвых расчараванняў будзе поўнае акунанне ў любімую работу. Не спрабуйце шукаць вінаватых, гэта шлях у нікуды. Калі знойдзеце ў сабе сілы і аптымізм, будныя дні пройдуць спакойна і размерана. З вамі будзе прыемна мець стасункі. У адносінах з блізкімі людзьмі старайцеся захоўваць дыстанцыю, не вешайце на іх свае праблемы.

## Субота, 7 красавіка

### Беларусь 1

**6.10** «Існасць».
**6.35** Слова Мітрапаліта Паўла на Благавешчанне Прасвятой Багародзіцы.
**6.45 Меладрама «Пісьмо надзеі» (12+).**
**8.25** «Кулінарная дыпламатыя» (12+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Клуб рэдактараў» (16+).
**9.50** «Здароўе» (12+).
**10.45** «Трансфармацыя» (12+).
**11.20** «Дача» (12+).
**12.10** «50 рэцэптаў першага» (12+).
**12.50, 15.45 Серыял «Сваты-6» (12+).**
**13.50** «Я ведаю».
**15.15** «Краіна».
**17.00 Меладрама «Крылы» (16+).**
**21.00** «Панарама».
**21.45 Меладрама «Домік у сэрцы» (12+).**
**23.30** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**23.50** Святочнае набажэнства на Светлае Хрыстова Уваскрасенне па календары праваслаўнай канфесіі з Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора.

### Беларусь 2

**7.00** М/с «Фіксікі» (0+).
**7.20** Фільм для дзяцей «Чароўнае дрэўца» (12+).
**8.20, 22.00** «Тэлебарометр».
**8.25** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**9.00, 0.15** «Арол і рэшка. Юбілейны» (16+).
**9.55** «На нажах» (16+).
**10.50** «Бітва салонаў» (16+).
**11.45** Анімацыйны фільм «Angry Birds у кіно» (0+).
**13.20 Камедыя «Апошняе свята» (12+).**
**15.10** «Капейка ў капейку» (12+).
**15.45** «Паненка-сялянка» (16+).
**16.40** «Абмен жонкамі» (16+).
**17.50 Камедыя «Дзіўнае жыццё Цімаці Грына» (12+).**
**19.35 Драма «Уваскрасенне Хрыста» (16+).**
**21.25** «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).
**22.05** «Спортлато 6 з 49», «КЕНО».
**22.10 Меладрама «P.S. Я кахаю цябе» (12+).**

### Беларусь 3

**7.25** «Сіла веры».
**7.50** «Размовы пра духоўнае».
**8.00, 13.30, 20.15** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.15, 13.45, 20.30** «Гэты дзень».
**8.20** М/ф (0+).
**8.50 «Цені знікаюць апоўдні». Драма (12+).**
**10.00** «Беларуская кухня». Велікодны куліч. Тварожная пасха.
**10.30** «Беларусь, як песня». Уладзімір Курдын.
**10.55** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**11.20** «Сінематэка». Другое нараджэнне (беларускія фільмы 40 — 50-х гадоў).
**12.00 «Міколка-паравоз». Маст. фільм (6+).**
**13.50** «Навукаманія» (6+).
**14.20** «Эти глаза напротив...» Канцэрт памяці Валерыя Абадзінскага.
**15.45** «Легенды кіно». Міхаіл Пугаўкін (12+).
**16.25 «Чапаеў». Маст. фільм (12+).**
**17.55 «Дзяржаўная граніца». Маст. фільм (12+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Мачаха». Маст. фільм (12+).**
**22.30 «Гу-га». Драма (16+).**

### Беларусь 5

**6.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Фінал. 6-ы матч. «Юнацтва» (Мінск) — «Нёман» (Гродна).
**8.50** Хакей. Еўравыклік. Фінляндыя — Беларусь.
**10.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**11.15** Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. Фінал. 5-ы матч. СКА (Санкт-Пецярбург) — ЦСКА (Масква).
**13.10** Трэніровачны дзень.
**13.40** Вялікі спорт. Ток-шоу.
**14.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Эвертан» — «Ліверпуль».
**16.25** Кікнадзэ. Меркаванне.
**16.55** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. Фінал. 5-ы матч. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Манчэстэр Юнайтэд». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**21.30** Тэніс. Турніры WTA. Чарльстан. Мантэрэй.

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі) «Нашы навіны».
**7.10 Маст. фільм «Печкі-лавачкі» (6+).**
**9.10** «Смяшарыкі. Новыя прыгоды» (0+).
**9.30** «Здароўе» (16+).
**10.40** «Смак» (12+).
**11.25** «Матрона Маскоўская: гісторыя цудаў» (12+).
**12.30** «Разумніцы і разумнікі» (12+).
**13.25** «Ералаш» (6+).
**13.50 «Сапраўдная Ванга». Серыял (12+).**
**16.20** «Ілья Рэзнік. «Который год я по земле скитаюсь...» (16+).
**17.25** Юбілейны вечар Ільі Рэзніка (12+).
**20.30** «Нашы навіны». Суботні выпуск.
**21.05** «Метэагід».
**21.15** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**21.20** «Сёння вечарам» (16+).
**23.30** «Шлях Хрыста» (6+).
**1.20 Маст. фільм «Двое і адна» (12+).**

### СТБ

**6.35 «Студэнты». Серыял (16+).**
**9.00** «Ежа багоў» (16+).
**10.40** «Самая карысная праграма» (16+).
**11.30** «Мінск і мінчане».
**12.00, 13.40, 0.25 Драма «Андрэй Рублёў» (12+).**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**15.20** «Рамонт па-сумленнаму» (16+).
**15.55** «Вялікі горад».
**16.40, 22.00** Дакументальны праект (16+).
**17.30** «Глядзець усім!» (16+).
**17.55 Маст. фільм «Зімовы вечар у Гаграх» (12+).**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Драма «Ілюзіяніст» (12+).**

### МІР

**6.40, 8.20, 5.05** М/ф (6+).
**7.50** «Саюзнікі» (12+).
**9.00** «Вой, мамачкі!» (12+).
**9.30** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Здабытак рэспублік. Васьмідзясятыя» (12+).
**10.45 Маст. фільм «Адзінокім даецца інтэрнат» (6+).**
**12.30** «Любімыя акцёры 2.0». «Адзінокім даецца інтэрнат» (12+).
**13.05 Маст. фільм «Прага помсты» (16+).**
**16.15, 19.15 Серыял «Бацюшка» (16+).**
**23.45 Серыял «Ратуйся, брат!» (16+).**
**3.20 Маст. фільм «Востраў» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху» (16+).
**7.40 Серыял «Служба даверу» (16+).**
**11.00** Весткі.
**11.20** «Жывыя гісторыі» (12+).
**12.10** «Пяцёра на аднаго» (12+).
**13.00** «Наша справа» (16+).
**13.15 Маст. фільм «Сямейнае шчасце». 2015 г. (12+).**
**14.55** «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт (16+).
**16.35 Маст. фільм «Пах лаванды». (12+).**
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55 Маст. фільм «Лідзія». (12+).**
**23.20** Весткі. Спецвыпуск.
**23.30** «Вялікдзень». Велікоднае богаслужэнне ў Храме Хрыста Збавіцеля.

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00 Серыял «Час Волкава» (16+).**
**7.40** «Дзеля агню» (0+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.10** «Сёння».
**8.20** «Урачэбныя тайны плюс» (12+).
**8.55** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+).
**9.25** «НЗ.by».
**10.25** «Галоўная дарога» (16+).
**11.00** «Ежа жывая і мёртвая» (12+).
**12.00** «Кватэрнае пытанне» (0+).
**13.00** «Сёння».
**13.15** «Сыходжанне Жыватворнага агню». Трансляцыя з Іерусаліма.
**14.30 Меладрама «Павадыр».**
**16.30** «Паедзем, паядзім!» (0+).
**17.10** «Сакрэт на мільён». Жанна Эпле (16+).
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.00** «Ты супер!» Міжнародны вакальны конкурс (6+).
**22.05 Маст. фільм «Пятровіч» (16+).**
**23.50** «Брэйн-рынг» (12+).

### 8 канал

**9.00, 15.55, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**9.25** Для дзяцей «Адказвайка».
**9.30** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**9.40 Серыял «Англійскае забойства» (12+).**
**11.15 Меладрама «Раман» (12+).**
**14.00** «Суперкнiга».
**14.30** «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф «Спірыт. Душа прэрый».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**16.30** «Здароўе».
**17.15** «Пра спорт».
**17.25 Камедыя «Крыльца або ножка» (0+).**
**19.20 Меладрама «Маскава, я цярплю цябе» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Фэшн is my прафэшн» (12+).
**21.15 Драма «Ганна і кароль» (12+).**
**23.30** «Уваскрасенне» (0+).

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер». (16+).
**7.00** Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
**7.30** «Галерэя прыгажосці». (16+).
**8.00** «Дзіцячы КВЗ». (6+).
**9.00, 3.00** М/ф «Марын і яго сябры». (0+).
**9.30, 3.25** М/ф «Скубі Ду». (6+).
**10.00, 3.50** М/ф «Маша і Мядзведзь». (0+).
**10.20** М/ф «Джынглікі». (0+).
**10.50, 2.00** «Ералаш». (6+).
**11.20** Анімацыйны фільм «Пухнатыя супраць зубастых». (12+).
**13.00** Серыял «Мамачкі». (16+).
**15.00** «Узважаныя і шчаслівыя людзі». (16+).
**16.50** Камедыя «Не жартуйце з Зоханам!» (16+).
**19.00** Фэнтэзі «Пітэр Пэн». (12+).
**21.00** «Уральскія пельмені». (16+).
**22.40** Жахі «Гарадскія легенды». (16+).
**0.30** «Хачу верыць!» (16+).
**4.00** «Лаві момант». (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі». (16+).

### Культура

**6.30** Біблейскі сюжэт.
**7.05** «Цётка Маруся». Маст. фільм.
**9.15** «Пра рыбака і рыбку». «Нехачуха». М/ф.
**9.40** «Святыні Крамля». Дак. серыял.
**10.10** «Футбол нашага дзяцінства». Дак. фільм.
**11.00** «Варатар». Маст. фільм.
**12.15** «Кіно нашага дзяцінства». Дак. фільм.
**13.10** «Машачка». Маст. фільм.
**14.25, 16.00** «Двары нашага дзяцінства». Дак. фільм.
**15.15** «Слон і вяровачка». Маст. фільм.
**17.00** «Старац Паісій і я, стоячы дагары нагамі». Маст. фільм.
**18.25** «Песні кахання». Канцэрт Алега Пагудзіна ў Дзяржаўным Крамлёўскім палацы.
**19.20** «І жыццё, і слёзы, і каханне». Маст. фільм.
**21.00** «Агора». Ток-шоу.
**22.00** Да юбілею Станіслава Любшына. «Лінія жыцця».
**22.55** «Не страляйце ў белых лебедзяў». Маст. фільм.
**1.10** «Рускі Вялікдзень у Іерусаліме». Дак. фільм.
**1.40** Шэдэўры рускай духоўнай музыкі. Уладзімір Співакоў і Акадэмічны Вялікі хор «Майстры харавога спеву».
**2.30** «Лета Гасподняе». Уваскрасенне Хрыстова. Вялікдзень.

### Настальгія

**6.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага рока. В. Цой. «Дзеці хвілін». 2008 год (16+).
**6.55, 8.40, 9.40, 11.00, 14.40, 15.40, 17.00, 19.00, 23.15, 0.45, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.30** Маст. фільм «Абяцанне шчасця» (16+).
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1979. 2-я частка. 2009 год (16+).
**13.30** Маст. фільм «Хто паедзе ў Трускавец» (16+).
**16.00** «Колба часу» (16+).
**18.00** Маст. фільм «Вяселле» (12+).
**19.15** «12 разгневаных мужчын. Дзядзька Ваня і іншыя». 1993 год (12+).
**20.15** Музычная праграма «СММ». 1990 год (12+).
**21.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**22.00** Маст. фільм «Я буду чакаць...» (16+).
**23.40** Маст. фільм «Заваеўнікі гор» (12+).
**0.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**1.30** Маст. фільм «Прыгоды Электроніка». 3-я серыя (6+).

### EuroSport 1

**2.30, 5.30, 15.30, 22.00** Веласпорт. «Тур Краіны Баскаў».
**4.00, 7.00, 9.30, 11.30, 20.30, 0.45** Снукер. China Open.
**12.30, 18.30** Веласпорт. «Тур Фландрыі».
**19.30** Watts.
**23.30** Кёрлінг. Чэмпіянат свету.

### Кінакамедыя

**1.30** Шпіён па суседстве. (12+).
**3.15** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**3.55** Хацеў бы я быць тут. (16+).
**5.50** Інструкцыі не дадаюцца. (12+).
**8.10** Міс Пецігру жыве сённяшнім днём. (16+).
**9.50** Кухня ў Парыжы. (16+).
**11.50** Кухня. Апошняя бітва. (12+).
**14.10** Справа ў табе. (16+).
**15.55** Энцыклапедыя развóдаў. (16+).
**17.30** Улюбёны Амерыкі. (16+).
**19.30** Дзень сурка. (12+).
**21.20** Клік: з пультам па жыцці. (12+).
**23.25** Настаўнік англійскай. (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**10.15** «Сардэчна запрашаем дадому!» (6+).
**11.05** «Хронікі маскоўскага побыту» (16+).
**12.00, 0.30** «Каменнае сэрца». Серыял (12+).
**15.40** «Тайны нашага кіно: «Кур'ер» (12+).
**16.15** «Кур'ер». Маст. фільм (16+).
**17.55** «Эпік». Анімацыйны фільм (0+).
**19.35** «10 самых» (16+).
**20.10** «Парыжанка». Меладрама (12+).
**22.05** «Чалавек дажджу». Драма (16+).
**3.45** «Нябёсы, якія абрынуліся». Серыял (16+).
**5.10** «Нераскрытыя тайны» (12+).

### ТБ1000

**6.10, 14.00** Сезон палявання (12+).
**7.50** Вялікія вочы (16+).
**9.50** Скіўвіцы (16+).
**12.10** Белфегор — прывід Луўра (12+).
**15.40** Дывергент (12+).
**18.15** Дзявяткі (16+).
**20.10** Саліст (16+).
**22.25** Мэверык (12+).
**0.50** Спакуса (18+).
**2.55** Ева: штучны розум (12+).
**4.35** Ілгун, ілгун (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** СуперБабровы (12+).
**8.15** Бой з ценем (16+).
**10.50** Апельсінавы сок (16+).
**12.45** Вольны вецер (6+).
**15.25** Аднакласніцы (16+).
**16.55** Маршрут пабудаваны (16+).
**18.35** Спарта (16+).
**20.20** Пра каханне (16+).
**22.15** Бой з ценем-2. Рэванш (18+).
**0.50** Горад (16+).
**2.50** Сувязь (16+).
**4.35** Ператварэнне (12+).

### National Geographic

**6.00, 11.35, 14.00, 21.10** Невядомая планета зямля. (12+).
**6.50** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.40, 12.25** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**8.30** Баку: схаваныя тайны горадоў. (12+).
**9.15, 13.15** Аўта-SOS. (12+).
**10.05, 14.50** Цуды інжынерыі. (12+).
**10.50** Непаражальныя канструкцыі. (12+).
**15.40** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**16.25** Шаша праз пекла. (12+).
**17.10** Закінутыя скарбы змяіных цароў мая. (16+).
**18.00, 22.00** Погляд знутры: Паўночная Карэя. (16+).
**18.45, 22.45** Кім Чэн Ын — неафіцыйная біяграфія. (16+).
**19.35** Кітай з вышыні птушынага палёту. (16+).
**20.20** Неверагодныя машыны. (12+).
**23.30** Апошнія тайны Трэцяга рэйха. (16+).
**0.15** Ліхтугі за мяжой. (18+).
**1.05** У пошуках праўды: Атлантыда. (12+).
**1.55** Паранармальнае. (16+).
**2.45** Інстынкт выжывання. (16+).
**3.30** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**5.10** Вядомы Сусвет. (12+).

### Discovery

**8.00** Хлопцы з Юкана.
**9.00** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**10.00** Мегацягнікі.
**11.00** Загадкі планеты Зямля.
**12.00** Сакрэты падзямелля.
**13.00** Разбуральнікі легенд.
**14.00, 7.10** Іржавая імперыя.
**15.00** Зроблена з другаснай сыравіны.
**16.00, 19.30** Паляўнічыя на рэліквіі.
**20.00, 1.00** Залатая ліхаманка.
**2.00, 3.50** Мужчына, жанчына, прырода.
**4.40, 6.20** Махінатары.

## Замор'е

## Амерыканец не змог даказаць, што Зямля — дыск

**Пажылы амерыканец Майк Х'юз, які свята верыць у тое, што Зямля мае форму дыска, а не шара, усё ж здзейсніў абяцаны палёт на сваёй самаробнай ракеце з мэтай доказу ўласнай тэорыі і перакanання ў гэтым іншых.**



Дзеля незвычайнага эксперымента 61-гадовы мужчына некалькі месяцаў займаўся будаўніцтвам самаробнай ракеты ў сваім гаражы. «Мне надакучылі людзі, якія казалі, што я курыў, а не будаваў ракету, а потым спужаўся, — заявіў Х'юз журналістам. — Я сабраўся з духам і ўзляцеў». Месца для старту было выбрана ў пустыні Махавэ, і самаробная ракета ўзняла Х'юза прыкладна на 570 метраў над зямлёй. Аднак затым яму давялося прызямляцца з дапамогай парашутаў, паколькі ў ракеты адмовіў рухавік. Сістэму катапультавання Х'юз рабіць не стаў, а проста прымацаваў купалы парашутаў да ракеты. Дзякуючы гэтаму «касманаўту» ўдалося вярнуць апарат на Зямлю ў адноснай цэласці.

Аднак сам Майк пры гэтым моцна ўдарыўся. Х'юз прызнаўся, што не змог пераканацца ў плоскай форме Зямлі. Тым не менш ён застаўся пры сваім меркаванні, што ўрады розных краін разам з астранамамі арганізавалі глабальную змову і падманваюць грамадзян наконт формы нашай планеты.

## 200 пеўняў пасадзілі ў турму

**У амерыканскім штаце Арканзас 200 пеўняў трапілі за краты за ўдзел у баях, паведамляе Associated Press.**



Птушкі былі захопленыя падчас паліцэйскага рэйду ў горадзе Дэ-Куін і ўтрымліваюцца на тэрыторыі турмы ў якасці доказу. Іх далейшы лёс вырашыць суд. Даглядаць пеўняў даручылі зняволеным, якія заслужылі давер адміністрацыі. Супрацоўнікі арганізацый, размешчаных недалёка ад турмы, скардзяцца, што птушкі моцна шумяць. Падчас рэйду акрамя іх затрымалі таксама 137 чалавек.

А вось у Камбоджы ў канцы мінулага года паліцыя закрыла дзве ўстановы, у якіх праводзіліся нелегальныя пеўневыя баі. Па даных СМІ, яны належалі пляменніку прэм'ер-міністра краіны Хун Сена. Арганізатарам баёў прад'явілі абвінавачанні ў жорсткім абыходжанні з жывёламі і нелегальным прадпрымальніцтве. Але самае цікавае: суд пастанавіў, што пеўняў трэба адправіць... на забой. Прычым пасля гэтага птушак перадалі паліцэйскім, каб тыя іх з'елі. Суд адзначыў, што забой птушак павінен быў «прадухіліць паўтарэнне злачынства і паскорыць следства».

**Іван КУПАРВАС.**

УРОКІ ВЫХАВАННЯ

# СПАДЗЯВАННІ — ДОБРА, КАНТРОЛЬ — ЛЕПШ



Мыць падлогу, гатаваць ежу і займацца з дзецьмі вучаць у Гомельскім раёне бацькоў з сацыяльна небяспечных сем'яў

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**ІМ сёння сорамна. Не тое што прозвішча называць ці фатаграфавацца, але ж нават успамінаць пра свае сумніўныя «подзвігі». Таму размаўляем з бацькамі, якія ўсё ж вярнулі сабе права так звацца, на ўмовах ананімнасці. Дамаўляемся, што нават не агучваем назву канкрэтнага населенага пункта.**

Скажу толькі, што размова ідзе пра Гомельскі раён. Бо менавіта тут ёсць цікавы вопыт, варты ўвагі і пераймання. Вопыт барацьбы за лёсы дзяцей, якім патрэбны сапраўдныя бацькі. З **намеснікам старшыні камісіі па справах непаўналетніх Гомельскага райвыканкама Кацярынай РУДЗЕНКАЙ** едзем у адну з вёсак. Спыняемся каля двухпавярховіка, які мясцовы люд называе «п'яны дом». Нашы першыя героі тут і жывуць. Чакаюць нас і вельмі хвалююцца. Мужчыну 26, яго жонцы 22. Разам ужо пяць гадоў, у шлюбе афіцыйна — тры. Ёсць маленькая дачка. Што яшчэ для шчасця трэба?

— Я часта ў Расію ездзіў на заробкі, — расказвае малады чалавек. — Прывозіў неблагія грошы, і так атрымлівалася, што мы добра адзначалі маё вяртанне. Людзі сталі заўважаць. Прыехала да нас праверка са школы, потым другі раз, трэці. Суседзі, відаць, расказалі. У лістападзе забралі ў нас дзіця.

Дырэктар мясцовай сярэдняй школы Таццяна Мацюшэнка гаворыць, што сужэнцы, калі асэнсавалі, што адбылося, адразу ж прыйшлі на камісію:

— Яны прызналі, што выпівалі, і сказалі, што будуць рабіць усё для таго, каб вярнуць дзіця ў сям'ю. Самі прайшлі медкамісію, працаўладкаваліся, пачалі рабіць рамонт у кватэры. Сям'я пачала інтэнсіўна прыводзіць сябе ў парадак, і мы гэта ўбачылі.

— Закадзіраваліся абодва, — кажа малады бацька. — Прыйшлося, бо гэта адно з патрабаванняў. Не шкадую пра гэта. 2,5 месяца не было дзіцяці з намі, і мы сумавалі. Жонка ездзіла да дачкі ў дзіцячы дом вельмі часта, я радзей. Мы працуем цяпер на мясцовай птушкафабрыцы. Нам далі пазыку, каб аплаціць даўгі, якія ў нас утварыліся. Дырэктар увайшоў у наша становішча. Цяпер пэўны рытм з'явіўся ў жыцці: прыйшоў з работы, дзіця забраў, пагуляў з ім, павячэралі разам...

Як яно пойдзе далей — пакуль ніхто асабліва не загадвае. Вынікі ў гэтай справе — не лічбы на паперы, а шчаслівыя вочы дзяцей. У доўгатэрміновай перспектыве. Дарэчы, тыя, хто сёння становяцца бацькамі, часцей за ўсё родам з тых самых 90-х. Іх яшчэ называюць страчаным пакаленнем. Яны нікому не былі асабліва патрэбны і не навучыліся ні весці гаспадарку, ні цаніць сапраўдныя каштоўнасці жыцця... Ім складана, з імі складана.

— Многія з іх пачалі піць, калі самі былі падлеткамі, — гаворыць Кацярына Рудзенка. — Цяпер яны нараджаюць дзяцей. Праходзяць курс лячэння, але потым зноў пачынаюць піць. Многія не ведаюць, што такое сям'я, не былі прывучаны ў дзяцінстве да самага элементарнага. Яны не разумеюць, што ў доме павінен быць парадак. У іх няма навыкаў догляду за дзіцем. Ёсць і такія, хто не п'е, але санітарны стан жылля жудасны. Вось што прыходзіцца штодзённа тлумачыць дарослым людзям. У нас усе сельвыканкамы вельмі моцна стаяць на абароне правоў і законных інтарэсаў дзяцей. Мы імкнёмся не звальваць усю гэтую складаную работу на ўстановы адукацыі, лічым, што ўсе дзяржаўныя структуры павінны займацца выяўленнем сацыяльна небяспечных сем'яў. І сельвыканкамы тут самыя першыя. На грамадскія пункты аховы правапарадку ўскладзена вялікая работа па дапамозе такім сем'ям.

Традыцыйна, па словах Кацярыны Мікалаеўны, важную ролю адыгрываюць чалавечы фактар і грамадзянская пазіцыя асобных уплывовых людзей у раёне. Важна ўсё зрабіць своечасова: убачыць праблемы дзіцяці, абараніць яго правы, не прайсці міма.

— Мы пэўны час таму забіралі траіх дзяцей у Цярэшкавіцкім сельсавеце. Там максімальна падключыўся да работы з гора-бацькамі тагачасны кіраўнік прадпрыемства. Тады дзякуючы яго пазіцыі сям'і цалкам адрамантавалі дом, купілі мэблю, нават новую агароджу з металапрофілю паставілі. Іх узялі на работу. Яны прайшлі курс лячэння ад алкагольнай залежнасці. Сям'я аднавілася.

> Некаторыя менавіта дзякуючы гэтаму дэкрэту ўпершыню ў жыцці атрымалі работу, а некаторыя — нават станоўчыя водгукі па месцы працы.

Такім чынам і рэалізоўваецца Дэкрэт «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у неўладкаваных сем'ях». Дакумент між тым працуе ўжо адзінаццаты год. Тыя, хто знаёмы з ім не толькі на паперы, сцвярджаюць, што актуальнасць не страчана. Старшыні сельвыканкамаў адразу ж паведамляюць пра сітуацыю, калі яна патрабуе ўмяшання дзяржавы.

— У нас вельмі добра ажыццяўляецца такая работа на тэрыторыях Улукаўскага і Прыбыткаўскага сельсаветаў, — падкрэслівае Кацярына Мікалаеўна. — Там старшыні з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. Калі мы адбіраем дзяцей, старшынёй райвыканкама ўзгадняецца індывідуальны план па абароне правоў дзіцяці. У яго ўключаны ўсе меры прафілактыкі. Мы падрабязна прапісваем нават дробязі. Накшталт: мыць падлогу, пераклеіць шпалеры, прыбіць плінтусы, памыць столь... Даём рэальны шанц і дзецям, і іх бацькам. Бо, калі б не Дэкрэт № 18, мы павінны былі б адразу ж патрабаваць пазбаўлення бацькоўскіх правоў. У такім выпадку сацыяльнага сіроцтва было б нашмат больш. А шэсць месяцаў — гэта сур'ёзны тэрмін. З вопыту: калі чалавек за гэты час адразу робіць вывады, ён і надалей будзе імкнуцца змяніць сітуацыю. Некаторыя менавіта дзякуючы гэтаму дэкрэту ўпершыню ў жыцці атрымалі работу, а некаторыя — нават станоўчыя водгукі па месцы працы.

На вёсцы ўсе ведаюць адно аднаго і гэта дапамагае часам папярэдзіць сапраўдную бяду. Кацярына Рудзенка ўспамінае выпадак, які адбыўся ўжо даўно, і толькі дзякуючы пільным суседзям сітуацыя тады не закончылася трагічна:

— Некалі суседзі патэлефанавалі і паведамілі, што дні два не бачаць матулю з дзіцем. Мы паехалі з участковым інспектарам і ратавальнікам па ўказаным адрасе. Дом нам не адчынялі. Калі адкрылі — бацькі валяліся п'яныя, а маленькае дзіця грызла гарбузовае насенне, бо ў хаце больш не было чаго есці. А калі б людзі не паведамілі?

...Тым часам пад'язджаем да шматдзетнай матулі, якая курыць на ўваходзе ў пад'езд. Цяпер — цвярозая. У жанчыны ёсць муж, які працуе кухарам, і пяць цудоўных дзяўчынак: ад двух да чатырнаццаці гадоў. Дырэктар школы Таццяна Мацюшэнка кажа, што старэйшыя дзяўчынкі ва ўстанове адукацыі — актывісткі і спартсменкі. І ім вельмі сорамна, калі іх матуля сыходзіць у запой.

— Я магу не выпіваць і год, і два, і ўвогуле, — упэўнена шматдзетная маці. — Але потым магу сарвацца... Не памятаю, з чаго. Апошні раз ці то дзень нараджэння нечы быў, ці то кум прыехаў, якога даўно не бачыла... Я думала, што вып'ю піва і ўсё, але не атрымалася. У запой пайшла... Дзеці былі ў мамы. У кастрычніку 2017 года запісалі мяне ў сацыяльна небяспечныя.

— А да мяне ў камісію тым часам адразу ж прыйшоў матэрыял з міліцыі, што ў вёсцы прапала шматдзетная матуля, — гаворыць Кацярына Рудзенка.

— З кастрычніка перастала выпіваць, закадзіравалася, — далей расказвае сваю «гісторыю» маці пяцярых дзяўчатак. — Пакуль мяне тут, у вёсцы, угаворвалі не піць — яшчэ не даходзіла, а вось калі на ўзроўні раёна камісія разабрала... Мне не трэба выпіваць увогуле, бо я не ўмею. Трымацца буду за дзяцей — каб не трапляць больш у такую сітуацыю.

Абяцанні, канешне, можна слухаць, але сачыць трэба ў абодва вокі і надалей, — менавіта так лічыць Кацярына Рудзенка. Яна ўпэўнена, што гарантый наконт такіх сем'яў ніхто не дасць. Спадзяванні — добра, а пільны кантроль — яшчэ лепш.

Праблем у справе выхавання, тым больш сацыяльна небяспечных дарослых грамадзян — больш, чым трэба. І ўсё ж лічбы гавораць за тое, што работа, якая мэтанакіравана вядзецца — не дарэмная. У Гомельскім раёне ў 2007 годзе было прызнана, што 380 дзетак са 194 сем'яў знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Цяпер на ўліку — 243 дзіцяці са 167 сем'яў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

- ✓ **На Гомельшчыне ў параўнанні з 2008 годам, калі актыўна запрацаваў Дэкрэт № 18, значна паменшылася колькасць дзяцей у сацыяльна небяспечным становішчы. 6890 было тады і 4689 — цяпер.**
- ✓ **Вядзецца работа, накіраваная на памяншэнне сацыяльнага сіроцтва і ўладкаванне дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, на сямейныя формы выхавання. Калі ў 2007 годзе ў вобласці было толькі пяць дамоў сямейнага тыпу, то цяпер іх 46.**
- ✓ **За апошнія 10 гадоў у тры разы паменшылася колькасць злачынстваў, якія здзейснілі непаўналетнія. Больш чым удвая скарацілася і колькасць дзяцей, якія загінулі ад знешніх прычын.**

КАМПЕТЭНТНА

# Няма жадання — ніхто не дапаможа



***Наталля МЫСЛІЎЧЫК, дэпутат Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і галоўны ўрач 36-й гарадской паліклінікі, упэўнена, што малых варта пакідаць з біялагічнымі бацькамі і змагацца за сям'ю да апошняга.***

Для кожнага дзіцяці, згодна з Дэкрэтам № 18, пасля выяўлення ў сям'і небяспечнага становішча распрацоўваецца індывідуальны план работы. У залежнасці ад узросту малога медыцынскія супрацоўнікі наведваюць жыллё раз на тыдзень, пакуль немаўляці няма года. Раз на два тыдні — пакуль дзіцяці не споўніцца тры, пасля — раз на месяц.

— Мы заўжды даём бацькам шанц захаваць сям'ю. Але можам і ў сем раніцы прыйсці, і ў восем вечара, каб бацькі ведалі, што яны пад кантролем.

Калі ж маці і бацька ўсё роўна п'юць ці прымаюць наркотыкі, можа паўстаць пытанне пра адабранне малых. Тое ж можа здарыцца, калі яны не выконваюць свае абавязкі: дзіця някормленае, неадзетае, нямытае.

Тым не менш, нягледзячы ні на якія ўмовы (у межах дапушчальных), дзіцяці ўсё роўна лепш з бацькамі, лічыць дэпутат:

— Адабранне з сям'і — гэта заўжды вялізны стрэс для дзіцяці. Лепш лішні раз напужаць бацькоў, пагражаючы адабраннем малога, каб яны ўсё ж заварушыліся і нешта зрабілі. Мы ведаем, як такія дзеці любяць сваіх мам і бясконца пакрываюць іх, хлусяць, каб падаць усё ў найлепшым свеце.

Няма аўтакрэсла — не выпішуць з раддома, няма вагаў — забяруць немаўля. Па такім прынцыпе падыходзяць да бацькоў у Амерыцы. Там іх не ўгаворваюць і не пераконваюць даглядаць уласных дзяцей. Не ведаеш, як гэта рабіць — дзіця забяруць і аддадуць іншым людзям. А вось у многіх нашых бацькоў адказнасць за сваё дзіця проста не сфарміравана. За час цяжарнасці яны не паспяваюць падрыхтавацца да яго нараджэння, не ведаюць, як клапаціцца пра немаўля. Яны часта здольны перакладваць адказнасць на медыкаў, выхавальнікаў, настаўнікаў: маўляў, тыя прыйдуць, усё пакажуць і дапамогуць.

— Цяжарным недастаткова толькі наведаць некалькі абавязковых лекцый пры паліклініцы і паслухаць пра падрыхтоўку да родаў. Карысна больш паглыблена рыхтавацца да нараджэння дзіцяці, каб ведаць, што цябе чакае, і праходзіць курс у спецыяльных школах для маладых бацькоў.

Дапамагчы сем'ям з ярлыком «сацыяльна небяспечныя» захаваць сваіх дзяцей можна толькі праз іх уласнае жаданне. Ніякія адміністрацыйныя ўздзеянні не дапамогуць.

— Не трэба адбіраць дзяцей толькі таму, што ў небяспечнай сям'і «можа нешта здарыцца». А можа, і не здарыцца, — упэўнена дэпутат. — Чым у такіх бацькоў узмацніць адказнасць, чым пакараць за паводзіны? Даць штраф? Але ў іх і так не хапае сродкаў набыць самае неабходнае. Гэтым толькі дзіцяці горш зробіш. Галоўнае, каб у бацькоў было жаданне стаць лепшым. Калі яго няма — нічога не дапаможа.

**Ірына СІДАРОК.**

белагропромбанк
традиции будущего

**Вниманию акционеров
открытого акционерного общества «Белагропромбанк»**

Место нахождения общества: г.Минск, проспект Жукова, 3.

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (далее – банк) сообщает, что согласно решению годового Общего собрания акционеров банка от 23 марта 2018 года, протокол № 3, с 18 мая 2018 года будет осуществляться выплата дивидендов по итогам работы банка за 2017 год по привилегированным акциям из расчета 0,03 руб. на одну акцию, по простым (обыкновенным) акциям из расчета 0,0015 руб. на одну акцию.

Список акционеров банка, имеющих право на получение дивидендов, сформирован на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 9 февраля 2018 года.

Выплата дивидендов акционерам банка осуществляется в обособленных и структурных подразделениях ОАО «Белагропромбанк»:

– юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь;

– физическим лицам в безналичном порядке в соответствии законодательством Республики Беларусь либо в установленном порядке наличными денежными средствами.

Дополнительную информацию можно получить по телефонам:
(8017) 229 64 10, 229 63 24

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 13.01.2017
выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

Открытое акционерное общество

**«Институт «Минскгражданпроект»**

г. Минск, ул. Коллекторная, 20а, тел. +37517 2009135, УНП 600013280

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 31 декабря 2017 года**

*тысяч рублей*

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2017 года | На 31 декабря 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 1077 | 1124 |
| Нематериальные активы | 120 | 15 | 25 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 2 | 2 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **1094** | **1151** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 691 | 1441 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 69 | 92 |
| Налог на добавленную стоимость | 240 | 11 | 6 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 2610 | 1801 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 337 | 181 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **3718** | **3521** |
| **БАЛАНС** | **300** | **4812** | **4672** |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 40 | 40 |
| Резервный капитал | 440 | 300 | 300 |
| Добавочный капитал | 450 | 1962 | 1963 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 725 | 721 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **3027** | **3024** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 80 | 241 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 1705 | 1407 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **1785** | **1648** |
| **БАЛАНС** | **700** | **4812** | **4672** |

**ОТЧЕТ о прибылях и убытках**

*тысяч рублей*

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2017 года | За январь – декабрь 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 6500 | 6761 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (6191) | (6252) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | (1) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | 309 | 508 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 32 | 737 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (291) | (1098) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | 50 | 147 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 38 | 42 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (6) | (7) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 2 | 22 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (30) | (93) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | 140 | 4 | (36) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 54 | 111 |
| Налог на прибыль | 160 | (50) | (89) |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | | (2) |
| Совокупная прибыль | 240 | 4 | 20 |

Данные отчетности подтверждены ООО «Аудиторский центр «Эрудит»

**5-6. Информация о дивидендах и акциях**

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 373 | 372 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 2 | 2 |
| в том числе: физических лиц | лиц | 371 | 370 |
| Начислено на выплату дивидендов | рублей | 0,00 | 1062,00 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 0,00 | 0,03 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) | рублей | 0,00 | 0,03 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 121,34 | 117,78 |

**Директор** **О. М. Быковский**
**Главный бухгалтер** **Ж. В. Арнаутова**

РАЗГЛЕДЗЕЛІ НА СЕСІІ

# ДЗІЦЯЧЫ ДОМ ЗАМЕСТ ДЗІЦЯЧАГА САДКА

## На сесіі Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў народныя абраннікі новага склікання прагаласавалі за карэкціроўку бюджэту

**АДНО з пытанняў закранала пераразмеркаванне сродкаў, раней запланаваных на выкананне праектных работ па першым у горадзе дзіцячым садку ў жылым доме. Замест гэтага дэпутатам прапанавалі разгледзець пытанне аб выплаце кампенсацый за пабудовы, якія пайдуць пад знос, а на свабоднай пляцоўцы пачнецца будаўніцтва яшчэ аднаго дзіцячага дома сямейнага тыпу.**


Вуліца Валковіча.

### Пілотны праект

Тэма ўшчыльнення існуючых жылых кварталаў у абласным цэнтры актуальная. Падыход улад зразумелы: інфраструктура ў іх дастаткова развітая і не патрабуе значных фінансавых выдаткаў. Ёсць школы, дзіцячыя садкі, спартыўныя пляцоўкі, гандлёвыя аб'екты ды іншае, што патрэбна для камфортнага жыцця навасёлаў. У той жа час у мікрараёнах-новабудоўлях адчуваецца сур'ёзны недахват усяго гэтага. Адсюль узнікла прапанова кіраўніцтва горада: існуючыя пляцоўкі паблізу ад цэнтра забудоўваць камерцыйным жыллём.

Адна з такіх прывабных пляцовак знаходзіцца ў раёне вуліц Пралетарскай і Шчорса: першыя шматпавярховікі сталі з'яўляцца не так даўно. А некалькі месяцаў таму ўзнікла ідэя будаўніцтва шматпавярховага дома, дзе першы паверх будзе займаць дзіцячы садок. Такі праект, дарэчы, ужо рэалізавалі ў Гомелі. Яго прывабнасць у тым, што дазваляе за невысокі кошт атрымаць сацыяльны аб'ект, патрэбны мясцовым жыхарам. На думку **мэра Гродна Мечыслава ГОЯ**, калі з цягам часу неабходнасць у садку адпадзе, ён з лёгкасцю можа трансфармавацца ў любы іншы карысны для гараджан аб'ект: ад цырульні да, скажам, зоамагазіна.

### Трансформер пакуль адкладваецца?

Пытанне вырашылі вынесці на грамадскае абмеркаванне, якое займае пэўны час, і адначасова запланавалі неабходныя сродкі на праектаванне першага ў Гродне садка-трансформера ў гарадскім бюджэце.

Аднак жа цікавая ідэя сутыкнулася з непрыняццем з боку ініцыятыўнай групы жахароў, якія палічылі, што замест садка-трансформера на гэтай пляцоўцы павінен з'явіцца стандартны садок. Фінансавыя выдаткі і запатрабаванасць у садках іншых мікрараёнаў пры гэтым у разлік не браліся. Як вынік, грамадскае абмеркаванне прывяло да адмовы арганізатарам у рэалізацыі праекта.

Гарадскія ўлады пагадзіліся з тым, што адаптаваны садок у шматпавярховіку будаваць у гэтым раёне не трэба. Другое пытанне — не з'явіцца тут у найбліжэйшы час і паўнавартасны дзіцячы садок. Чаму? Таму што ў гэтым мікрараёне ўжо размешчаны некалькі садкоў — раён жа мае пэўную інфраструктуру, у той час як у мікрараёнах-новабудоўлях патрэба ў такіх сацыяльных аб'ектах больш вострая. Напрыклад, у мікрараёнах Альшанка ці Вішнявец абласнога цэнтра новыя садкі патрэбны як паветра: многія бацькі вымушаны вазіць сваіх дзяцей у дашкольныя ўстановы іншых мікрараёнаў.

### Вуліца «Бацькоўская» працягне расці

Вядома, жыццё не стаіць на месцы. І дэпутатам гарадскога Савета прапанавалі разгледзець пытанне аб пераразмеркаванні сродкаў, запланаваных на праектаванне дома з садам-трасформерам, на не менш важную справу. Як паведаміў прысутным **начальнік фінансавага аддзела гарвыканкама Пётр ШВЕЦ**, на вуліцы Валковіча ў Гродне працягнуць будаваць дзяцячыя дамы сямейнага тыпу. Вуліцу ў народзе, між іншым, нават пачалі называць Бацькоўскай. На сёння ёсць ужо два такія сацыяльныя аб'екты — двухпавярховыя катэджы ў цэнтры горада, дзе пад апекай бацькоў-выхавальнікаў растуць абздзеленыя ласкай родных юныя гродзенцы. Па задуме гарадской улады будаўніцтва такіх катэджаў на гэтай вуліцы сёлета працягнецца.

Для гэтага плануюць прыцягнуць крэдытныя сродкі Банка рэканструкцыі і развіцця. Акрамя таго, трэба падрыхтаваць пляцоўку пад будаўніцтва, якой папярэднічаюць адсяленне жыльцоў старых забудоў і выплата ім грашовых кампенсацый за знос жытла. Менавіта на гэты конт дэпутатам гарадскога Савета і прапанавалі прыняць рашэнне: калі не рэалізавалі грошы на праектаванне сада-трансформера, дык сродкі ўсё роўна павінны быць накіраваны на «дзіцячую» тэму: у гэтым выпадку на падрыхтоўку пляцоўкі пад будаўніцтва трэцяга дзіцячага дома сямейнага тыпу.

Што вырашылі народныя абраннікі? Безумоўна, аднагалосна пагадзіліся з такой слушнай прапановай.

### Між іншым

А першы ў Гродне дзіцячы садок-трансформер усё ж такі з'явіцца. Плануецца, што ён будзе пабудаваны ў мікрараёне Альшанка. Як расказаў «МС» **начальнік упраўлення капітальнага будаўніцтва гарвыканкама, дэпутат абласнога Савета дэпутатаў па Альшанскай выбарчай акрузе № 13 Анатоль УРУБЛЕЎСКІ**, шматпавярховік з дзіцячым садком на першым паверсе пачнуць будаваць сёлета ў другім паўгоддзі, а здаць аб'ект плануецца ў трэцім квартале 2019-га. Пілотны садок-трансформер з'явіцца каля скрыжавання вуліц Багушэвіча і Айчыннай. Па праекце ён разлічаны на 60 месцаў. Будаваць яго больш прывабна, бо гэта танней за стандартны садок. Верагодна, такія садкі-трансформеры з цягам часу пачнуць з'яўляцца і ў іншых раёнах горада, дзе будзе адчувацца патрэба ў іх.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# СПАЧАТКУ КВЕТНІК, А ШПАЛЕРЫ ПОТЫМ

## Як працуюць вулічныя і дамавыя камітэты ў аграгарадку Белавежскі

**Ён цікавы тым, што ўзнік адносна нядаўна фактычна ў чыстым полі. Першы жылы дом быў здадзены ў 1983 годзе з пачаткам будаўніцтва буйнога свінакомплекса. Тут не было карэнных жыхароў, усе людзі — прыезджыя. Праўда, за 35 гадоў вырасла пакаленне мясцовых, якім мэтанакіравана прывівалі традыцыю цаніць прыгажосць і беражлівае стаўленне да грамадскай уласнасці.**

### ПРЭЗЕНТАЦЫЯ ВУЛІЦЫ

Калі засялялі першыя дамы, навасёлам перадавалі ключы разам з наказам добраўпарадкаваць двары, разводзіць кветкі. Больш за тое, у першыя гады жыхарам выдавалі ружы і іншыя дэкаратыўныя расліны, якія набываліся за кошт сельгаспрадпрыемства.

Белавежскі цікавы і сваім незвычайным праектам. Усе вуліцы тут не прамыя, а закругленыя. І з самой вуліцы не відаць хлявоў ды гаспадарчых пабудоў, да якіх прадугледжаны асобны пад'езд. З фасада двары выглядаюць надзвычай прывабна, па даўняй традыцыі перад домам тут ніхто не садзіць памідоры альбо бульбу, толькі кветкі. І яшчэ ёсць цікавае правіла ў адносінах да навасёлаў: спачатку кветнік, затым — шпалеры. Гэта азначае, што новыя жыльцы, калі атрымліваюць дом, спярша наводзяць парадак на двары, а потым пачынаюць рамонт у доме. «І ўсе прытрымліваюцца гэтага парадку», — расказвае **старшыня сельскага Савета Жанна ХІЛЮЦІЧ.** Яна паказвае вуліцу Набярэжную, у дамах якой ужо жывуць навасёлы. І толькі маразы не дазволілі прывесці ў парадак падворкі. «Можа гэта адзіны выпадак, калі жыльцы шпалеры пакleілі раней, чым пасадзілі кветкі, — усміхаецца яна. — А на Бярозавай, якую засялілі год таму, прыгажосць створаная, кветнікі стаяць у чаканні вясны».

У добраўпарадкаванні Белавежскага шмат не проста цікавага, а эксклюзіўнага. Тут спаборнічаюць не толькі дамамі, пад'ездамі, але і вуліцамі. Жыхары выбіраюць вулічныя камітэты, актывісты якіх спрыяюць падтрыманню парадку, дапамагаюць старэйшым і адзінокім пенсіянерам. А яшчэ вуліцы становяцца асноўным сэнсам і зместам правядзення свята пасёлка, які цяпер афіцыйна называецца аграгарадком. Ладзіцца яно ў жніўні.

— Свята ў нас не азначае сабрацца разам, паспяваць, патанцаваць, — расказвае старшыня сельвыканкама. — Свята — гэта свайго роду агляд кожнай вуліцы, яе талентаў, кулінарных здольнасцяў, ну і знешняга выгляду падворкаў. Таму напярэдадні кампетэнтная камісія праводзіць падрабязны абход вуліц і вызначае пераможцаў бягучага года па добраўпарадкаванні. А ўжо ў дзень свята кожная вуліца рыхтуе прэзентацыю, дзе і таленты можна паглядзець, і пачаставацца стравамі гаспадынь. Галоўны спонсар мерапрыемства ААТ «Белавежскі» прадугледжвае прэміі і падарункі пераможцам. Летась, напрыклад, вуліца-пераможца атрымала прэмію ў памеры 300 рублёў. Усю ноч святкавалі. Дружна і разам.

> «Жыхары выбіраюць вулічныя камітэты, актывісты якіх спрыяюць падтрыманню парадку, дапамагаюць старэйшым і адзінокім пенсіянерам.

Вулічныя камітэты, як правіла, актыўныя там, дзе ўзведзены дамы сядзібнага тыпу. Паводле ацэнкі кіраўніка мясцовай улады, цяпер такіх фарміраванняў чатыры — яны працуюць цікава і нефармальна. Камітэт на вуліцы Юбілейнай узначальвае Васіль Міхнюк, камітэт на


Зіля ДЗЯНІШЧЫК.

Пагранічнай — Валянціна Вярэнчыкава. Жыхары дамоў па ўказаных вуліцах падтрымліваюць парадак не толькі на сваім двары.

> Тут заведзена, што і насупраць дома гаспадар падкошвае траву, чысціць бардзюры, словам, даглядае яшчэ і кавалачак грамадскай прасторы. Ну а актывісты вулічнага камітэта могуць і падказаць таму, хто «забываецца» рабіць гэта своечасова. Такія ж актыўныя, зацікаўленыя ў падтрыманні парадку людзі жывуць на Паркавай, на Кальцавой.


Анатоль САМУСЕВІЧ каля прыпынку.

### ХТО Ў ДОМЕ ГАСПАДАР

У Белавежскім ёсць і шматкватэрныя дамы. Там, як правіла, створаны дамавыя камітэты. Яны і спрыяюць падтрыманню парадку. Зіля Дзянішчык узначальвае камітэт дома № 1 па вуліцы Янкі Купалы. І адразу перад будынкам бачым «сляды» гаспадарчага падыходу. Тут заасфальтаваная кожная дарожка, зроблены акуратныя клумбы, высаджаны шматгадовыя кветкі, дэкаратыўныя кусты. Усё — з густам. «Хутка высадзім у грунт вясновыя кветкі, тады наш двор ажыве», — расказвае гасцінная гаспадыня. У пад'ездзе на кожнай пляцоўцы размяшчаюцца па дзве кватэры. І жыльцы па дамоўленасці робяць рамонт самастойна. Таму і пад'езды, і нават пляцоўкі адрозніваюцца. Але ў кожным з іх мноства кветак, чысціня і парадак.

На адной з пляцовак сцены аформлены ў стылі венецыянскай тынкоўкі, з яркімі фарбамі. Усё гэта гаспадар чатырохпакаёвай кватэры Міхаіл Андрайчук зрабіў сваімі рукамі. Сусед дапамагаў фінансава, а Міхаіл у вольны ад работы час тынкаваў і фарбаваў сцены. Міхаіл працуе на мясакамбінаце ААТ «Белавежскі». Разам з жонкай Кацярынай гадуюць дваіх дзяцей. Сужэнцы Андрайчукі лічаць за правіла падтрымліваць парадак і прыгажосць не толькі ва ўласнай кватэры, але і ў доме.

І калі на пляцоўцы папярэдніх жыльцоў упрыгажэннем служаць пано са штучных кветак, то Раіса Мартынава — аматарка кветак жывых: на яе пляцоўцы стаяць фікусы ды іншыя вазоны. «Кожны ладзіць прыгажосць на свой густ, — каментуе Зіля Дзянішчык. — Галоўнае, каб чысціня і парадак былі. А ў гэтым нашы суседзі нават спаборнічаюць».

Яшчэ адзін старшыня — камітэта дома № 6 па вуліцы Пагранічнай — Анатоль Самусевіч палічыў патрэбным не толькі ўтрымліваць у парадку свой дом. Анатоль Сямёнавіч — індывідуальны прадпрымальнік, ён мае невялікую краму прамысловых тавараў, побач з якой знаходзіцца аўтобусны прыпынак. Зрэшты, прыпынак тут быў даўно. Потым рух грамадскага транспарту скарэктавалі, цяпер рэйсавыя аўтобусы і маршруткі спыняюцца ў іншым месцы. А вось аўтобус сельгаспрадпрыемства, які возіць людзей ранкам на работу, а потым на абед і з абеду, па-ранейшаму забірае работнікаў тут.

> Транспартнікі даўно страцілі інтарэс да прыпыначнага павільёна, і апошні прыйшоў у занапад. Заставалася яго знесці. Але дэпутат сельскага Савета Анатоль Самусевіч за свае сродкі аднавіў гэты павільён, заасфальтаваў пляцоўку, паставіў лаўкі.

— Не мог глядзець, як людзі мокнуць пад дажджом альбо мерзнуць у сцюжу, — гаворыць Анатоль Сямёнавіч. — А калі ім утульна, можа, ацэняць мае намаганні і зойдуць па пакупку ў краму.

Канкурэнцыя цяпер у гандляроў немалая. У пасёлку з насельніцтвам 2480 чалавек паўтара дзясятка гандлёвых кропак. Але не ўсе пры гэтым клапоцяцца пра тэрыторыю вакол сваіх крамаў. А тут бачым сацыяльную адказнасць бізнесу. Хай сабе і невялікага маштабу. Ну і ў доме, дзе Анатоль Самусевіч старэйшым, поўны парадак.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Камянецкі раён.*


**Информация о результатах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «МНИПИ» за 2017 г.**
**Бухгалтерский баланс на 01.01.2018 г.**

| Наименование показателей | Код строки | На 31.12.2017 г. (тыс. руб.) | На 31.12 2016 г. (тыс. руб.) |
|---|---|---|---|
| 1. Долгосрочные активы | 190 | **11 655** | **10 612** |
| Основные средства | 110 | 9908 | 9287 |
| Нематериальные активы | 120 | 18 | 13 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 1521 | 1104 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 208 | 208 |
| 2. Краткосрочные активы | 290 | **5542** | **5008** |
| из них: | | | |
| Сырье, материалы и др. аналогичные активы | 211 | 430 | 373 |
| Затраты в незавершенном пр-ве и полуфабрикаты | 213 | 504 | 692 |
| Готовая продукция и товары для реализации | 214 | 1039 | 761 |
| Расходы будущих периодов, НДС, краткосрочная дебиторская задолженность | 230-250 | 691 | 1118 |
| Денежные средства | 270 | 2878 | 2064 |
| Баланс – всего (активы) | 300 | **17 197** | **15 620** |
| 3.Собственный капитал | 490 | **14 298** | **12 794** |
| 5. Краткосрочные активы | 690 | **2899** | **2826** |
| В том числе: кредиторская задолженность по поставщикам и авансам полученным | 631 – 632 | 1176 | 2320 |
| По оплате труда | 635 | 148 | 120 |
| Прочие краткосрочные обязательства | 633 – 670 | 1575 | 386 |
| **Баланс – всего (пассивы)** | **700** | **17 197** | **15 620** |

**Отчет о прибылях и убытках за 2017 г.**

| Наименование показателей | 2017 г. (тыс. руб.) |
|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 7195 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 6752 |
| Прибыль от реализации | 443 |
| Прибыль (убыток) от прочей текущей деятельности | (159) |
| Прибыль от инвестиционной деятельности | 485 |
| Прибыль от финансовой деятельности | 289 |
| **Прибыль до налогообложения** | **1058** |
| Налоги, сборы и платежи из прибыли | (242) |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ** | **816** |

Получено аудиторское заключение от ОДО «НемигаАудит» о том, что бухгалтерская отчетность ОАО «МНИПИ» составлена в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает реальное финансовое положение и результаты финансово-хозяйственной деятельности ОАО «МНИПИ» за 2017 г.

ОАО «МНИПИ» объявляет о выплате дивидендов за 2017 год в размере 13 копеек на одну акцию. Выплата дивидендов производится в срок до 1 ноября 2018 года.

УНП 100039847



**Извещение о проведении 19 апреля 2018 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк»**

Сведения о продаваемом имуществе

| Номер предмета торгов | Информация об имуществе | Начальная цена, руб. с НДС | Размер задатка, руб. с НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль VOLKSWAGEN TRANSPORTER (с принадлежностями) инв. № 21111120, рег. знак 5287 ЕР-7. Кузов № VIN: WV1ZZZ7HZ7H121182 Место нахождения: г. Минск, пр-т Жукова, 3 | 8106,00 | 810,60 |

Продавец имущества: открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.

Организатор торгов: консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, к.1703.

Повторные торги проводятся в форме аукциона в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и условиями проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк».

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет консалтингового унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» р/с BY32 BAPB 3012 2013 1001 8000 0000 в ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X, УНП 190982374 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Повторные торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Повторные торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если повторные торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в условиях проведения торгов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

**Повторные торги проводятся 19 апреля 2018 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22-1703.**

**Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 02.04.2018 по 18.04.2018 включительно, в рабочие дни с 08.30 до 12.30 и с 13.15 до 17.30 (по пятницам – до 16.15) по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22-1703.**

Получить дополнительную информацию и ознакомиться с документацией по условиям и предметам торгов можно на сайте www.zalogbanka.by, mail: torgi@agroconsult.by.

Телефоны для справок: ОАО «Белагропромбанк», главный механик транспортного отдела банка – Зарембо Алексей Иванович, тел. +375 (17) 218-56-94. Организатор аукциона: Tel/Fax +375 (17) 399-66-39, GSM MTS +375 (29) 816-64-46, GSM VEL +375 (44) 540-64-46.

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

## КОЖНЫ Ў АДКАЗЕ ЗА БЯСПЕКУ

**У Жыткавіцкім раёне аглядная камісія праверыла на мінулым тыдні 267 домаўладанняў. Пра гэта піша газета «Новае Палессе». У выніку выяўлены парушэнні, якія могуць прывесці да пажару, пагражаць здароўю і жыццю.**

Так, у доме, дзе пражывае сям'я з трыма дзецьмі, знайшлі цэлы шэраг парушэнняў. У корпусе печы — трэшчыны, яна не атынкаваная і не пабеленая. Комін таксама не падтрымліваецца ў належным стане: яго нават не чысцяць. Адсутнічае і перадтопачны ліст. Няма парадку ні з правадамі, ні з гаручым смецццем. Такі небяспечны «кактэйль» можа ў любы момант прывесці да трагедыі. Але кожны дарослы адказны за бяспеку ў сваім жыллі...

## «ЯК ПАСВАРЫЛІСЯ...»

**Немагчымасць знайсці агульную мову з суседзямі прывяла жыхарку вёскі Аканавічы на прыём да дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Вольгі Папко. Як расказвае жанчына, яна пражыла ў Карэліцкім раёне больш за 50 гадоў. Пабудавала дом, вырасціла дзяцей. А зараз канфліктуе з мінчанамі, якія выкупілі суседні дом пад дачу.**

Як піша карэспандэнт газеты «Полымя», гаспадыня жылля атрымала штрафы за прычэп, які стаяў на зялёнай зоне падчас уборкі ўраджаю, за шкоду, нанесеную яе курыцай суседскаму агароду, ва ўласным двары на яе нападаў суседскі сабака... Аднойчы дачнікі вылавілі паляўнічага сабаку пенсіянеркі, палічыўшы, што ён не зарэгістраваны, але гэта не так... Былі яшчэ і іншыя моманты, якія пацвярджаюць, што суседскае жыццё не ладзіцца. Вольга Папко папрасіла жыхарку прадставіць усе наяўныя лісты, квітанцыі і іншыя дакументы, каб дэталёва разабрацца ў сітуацыі.

## З ДЗЯЦІНСТВА БЕРАГЧЫ ЗЯМЛЮ

**На мінулым тыдні па ўсім свеце прайшла акцыя «Гадзіна Зямлі». І пакуль у сталіцы адключалі падсветку Нацыянальнай бібліятэкі, некаторых тэатраў, музеяў і філармоніі, у Смаргоні вырашылі, што пра любоў да прыроды неабходна гаварыць з маленства, — і правялі сваю акцыю ў дзіцячым садку № 15.**


shliah.by

Выхавальнікі ўсіх груп на занятках расказалі дзецям, як берагчы ваду і электрычнасць. Газета «Светлы шлях» паказвае, як прайшоў гэты дзень. З усім малымі працавалі творча: сур'ёзныя гутаркі пра рэсурсы называліся «Чараўніца-вада» і «Каралева-лямпачка». З больш дарослымі абмеркавалі, як несці адказнасць не толькі дома, але і ў садзіку, расказаўшы, дзе жыве электраэнергія. А для бацькоў падрыхтавалі лісток пра гэту акцыю Сусветнага фонду дзікай прыроды.

## УЛАДАР ВАДЫ

**Працоўны дзень Уладзіміра Паборцава пачынаецца з абходу 32 воданапорных калонак. Менавіта столькі іх у вёсцы Слабодка, а яшчэ некалькі неабходна праверыць у Вышкаве, Багушоўцы, Калінаўцы. Карэспандэнт газеты «Ударны фронт» Шклоўскага раёна расказвае, як працуе майстар: калі ёсць невялікая цеча, разбірае калонку і мяняе дэталі сам, а калі складаны прарыў — выклікае брыгаду.**

Як машыніст помпавых установак вытворчага ўчастка «Александрыя» Шклоўскага УКП «Жылкамгас» Уладзімір працуе з пачатку нулявых. Родам ён з Межніка. У свой час скончыў школу ў Александрыі, працаваў на рамбазе ў ваенным гарадку Балбасава, на льнокамбінаце ў Оршы. А затым вярнуўся ў родныя мясціны. Уцягнуўся ў новую справу хутка, прайшоўшы навучанне на спецыяльных курсах у Магілёве. Вольны час мужчына прысвячае сям'і, гаворыць, што ўнук Дзмітрый, які перыядычна гасцюе ў бабулі і дзядулі, расце сапраўдным памочнікам.


shklovinfo.by

**Надзея АНІСОВІЧ.**

ЗЕМЛЯКІ

# Тое, што робіць нас мацнейшымі

## Беларускі саліст і шоўмен Арцём Міхаленка выступіў перад землякамі

**Малая радзіма спевака — аграгарадок Алекшыцы Бераставіцкага раёна. Тут жывуць яго бацькі, родныя, аднакласнікі і проста добрыя знаёмыя. Многія з іх прыйшлі на канцэрт знакамітага земляка, які ў гэты вечар «ужывую» спяваў для сваіх.**

Арцём з роднымі.



— Такія сустрэчы адбываюцца не часта, але яны вельмі важныя, — кажа Арцём. — Бо тут, на малой радзіме, пачатак усяго — жыцця, захапленняў, выбару лёсу. Менавіта родныя мясціны дапамагаюць асэнсаваць гэты шлях і робяць чалавека мацнейшым.

Арцём прызнаўся, што адчувае падтрымку сваёй малой радзімы, бацькоў, якія жывуць у Алекшыцах і працуюць на мясцовым сельгаспрадпрыемстве. Маці Ганна Іосіфаўна — намеснік старшыні гаспадаркі — разам з мужам выгадавала чацвярых дзяцей. Арцём — самы малодшы. Сям'я музыкальная — хоць ансамбль ствары. Але на прафесійную музычную дарогу ступіў толькі Арцём. А зараз ужо і ён бацька. Мае траіх сыноў, з якімі стараецца быць цярплівым і развіваць іх здольнасці, як некалі развівалі і яго талент.

Арцём Міхаленка піша для маладзёжнай аўдыторыі, але сярод яго прыхільнікаў — людзі рознага ўзросту. Многія з іх памятаюць Арцёма яшчэ з дзяцінства, а яго аднакласнікі і моладзь сочаць за яго творчасцю, уваходзяць у склад сяброў у сацыяльных сетках. Вядома ж, усе ганарацца, што Арцём выступаў у складзе Прэзідэнцкага аркестра, прадстаўляў Беларусь на конкурсе «Еўрабачанне». Многія бачылі яго выступленне на фестывалі «Песня года Беларусі», дзе Арцём выканаў свой хіт "За цябе». Упершыню яго землякі пачулі гэту кампазіцыю ўжывую.

— Мы атрымалі шмат пазітыўных эмоцый, — падзяліўся старшыня гаспадаркі «Алекшыцы» Валерый Паўлюкевіч. — Думаю, сімвалічна, што Арцём выступіў перад намі са сваім сольным канцэртам менавіта сёлета, у Год малой радзімы. Такія сустрэчы вяртаюць чалавека да яго вытокаў. Яны ажыўляюць вёскі, аграгарадкі, бо людзі далучаюцца да культуры, добрага мастацтва. Гэта паляпшае іх настрой, у тым ліку працоўны.

Старшыня сельгаспрадпрыемства расказаў, што ў вёскі пачалі вяртацца нашчадкі былых жыхароў. Яны аднаўляюць дамы, укладваюць сродкі ў рэканструкцыю храмаў, на месцы развалюх узводзяць прыгожыя аграсядзібы. «А вёска — гэта карані, гэта жыццё, гэта зямля нашых бацькоў, — адзначае Валерый Эдуардавіч. — І варта гэту сувязь мацаваць».

**Алена КЛІМОВІЧ, першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама:**

— Сёлета мы плануем пашырыць колькасць культурных мерапрыемстваў у нашых вёсках і аграгарадках, дзе выступяць ураджэнцы гэтых мясцін. Будзем услаўляць землякоў, якія тут пражывалі і пакінулі значны след на зямлі. Новыя пакаленні павінны ведаць пра іх.

З'явіцца і шэраг новых брэндавых мерапрыемстваў. Будзем імкнуцца, каб свае ўнікальнае свята меў кожны населены пункт, асабліва вёскі. Напрыклад, у Воранаўскім раёне ёсць свята частушак «Прыпеўкі з кожнага двара», у Гродзенскім — «Адэльскі фэст», «Фанфары сяброў», у Лідскім — «Піліпаўскія вечары», у Шчучынскім — «Свята музыкі Чэслава Немена». Акрамя раённых свят, брэндавыя мерапрыемствы праводзяцца ў многіх вёсках і аграгарадках.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

## Баршчэўніку выпісалі «Дарожную карту»

**З мэтай вырашэння праблемных пытанняў, а таксама мінімізацыі шкоды ад распаўсюджвання чужароднага віду расліны — баршчэўніка Сасноўскага — Мінскім абласным камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя падрыхтаваны і зацверджаны план дзеянняў па барацьбе з ім на тэрыторыі Мінскай вобласці ў 2018 годзе («Дарожная карта»).**

У адпаведнасці з «Дарожнай картай», у кожным раёне вобласці для кожнага землекарыстальніка, на зямельным участку якога выяўленыя месцы росту баршчэўніка Сасноўскага, распрацаваны і дадзены канкрэтныя мерапрыемствы па абмежаванні распаўсюджвання і колькасці расліны, аб'ёмы, метады і тэрміны выканання названых работ.

Улічваючы практыку прымянення розных метадаў барацьбы з гэтай раслінай, у 2018 годзе прыярытэтным метадам барацьбы з баршчэўнікам Сасноўскага на тэрыторыі Мінскай вобласці абраны хімічны метад як самы эфектыўны.

У кожным раёне вызначана арганізацыя-апаратар, якая выступае заказчыкам мерапрыемстваў па барацьбе з баршчэўнікам Сасноўскага. Для дасягнення ўстойлівых станоўчых вынікаў мерапрыемствы па хімічнай апрацоўцы ўсёй плошчы росту расліны будуць выконвацца спецыялізаванымі арганізацыямі, якія маюць досвед правядзення такіх работ. Названыя арганізацыі будуць абраныя па выніках тэндара.

З боку тэрытарыяльных органаў Мінпрыроды ў рамках рэалізацыі «Дарожнай карты» прадугледжаны штотыднёвы кантроль за своечасовасцю і паўнатой выканання мерапрыемстваў па барацьбе з баршчэўнікам.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 29 сакавіка 2018 года.**